ЛіМ
ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА
5 студзеня 2007 г.
№1 (4392)

ПІСЬМЕННІК: ГРАМАДСТВА І ЧАС

Напрыканцы 2006 года, 22—23 снежня, адбыўся з'езд Саюза пісьменнікаў Беларусі, які праходзіў у Белдзяржфілармоніі.

Жыхары сталіцы, захопленыя пераднавагоднімі клопатамі ды калядными віншаваннямі, маглі даведацца пра пісьменніцкі форум і з расцяжак над галоўнай гарадской транспартнай артэрыяй — праспектам Незалежнасці.

Прывітанне ўдзельнікам форуму даслалі Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка, Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх Усяе Беларусі Філарэт. У рабоце прынялі ўдзел міністр культуры Уладзімір Матвейчук і міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў, першы намеснік міністра інфармацыі Лілія Ананіч, старшыня Беларускага саюза кінематаграфістаў Ю. Цвяткоў і старшыня Беларускага саюза кампазітараў І. Лучанок, дэлегацыі з 11-ці краін: з Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Малдовы, Германіі, Балгарыі, Польшчы, Сербіі, Сірыі.

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі, які год таму правёў свой устаноўчы сход, цяпер 341 чалавек (паводле звестак мандатнай камісіі, на момант правядзення з'езда), з іх — 17 ветэранаў, 14 лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі. Тых, хто не дасягнуў 30 год — 7 чалавек, ва ўзросце ад 30 да 45 год — 38 чалавек, пасля 60-ці — 125 пісьменнікаў.

Афіцыйныя прамовы з трыбуны ў філарманічнай зале ды працяг іх у фае — падчас перапынку — вяліся на тэмы літаратурныя: згадваліся здабыткі і праблемы, ставіліся стратэгічныя ды тактычныя задачы, выказваліся прапановы. Сярод асноўных садакладаў па літаратуры, паэзіі, крытыцы, яшчэ была дыскусія па дзіцячай літаратуры. Даклад жа старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі М.Чаргінца змяшчаў усебаковы аналіз дзейнасці СПБ, інфармацыю аб прамінулым з часу ўстаноўчага сходу, аб становішчы ў краіне ды задачах літаратуры (і літаратараў) на будучае.

На з'ездзе ўпершыню было агучана, што 2007 аб'яўлены літаратурным годам Янкі Купалы і Якуба Коласа. І хоць захады па ўшанаванні памяці нашых славутых землякоў прадпрымаліся задоўга да згаданай падзеі ("ЛіМ" таксама пісаў аб адпаведных планах розных міністэрстваў ды ўстаноў), час афіцыйнай абвесткі навіны надарыўся прыдатным. Выявы помнікаў класікам беларускай літаратуры ўпрыгожвалі і запрашальныя білеты на з'езд.

У духоўным жыцці кніга займае вартае месца — заўважыла першы намеснік міністра інфармацыі Лілія Ананіч. За апошні год у Беларусі выдадзена амаль 11 тысяч найменняў кніг — амаль у 5 разоў больш, чым на пачатку 90-х мінулага стагоддзя, пры гэтым стабілізаваўся выпуск — да 1 тысячы найменняў у год — кніг на беларускай мове. Шмат сродкаў з дзяржаўнага бюджэту выдзяляецца на падтрымку нацыянальнага кнігавыдання. За 10 год выдадзена шмат кніг школьнай бібліятэкі — гэта зборнікі беларускіх, рускіх, замежных аўтараў. Ну, і безумоўна, у знакавы для беларускай літаратуры год варта звярнуць увагу на тое, што зараз сумесна з Інстытутам літаратуры НАН РБ распрацоўваецца перспектыўны план выпуску поўных збораў твораў, збораў твораў і выбраных твораў класікаў беларускай літаратуры да 2020 года. Акрамя таго, выдадзены два тамы трынаццацітомніка М.Танка, у наступным годзе пачнецца выпуск твораў Якуба Коласа ў 20 тамах.

Дарэчы, сярод гасцей з'езда быў і Станіслаў Куняеў, які пераклаў "Песню пра Зубра" М.Гусоўскага. Сустаршыня Саюза пісьменнікаў Расіі, галоўны рэдактар часопіса "Современник" распавёў пра сумесныя праекты — тыя, што ёсць і плануюцца на будучае.

Паўсюдна адчувалася агульная зацікаўленасць у размове пра літаратуру. Выступленні беларускіх творцаў чаргаваліся з прамовамі гасцей, запрошанымі прадстаўнікамі іншых міністэрстваў і ведамстваў. Час праляцеў незаўважна, і два снежаньскія дні дыскусій ды творчых спрэчак прыняццем рэзалюцыі на форуме не завяршыліся. Пасля яго падчас рабочых сустрэч з дэлегацыямі былі падпісаныя дамовы аб супрацоўніцтве паміж СПБ і Саюзам пісьменнікаў Балгарыі; паміж СПБ і Саюзам арабскіх пісьменнікаў Сірыі.

Наступны з'езд Саюза пісьменнікаў Беларусі адбудзецца праз 5 год.

Ярына РЫТАМІНСКАЯ

● *На працягу двух дзён работы ў прэзідыум прыходзілі дзесяткі тэлеграм ад калег з Беларусі і з-за мяжы —ад Беларускага аграпрамысловага Саюза, ад Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, з Санкт-Пецярбургскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Расіі, ад пісьменнікаў з Амерыкі (А.Мар, галоўны рэдактар газеты "Руская Амерыка", Ю.Васілеўскі, гал. рэд. Газеты "Час", Я.Карлік, дырэктар радыёпраграм радыёстанцыі "Наш голас", Нью-Йорк ды інш.), з Фонду расійскіх паэтаў у Лондане, ад Саюза пісьменнікаў Францыі, а таксама ад імя Праўлення Саюза пісьменнікаў Малдовы, Нацыянальнага Саюза пісьменнікаў Кыргызскай Рэспублікі, ад Саюза пісьменнікаў Паўночнай Амерыкі, ад арганізацыі афра-азіяцкіх пісьменнікаў, ад старшыні Савета друку Турцыі, ад Саюза пісьменнікаў Кітая, пісьменнікаў Італіі і інш.*

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь

Удзельнікам з’езда грамадскага аб’яднання “Саюз пісьменнікаў Беларусі”

Паважаныя сябры!

Сардэчна віншую вас з адкрыццём з’езда грамадскага аб’яднання “Саюз пісьменнікаў Беларусі”.

Ваш форум праходзіць напярэдадні 2007 года, у якім мы будзем адзначаць 125-годдзе з дня нараджэння народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа. Менавіта яны стаялі каля вытокаў Саюза пісьменнікаў БССР, які выхаваў шмат майстроў мастацкага слова, атрымаўшых прызнанне ва ўсім свеце.

Ваш Саюз закліканы ўзбагаціць традыцыі вялікіх песняроў, згуртаваць лепшыя пісьменніцкія сілы краіны для ажыццяўлення дзяржаўнай культурнай палітыкі, папаўнення духоўнай скарбніцы нашага народа высокамастацкімі творамі, прысвечанымі гісторыі і сучаснаму жыццю Бацькаўшчыны.

Няхай гэты з’езд паспрыяе паспяховаму развіццю літаратурнай творчасці і з’яўленню новых імён пісьменнікаў, якія праславяць Беларусь. Жадаю вам моцнага здароўя, невычэрпнага натхнення, шчасця і дабрабыту.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА
22 снежня 2006 года

ПРЫВІТАЛЬНАЕ СЛОВА
Высокапраасвяшчэннага Філарэта, мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі З’езду Саюза пісьменнікаў Беларусі
22 снежня 2006 года

Шаноўныя ўдзельнікі З’езда!

Сардэчна вітаю мастакоў слова зямлі Беларускай, якія сабраліся на свой форум.

Прызванне пісьменніка — адно з самых высакародных і адказных. Праца са словам — справа надзвычай далікатная, якая патрабуе вялікага напружання духоўных і душэўных сіл. Пісьменнік судакранаецца з самымі тонкімі праявамі чалавечага духу, яго літаратурная творчасць па прыродзе сваёй узыходзіць да рэлігійна-маральных асноў быцця.

Таму настолькі высокая яго адказнасць. Да кожнага чалавека звернута перасцярога Госпада: “... ад слоў сваіх апраўдаешся, і ад слоў сваіх асудзішся” (Мф. 12:37). Але да пісьменніка яна мае асаблівае дачыненне.

Натхнёнага і жывога пісьменніцкага слова — якое суцяшае, выкрывае, настаўляе — чакаюць людзі. Яны хочуць чэрпаць з яго праўду пра жыццё, пра сябе, пра Бога.

Пісьменнік заўсёды з’яўляецца настаўнікам народа, часам сам таго не ведаючы. У сілу гэтага ён здольны быць і носьбітам хрысціянскага дабравесця. Царква блаславляе творчасць, якая ўзнаўляе скажоны грахом вобраз Божы, садзейнічае духоўнаму пераўтварэнню асобы.

Маральнае аздараўленне душы чалавека з’яўляецца задачай не толькі рэлігійных дзеячаў, але і ўсіх творчых людзей. Сапраўды народны пісьменнік не можа стаяць убаку ад духоўных праблем, асабліва — якія датычацца моладзі. І гэтыя нераўнадушныя адносіны да лёсу сваёй Айчыны здольныя аб’яднаць сёння пісьменніцкую грамадскасць.

Хачу пажадаць удзельнікам З’езда, усім пісьменнікам Беларусі творчага натхнення, моцы, душэўных і цялесных сіл, узаемнай згоды і міру. Дапамажы вам Гасподзь ва ўсіх вашых добрых справах!

Дарагія таварышы, сябры!

Сардэчна вітаю ўдзельнікаў і гасцей з’езда Саюза пісьменнікаў Беларусі. Чытачы Расіі, краін СНД шануюць імёны славутых беларускіх пісьменнікаў. Вашы кнігі перакладзеныя на многія мовы народаў свету, але найперш — на рускую мову. Вашы таленавітыя вершы і проза даўно сталі набыткам рускай і сусветнай культур. Героі вашых твораў з’яўляюцца прыкладам дабрыні, мужнасці, чалавечай годнасці. Адлюстраванне ў Вашых кнігах жыцця і лёсу беларускага народа здабыло Вам чытацкую любоў і глыбокую павагу калег і Вашых сяброў.

У няпросты для культуры нашых дзяржаў час Вы застаяцеся паслядоўнымі прыхільнікамі высокіх традыцый беларускай і рускай літаратур, захавальнікамі і творцамі Слова.

Зычу плённай працы Вашаму з’езду, моцнага здароўя, шчасця яго ўдзельнікам. Перакананы, што наша сумесная дзейнасць у Міжнароднай Супольнасці Пісьменніцкіх Саюзаў будзе спрыяць высакароднай справе збліжэння і ўзаемадзеяння нашых літаратур, нашых народаў.

Старшыня Выканкама МСПС,
Герой Сацыялістычнай Працы,
Лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўных прэмій,
акадэмік Расійскай акадэміі адукацыі
С.У. Міхалкоў

ДАКЛАД СТАРШЫНІ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ МІКАЛАЯ ЧАРГІНЦА НА З’ЕЗДЗЕ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

Паважаныя дэлегаты і госці з’езда! Бягучы 2006 год быў няпросты для нашага грамадскага аб’яднання “Саюз пісьменнікаў Беларусі”, але ў той жа час ён быў шматабяцальны, бо нацэльваў кожнага пісьменніка на стваральную, творчую дзейнасць.

Вырашаны цэлы шэраг асноўных пытанняў. У сувязі з гэтым нельга не выказаць сёння словы ўдзячнасці Прэзідэнту краіны Аляксандру Рыгоравічу Лукашэнку і кіраўнікам усіх рангаў, якія аказвалі і аказваюць падтрымку Саюзу пісьменнікаў Беларусі. Яскравым і пераканаўчым доказам увагі да нашай пісьменніцкай працы з’яўляецца прыняцце Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, накіраванага на дзяржаўную падтрымку Саюза пісьменнікаў Беларусі. Іншымі словамі, створаны ўсе ўмовы для таго, каб літаратура, якая на працягу апошніх гадоў пятнаццаці, скажам напрамую, па віне саміх жа пісьменнікаў і, у першую чаргу, іх кіраўнічай “эліты” стала своеасаблівым востравам забыцця, на якім раскашавалі праціўнікі прагрэсу, якія, учадзеўшы ад непрызнання беларускай дзяржаўнасці, паядналіся з непрыхаванымі праціўнікамі Беларусі, забыліся на тое, што літаратура і мастацкая творчасць павінна служыць інтарэсам народа. Сёння мы ўпершыню за гэтыя многія гады на пісьменніцкім з’ездзе пачулі родны нацыянальны дзяржаўны гімн нашай Беларусі, аўтар слоў якога Уладзімір Іванавіч Карызна знаходзіцца ў Прэзідыуме сённяшняга з’езда.

Успомніце, пісьменнікі-ветэраны, ды і не толькі ветэраны, калі вы бачылі, каб нас, пісьменнікаў, вітала сталіца Беларусі? Думаю, вы звярнулі ўвагу на расцяжкі на галоўных вуліцах Мінска з прывітаннямі пісьменнікам, а таксама чулі гэтыя прывітанні па радыё і тэлебачанні. А тое, што з намі ў гэтай зале прысутнічаюць шмат хто з высокіх дзяржаўных кіраўнікоў, у тым ліку першы намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, акадэмік Анатоль Мікалаевіч Рубінаў, міністры культуры, адукацыі, кіраўнікі іншых міністэрстваў і ведамстваў, Мінскага гарадскога і абласных выканаўчых камітэтаў, буйнейшых газет, часопісаў, тэлерадыёкампаній, нашы калегі — старшыня Саюза кампазітараў Ігар Міхайлавіч Лучанок і старшыня Саюза кінематаграфістаў Юрый Мікалаевіч Цвяткоў, дэлегацыі пісьменнікаў з адзінаццаці дзяржаў блізкага і далёкага замежжа, кіраўнік ветэранскай арганізацыі нашай краіны Анатоль Мікалаевіч Новікаў, а таксама наша маладая змена — члены Беларускага рэспубліканскага Саюза моладзі, студэнты гуманітарных факультэтаў ВНУ — гэта яшчэ адзін доказ адраджэння павагі ўлады і народа да пісьменнікаў. Сапраўды, мы адраджаем тыя ідэі, якімі кіраваліся заснавальнікі Саюза пісьменнікаў Беларусі Янка Купала і Якуб Колас. Ужо ў бягучым годзе нашы пісьменнікі наладзілі больш за дзесяць тысяч сустрэч з чытачамі і — што самае важнае — з моладдзю і дзецьмі. Менавіта для гэтай катэгорыі чытачоў, як ніколі раней, важным з’яўляецца слова творцы, а для пісьменніка — адчуванне жыцця і клопатаў людзей розных прафесій, асабліва моладзі. Бо для пісьменніка, бадай, самае важнае — бачыць рэальны зрэз рэальнага жыцця.

За адзін год наша пісьменніцкая арганізацыя вырасла амаль утрая. Мы радуемся, што ў нашых радах — лаўрэаты Дзяржаўных і многіх міжнародных прэмій, вядомыя не толькі ў Рэспубліцы Беларусь, але і далёка за яе межамі літаратары: Георгій Марчук, Уладзімір Карызна, Алесь Савіцкі, Генадзь Пашкоў, Анатоль Сульянаў, Эдуард Скобелеў, Уладзімір Скарынкін, Анатоль Аўруцін, Раіса Баравікова, лётчык-касманаўт Уладзімір Кавалёнак, Віктар Праўдзін, Міхась Пазнякоў і шмат іншых.

Мы сёння з найвялікшым болем успамінаем тых пісьменнікаў, нашых калег і сяброў, хто пакінуў нас: Івана Пятровіча Шамякіна, Таісу Мікалаеўну Бондар, Вячаслава Іосіфавіча Стому, Пятра Фёдаравіча Прыходзьку, Міхася Аляксандравіча Шыпілава, Наталлю Уладзіміраўну Прыступу, Івана Лук’янавіча Сяргейчыка, Леаніда Кірылавіча Гукава, Леаніда Анатольевіча Матусевіча, Валянціна Георгіевіча Панамарова, а таксама народнага пісьменніка Беларусі Івана Якаўлевіча Навуменку, які літаральна некалькі дзён таму пакінуў нас.

Нягледзячы на пэўныя непазбежныя цяжкасці, мы змаглі вырашыць шэраг арганізацыйных пытанняў. Прыгадайце: раней у Саюзе пісьменнікаў асноўнымі кадрамі былі жыхары Мінска, а ў абласцях рэспублікі — лічаныя асобы, у Мінскай вобласці і горадзе Мінску нават не было сваіх пісьменніцкіх арганізацый. Стваралася ўражанне, што таленты знаходзяцца толькі ў сталіцы. Зараз жа ў кожнай вобласці створаны і дзейнічаюць свае творчыя пісьменніцкія аддзяленні, колькасны склад якіх вагаецца ад дваццаці (Магілёўская вобласць) да трыццаці аднаго (у Віцебскай і Гомельскай абласцях).

Усе абласныя і Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі маюць статус юрыдычнай асобы і поўную самастойнасць у межах Статута Саюза пісьменнікаў Беларусі. Яны маюць свае разліковыя рахункі ў банках, а таксама права — мы прынялі такое рашэнне — пакідаць у сваім распараджэнні 40 працэнтаў ад членскіх узносаў. Больш за тое, Статут Саюза пісьменнікаў Беларусі дазваляе для асобных пісьменнікаў, у першую чаргу для ветэранаў і інвалідаў, зніжаць суму ўзносаў і нават вызваляць гэтую катэгорыю пісьменнікаў ад уплаты іх поўнасцю.

У нашай грамадскай арганізацыі створана стройная структура і сістэма кіравання. Пры гэтым абласныя аддзяленні таксама выбудавалі сваю своеасаблівую “вертыкаль” шляхам наладжвання трывалых кантактаў з літаратурнымі аб’яднаннямі пры амаль што ўсіх раённых газетах і бібліятэках, каб не пакінуць без увагі ніводнага новага таленту. Асабліва плённа ідзе гэта праца ў Брэсцкай (старшыня — Анатоль Крэйдзіч), Віцебскай (старшыня — Тамара Краснова-Гусачэнка) і Гомельскай (старшыня — Уладзімір Гаўрыловіч) абласцях.

Нельга не адзначыць дзейнасць самай буйной структуры нашага Саюза — Мінскага гарадскога аддзялення, дзе налічваецца 163 пісьменнікі. Акцэнт зроблены тут на працу з моладдзю. Пры гэтым праводзіцца яна не толькі ў ВНУ, але і ў школах, бібліятэках і нават у дзіцячых садках, дзе арганізуюцца спартакіяды і алімпіяды па літаратуры. Важна, на наш погляд, тое, што ўдзельнічаюць у гэтых мерапрыемствах і беларуска- і рускамоўныя пісьменнікі, бо менавіта такім чынам дзецям прывіваецца любоў і да беларускай, і да рускай літаратуры. Характэрна, што Мінскі гарвыканкам і ягоныя кіраўнікі Міхаіл Якаўлевіч Паўлаў і Міхаіл Сяргеевіч Ціцянкоў асабіста дапамагаюць нашым калегам-мінчанам у гэтай справе: ствараюцца клубы юных літаратараў, выпускаюцца ў свет альманахі ў навучальных установах, праводзяцца агульнагарадскія семінары і фестывалі. Разам з пісьменнікамі тут у адным страі і гарадскі Камітэт па адукацыі, і аддзяленне Беларускага рэспубліканскага Саюза моладзі, і цэлы шэраг выдавецтваў, бібліятэк.

Кіраўнік Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхась Пазнякоў паказвае прыклад таго, што пісьменнік не павінен траціць повязей са сваёй “малой радзімай”: кожны год у сваёй роднай школе на Быхаўшчыне ён ладзіць літаратурныя святы, запрашае на іх вядомых паэтаў і празаікаў. Штогод Міхась Паўлавіч робіць падарункі школьнай бібліятэцы — па 400—500 кніг, набытых на ўласныя зберажэнні. Акрамя таго, гэты літаратар заснаваў пяць імянных грашовых прэмій, якія штогод уручае асабіста лепшым вучням-землякам. Паказальна і тое, што кіраўніцтва Быхаўскага раёна ў падтрымку гэтых ініцыятыў актыўна ідзе насустрач — рэгулярна ладзяцца сустрэчы паэта з чытачамі ў райцэнтры, у працоўных калектывах і бібліятэках раёна, з вясковымі жыхарамі.

Нестандартна, з выдумкай працуе і Гомельская абласная пісьменніцкая арганізацыя. Да прыкладу, вынікам творчага супрацоўніцтва пісьменнікаў Гомельшчыны і далёкай Швейцарыі з’явіўся абмен двухтыднёвымі візітамі старшыні Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзіміра Гаўрыловіча і швейцарскага пісьменніка Бутлера, адпаведна, у Швейцарыю і Беларусь. Вынікам гэтых візітаў стала кніга, сумесна падрыхтаваная да друку ў Швейцарыі, у якой аб’ектыўна і са станоўчых пазіцый адлюстроўваецца жыццё нашай краіны.

Галоўнае — гэта тое, што Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб дзяржаўнай падтрымцы грамадскага аб’яднання “Саюз пісьменнікаў Беларусі” яскрава паказаў, што літаратура ў нашай краіне з’яўляецца справай найвялікшага дзяржаўнага значэння і менавіта дзяржава, якая і без таго нямала зрабіла для захавання і развіцця літаратурных традыцый, цяпер бярэ на свае плечы значны дадатковы клопат аб удасканаленні літаратурнага працэсу нашай Бацькаўшчыны.

Як вядома, у наступным годзе наша краіна будзе адзначаць юбілеі адразу двух заснавальнікаў айчыннай літаратуры — 125-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. Па ініцыятыве Саюза пісьменнікаў Беларусі, падтрыманай Міністэрствам культуры рэспублікі, а затым Урадам і Прэзідэнтам краіны, 2007 год аб’яўлены літаратурным годам Янкі Купалы і Якуба Коласа. Праўда, нашы апаненты, дзе магчыма і дзе немагчыма, плявузгаюць пра тое, што якраз яны з’яўляюцца прадаўжальнікамі слаўных традыцый нашых айчынных класікаў. Хтосьці, магчыма, і верыць ім. Але давайце паглядзім, як зусім нядаўна ладзілася іхняе зборышча, названае імі з’ездам. Дык вось “з’езд” гэты адкрыўся выкананнем гімна “Магутны Божа”, словы якога сачыніла фашыстоўская паслугачка Наталля Арсеннева, якая асабіста “здавала” фашысцкім акупантам нашых падпольшчыкаў: вядомы, напрыклад, факт, калі аднаго маладога чалавека па яе даносе акупанты аблілі бензінам і спалілі жывым. Успомнім і пра тое, што ў часы Зянона Пазняка і Станіслава Шушкевіча арсеннеўскую падробку актыўна спрабавалі зрабіць... дзяржаўным гімнам нашай краіны. Ці не кашчунства, ці не здзек гэта над народам, які найбольш за ўсіх у Еўропе панёс ахвяр падчас другой сусветнай? А так званы “дзяржаўны сцяг”, якому да гэтага часу пакланяюцца некаторыя? Так званаму “дзяржаўнаму сцягу” — бел-чырвона-беламу трыкалору, з якім па акупіра-

ваных беларускіх гарадах і вёсках маршыравалі паліцаі і які з абурэннем быў адвергнуты ў якасці нацыянальнай сімволікі на ўсенародным рэферэндуме больш за дзесяць гадоў таму. Думаю, што толькі гэтых прыкладаў ужо дастаткова, каб зразумець канчаткова, якім "багам" моляцца нашы апаненты і крытыканы. Уводзіць у падман літаратурную грамадскасць ім усё цяжэй, бо радавыя члены іх суполкі ўсё больш актыўна пераходзяць пад наш, сапраўды дзяржаўны сцяг. Слова "сцяг" я ўжываю тут нават не ў маштабна-палітычным значэнні: Саюз пісьменнікаў Беларусі цяпер сапраўды мае свой сцяг, свой нагрудны знак для кожнага з членаў нашай арганізацыі, свае і дыпломы, і свае ганаровыя граматы. Некалькі пісьменнікаў-ветэранаў ужо нават удастоены звання "Ганаровы член Саюза пісьменнікаў Беларусі". Усім, хто своечасова падаў дакументы, выдадзены членскія білеты новага ўзору. Усё гэта — значныя прыкметы адраджэння і абнаўлення беларускай пісьменніцкай арганізацыі.

Радуе, што члены нашай арганізацыі ў розных выдавецтвах краіны выдаюць вялікую колькасць кніг паэзіі, прозы, драматургіі, дзіцячай літаратуры. Сярод найбольш значных хацелася б адзначыць кнігу лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Раісы Баравіковай "Казкі астранаўта. Касмічныя падарожжы беларусаў", якая, як і кніга віцебскага паэта Алега Салтука "Не разлюбі", вылучана на саісканне прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, раман нашага слыннага вучонага, акадэміка Уладзіміра Гніламёдава "Уліс з Прускі", кнігу паэзіі Віктара Шніпа "Балада камянёў", зборнік вершаў Генадзя Пашкова "Тваім святлом блаславёны", аповесць Наталлі Голубевай "Радзімічы", кнігу эсэ Алеся Марціновіча "Свечка на золкім ветры", новыя паэтычныя зборнікі Тамары Красновай-Гусачэнкі, Валянціны Паліканінай, Браніслава Спрынчана, Кастуся Цыбульскага, Юрыя Фатнева, Юрыя Сапажкова, Ганада Чарказяна, Валянціна Лукшы, Рыгора Сакалоўскага і іншых.

У жанры дзіцячай літаратуры па-ранейшаму ярка і самабытна працуе Міхась Пазнякоў — пацверджаннем гэтага з'яўляецца нядаўна выдадзеная ў "Мастацкай літаратуры" яго кніга "Вавёрчына хата". Адразу некалькі літаратурных прэмій у Расіі і ва Украіне атрымалі кнігі паэзіі Анатоля Аўруціна "Неживая вода" и "Неказистая Родина". Парадаваў сваёй кнігай "Вяртанне да цішыні" вядомы паэт Змітрок Марозаў. На вастрэйшых праблемах сучаснасці засяродзіў увагу ў кнізе "Асцярожна: глабалізм" Савелій Паўлаў. Па-ранейшаму ў літаратурным страі Эдуард Скобелеў, Алесь Савіцкі, іншыя ветэраны айчыннай літаратуры.

Даўно знайшлі сваіх прыхільнікаў майстры дэтэктыўнага жанру Сяргей Трахімёнак і Віктар Праўдзін. Пры гэтым сваёй творчасцю яны пераконваюць, што ў гэтым жанры могуць быць сапраўдныя мастакі слова.

Яркім паказчыкам вынікаў працы творчай арганізацыі з'яўляюцца сустрэчы з тымі, для каго пісьменнікі працуюць, — з чытачамі. Надзвычай актыўны ўдзел прынялі члены нашага Саюза ў перадвыбарнай прэзідэнцкай кампаніі, мастацкім словам і сваёй высокай духоўнасцю яны агітавалі за цяперашняга Кіраўніка дзяржавы. Упершыню за апошнія дванаццаць гадоў пісьменнікі і дзяржаўная ўлада аказаліся такім чынам з аднаго боку барыкады. Інакш і быць не магло. Каго і ў чым, скажыце, здольны пераканаць нашы апаненты, калі пераважная большасць народа галасуе за адну палітыку, а яны, "кавалі чалавечых душ", прапаведуюць зусім іншае? Ці варта пасля гэтага здзіўляцца, што на працягу тых гадоў, калі вярхушка старога саюза верхаводзіла ў нашай культуры, цікавасць да айчыннай літаратуры значна знізілася, а ў краіне не з'явілася ніводнага новага пісьменніцкага імя? Бо чалавек шукае ў кнізе тое, што адпавядае яго клопатам, дае адказы на актуальнейшыя пытанні, а яго прымушаюць думаць так, як не думаў ніколі ні ён, ні ягоныя продкі. Напрыклад, прымушаюць лічыць расіян сваімі непрыяцелямі. Аднак такога наш народ ніколі не прымаў і прыняць не можа. І таму выдатна, што лепшыя нашы пісьменнікі не толькі мастацкім словам, але і асабістымі ўчынкамі агітуюць за нашы ідэалы. А што датычыцца беларускай мовы, то я перакананы, што любоў да роднага слова,

роднай культуры выхоўваецца не чарговай кампаніяй па беларусізацыі, як гэта было ў часы Пазняка і Шушкевіча, а ў выніку карпатлівай, разлічанай на працяглы час штодзённай працы. І пачынаць трэба з самых маленькіх — з дзіцячых садкоў, з пачатковых класаў.

Нельга пагадзіцца з тымі пісьменнікамі, якія лічаць, што яны галоўныя і ці не адзіныя носьбіты не толькі культуры і адукаванасці, але і духоўнасці. А некаторыя з нас, прызнаемся, спрабуюць прысвоіць сабе права судзіць усіх тых, чыя думка не супадае з ягонай, а таксама права лічыць ход сваіх думак адзіна правільным і справядлівым. Такая спроба манапалізаваць усе духоўныя каштоўнасці і ўвесь духоўны свет не толькі беспадстаўная, але і небяспечная, бо ператварае пісьменніка ў своеасаблівага абмежаванага інтэлектуала-дыктатара. Асабліва небяспечны той, які не толькі не цікавіцца як вырашаюцца ў краіне важнейшыя пытанні жыццезабеспячэння чалавека і грамадства, але і не жадае бачыць ніякіх станоўчых зрухаў, нічога не прымае. Ён толькі крытыкуе з маніякальнай настойлівасцю ўсё і ўсіх, бессаромна крытыкуе ўладу, краіну і ўсё, што скіравана супраць парадку ў краіне, грамадзянінам якой з'яўляецца ён сам.

Таму вельмі важна, каб кожны наш пісьменнік ведаў як мага больш і валодаў максімумам праўдзівай інфармацыі пра жыццё дзяржавы, каб ведаў стан эканомікі і каб, безумоўна, бачыў месца прымянення сваіх ведаў, свайго таленту. Таму мы так настойліва шукаем новыя формы стасункаў нашых пісьменнікаў з усімі слаямі нашага грамадства. А вось ці ідзём мы, пісьменнікі, у нагу з нашым народам, які мацуе магутнасць роднай Беларусі, вырошчвае багаты ўраджай? Няхай на гэта пытанне адкажа сэрца кожнага з нас. Мы зробім усё магчымае, каб даць кожнаму члену нашага Саюза магчымасць атрымліваць любую інфармацыю, асабіста вывучаць стваральныя працэсы знутры, больш сустракацца з людзьмі. Гэта трэба для таго, каб ствараліся добрыя творы, а пісьменнікі каб сваім талентам дапамагалі людзям мацаваць бяспеку і незалежнасць нашай Радзімы.

Зразумела, для пісьменніка вельмі важна, каб ягоны твор убачыў свет, каб атрымаў доступ да чытача. У гэтым сэнсе мы адзначаем прадуктыўнае супрацоўніцтва з дзяржаўнымі выдавецтвамі, у першую чаргу з выдавецтвам "Мастацкая літаратура". Удзячны таксама мясцовым органам улады, аблгаррайвыканкамам за іх увагу да пісьменнікаў — жыхароў іхніх рэгіёнаў. Менавіта з іх дапамогай у бягучым годзе ўбачылі свет творы некалькіх дзесяткаў нашых калег. Мы запрасілі на з'езд кіраўнікоў недзяржаўных выдавецтваў. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падтрымаў ідэю супрацоўніцтва нашага Саюза з недзяржаўнымі выдавецтвамі. Упэўнены, што такое супрацоўніцтва дазволіць не толькі павялічыць выпуск твораў нашых пісьменнікаў, але і прынясе карысць выдаўцам.

Так, мы будзем садзейнічаць выхаду ў свет твораў кожнага члена нашай арганізацыі, але і да саміх твораў будзем прад'яўляць неабходныя патрабаванні, каб яны адпавядалі галоўнаму прызначэнню літаратуры — карыснасць для людзей. Таму вельмі неабходна стварэнне ў Саюзе інстытута літаратурных кансультантаў, неабходна больш шырокае прыцягненне нашых літаратурных крытыкаў да аналізу рукапісу. Зусім ненармальным трэба лічыць становішча, калі з бюджэту краіны выдзяляюцца

сродкі на выданне кнігі, а яна не карыстаецца попытам у чытача і безнадзейна залягае на кніжную паліцу. Таму заклікаю пісьменнікаў, якія часам дужа настойліва стукаюцца ў любыя дзверы з патрабаваннем выдаць ягоны твор: ці не лепей яшчэ раз асэнсаваць напісанае, параіцца, зрабіць усё, каб твор быў запатрабаваны!

Зроблены першыя крокі ў супрацоўніцтве Саюза пісьменнікаў Беларусі з Міністэрствам адукацыі, але зрабіць прыйдзецца яшчэ шмат, бо гаворка ідзе пра галоўнае — выхаванне дзяцей. Зразумела, што не падручнікі па фізіцы ці матэматыцы вінаваціць трэба, гаворачы пра хібы ў выхаванні маладога пакалення. Менавіта на ўроках па гуманітарных прадметах, у першую чаргу, па літаратуры, рускай і беларускай, адбываецца духоўнае фарміраванне асобы будучага грамадзяніна. Пра мікраскапічную колькасць гадзін, адведзеных у школьнай праграме для вывучэння літаратуры, гаварылася не раз.

У бягучым годзе наш Саюз атрымаў магчымасць разам з тэлеканаламі "Лад" і "Сталічнае тэлебачанне" штомесяц рабіць па дзве перадачы з паўторам. Па "Сталічным тэлебачанні" мы ўжо здолелі расказаць пра 79 пісьменнікаў. Набыла таксама папулярнасць у тэлегледача штотыднёвая 26-хвілінная праграма "Слова пісьменніка" на тэлеканале "Лад". Самы істотны недахоп гэтай праграмы — адсутнасць аператыўнасці, паколькі здымачная брыгада атрымлівае тэхніку толькі адзін раз на тыдзень і на вельмі непрацяглы час, а гэта азначае, што многія цікавыя падзеі з пісьменніцкага жыцця застаюцца проста "па-за кадрам".

Яшчэ адно надзённае пытанне — перыядычныя літаратурна-мастацкія выданні. Без уласных выданняў, якія адлюстроўвалі б палітыку нашага Саюза ў галіне творчасці, вельмі цяжка праводзіць сваю лінію. Таму разам з Міністэрствам інфармацыі прынята рашэнне аб увядзенні Саюза пісьменнікаў Беларусі ў лік заснавальнікаў штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва".

Наладжваецца плённае супрацоўніцтва з Міністэрствам культуры. Беларускія пісьменнікі ўключаюцца ў творчыя калектывы Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску", Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне, Усебеларускага фестывалю нацыянальных культур, Усебеларускага фестывалю народнага гумару "Аўцюкі", рэспубліканскага фестывалю "Майстры мастацтваў — працаўнікам вёскі" і іншых.

Самыя цёплыя кантакты ў Саюза пісьменнікаў Беларусі з беларускай арміяй. З Саюза беларускіх пісьменнікаў практычна ў поўным складзе перайшла ў нашу пісьменніцкую арганізацыю ваенна-шэфская камісія, якую ўжо шмат гадоў узначальваюць пісьменнікі Анатоль Сульянаў і Яўген Каршукоў. Няма сумнення, што армія гатова пайсці насустрач майстрам слова і ўзнавіць практыку творчых камандзіровак пісьменнікаў у воінскія падраздзяленні з наступнай публікацыяй найбольш вартых твораў не толькі ў рэспубліканскім, але і ў армейскім друку. Думаецца, што невялікая бібліятэчка твораў на армейскую тэму ў якасці дадатку да часопіса "Армія" таксама была б цудоўным падарункам усім, хто неабыякавы да стану баявога духу нашых воінаў-абаронцаў.

Усё сказанае вышэй у той ці іншай ступені звязана з прапагандай літаратуры, дзе галоўнай постаццю з'яўляецца чытач як асноўны спажывец інфармацыі. Але не грэшна ўспомніць тут і пісьменніка. Сёння ён прыходзіць на сустрэчу з чытачом, як правіла, выключна на грамадскіх пачатках, нічога не атрымліваючы за сваю працу. Але мы памятаем савецкія часы, калі ўсё было інакш: пры Саюзе пісьменнікаў існавала бюро прапаганды мастацкай літаратуры, якое камандзіравала пісьменнікаў па ўсёй краіне, а пісьменнікі за свае выступленні перад чытачамі атрымлівалі досыць канкрэтнае ўзнагароджанне. Прычым частка атрыманых грошай заставалася ў Саюзе пісьменнікаў, што дазваляла аказваць, пры неабходнасці, матэрыяльную дапамогу пісьменнікам. Думаецца, надышоў час аднавіць такую практыку.

Зразумела, пісьменнік заслугоўвае і пэўнай сацыяльнай падтрымкі, і належнага медыцынскага абслугоўвання, і добрых умоў для адпачынку і творчасці. Пытанні сацыяльнага забеспячэння членаў нашага Саюза мы будзем падымаць. Чаму, скажам, творчы стаж не дае ніякіх падстаў для прызначэння пенсіі?

Выкарыстаны далёка не ўсе рэсурсы па ўзаемасупрацоўніцтве з Саюзам кампазітараў і з Саюзам кінематаграфістаў. Адносіны "паэт — кампазітар", "пісьменнік — кінематаграфіст" павінны быць больш аптымізаванымі як у сэнсе колькасці створаных твораў музыкі і кіно, так і з пункта гледжання пашырэння колькасці ўдзельнікаў працэсу стварэння гэтых надзвычай важных відаў мастацтва.

Неабходна наладзіць супрацоўніцтва з БРСМ, сучасным камсамолам. Відаць, нашым маяком тут павінен стаць часопіс "Маладосць", які мог бы выступіць сумесна з БРСМ ініцыятарам шмат якіх яркіх грамадскіх акцый. На вялікі жаль, ужо некалькі гадоў не выходзіць "Бібліятэка часопіса "Маладосць", якая ў свой час дала добры старт у літаратуру шмат якім маладым талентам. "Згубіліся" недзе таксама традыцыйныя штогоднія прэміі "Маладосці", якія былі своеасаблівым арыенцірам і творчай планкай. Менавіта супрацоўніцтва з БРСМ магло б быць тут карысным для абодвух бакоў.

Аналагічныя праблемы маюць і іншыя літаратурна-мастацкія часопісы — "Полымя", "Нёман", "Всемирная литература". Лічым, што ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі" павінна стаць сузаснавальнікам гэтых выданняў, а члены Саюза — іх актыўнымі чытачамі і агітатарамі па іх распаўсюджванні.

У бліжэйшы час мы аб'явім аб заснаванні штогадовага літаратурнага конкурсу. Хацелася б, каб міністэрствы інфармацыі, культуры і адукацыі разам з Саюзам выступілі яго сузаснавальнікамі. Думаецца, што гэта падняло б прэстыж літаратуры і пісьменнікаў.

У наступным 2007 годзе, які аб'яўлены ў краіне годам Янкі Купалы і Якуба Коласа пісьменнікаў чакае вялікая праца па прапагандзе творчасці класікаў айчыннай літаратуры. Нас чакаюць шматлікія святы і фестывалі паэзіі, агляды-конкурсы таленавітай моладзі, адчыняцца студыі юных літаратараў, новыя літаратурныя гасцёўні, пройдуць тыдні кніг для дзяцей і юнацтва, фестывалі казак і гумару. У перспектыве — закладка пісьменніцкага парку. Не выключана, што ў самы бліжэйшы час па рэках нашай краіны паплыве літаратурны цеплаход... Ажыццявіць усё гэта мы зможам толькі разам, толькі тады, калі будзем адзінай сям'ёй творцаў, якія ўвесь свой талент паставілі на службу інтарэсам Радзімы, інтарэсам літаратуры.

(Даклад друкуецца ў скарочаным варыянце)

Літаратурны працэс у люстэрку садакладаў

А. Аўруцін з І. Галубнічым, саветнікам па беларускай літаратуры Міжнароднай суполкі пісьменніцкіх саюзаў

Анатоль АЎРУЦІН, першы сакратар Саюза пісьменнікаў Беларусі

Што б там ні казалі прадстаўнікі іншых літаратурных жанраў, як бы глыбока і праўдзіва ні адлюстроўвала жыццё проза, як бы ні хвалявала чалавечыя сэрцы публіцыстыка, ні захапляла драматургія, вяршыняй творчасці ў любой краіне і ва ўсе часы была і будзе паэзія. Успомнім, да прыкладу, чые імёны дайшлі да нас з часоў Антычнасці? Некалькі самых крыважэрных імператараў і... паэты: Авідзій, Гарацый, Катул... Адначасова з імі жылі мільёны іншых людзей — больш сытых, больш аблашчаных, больш забяспечаных, ад якіх не тое што памяці — і знаку не засталося. У гісторыі заўсёды застаюцца імёны сапраўдных паэтаў у першую чаргу таму, што менавіта паэту дадзена прадбачыць тое, што чакае чалавецтва ў будучыні. І не толькі. У паэта асаблівая місія — бачыць падзеі, сведкам якіх ён з'яўляецца, у асаблівым святле, у асаблівым ракурсе. Так, як не дадзена ўбачыць іх нікому іншаму. Можа быць, менавіта з-за гэтай вялізнай перагрузкі паэтычным геніям нярэдка адпушчана так мала зямных гадоў...

На жаль, пад націскам заходняй маскультуры змяніліся многія прыярытэты ў нашым грамадстве. Паэзія цяпер не ў асаблівай пашане, кнігі вершаў гадамі незапатрабаваныя ляжаць на кніжных паліцах, усё менш людзей спрабуюць лекаваць уласныя душэўныя раны паэтычнымі радкамі любімага аўтара. Усё гэта, безумоўна, так. Але тое, што адбываецца, зусім не адмяняе законаў развіцця чалавецтва, прарочай ролі паэта ў грамадстве. Творцы, калі яны сапраўды валодаюць паэтычным дарам, а не проста з'яўляюцца аўтарамі рыфмаваных зборнікаў, не пераставалі і не маглі перастаць быць празарліўцамі і прарокамі.

Зразумела, усё сказанае цесна звязана і з тымі працэсамі, што ідуць у літаратуры нашай краіны. Паэзія Беларусі, якая ствараецца на дзвюх дзяржаўных мовах, беларускай і рускай, узбагачае кожную з гэтых моў, рознагалоссем дараванняў уліваецца ў агульную плынь сусветнай паэзіі, не губляецца ў ёй і не падладжваецца пад чужыя матывы.

У першую чаргу я маю на ўвазе творчасць паэтаў — членаў нашай пісьменніцкай арганізацыі. Паэтаў-дзяржаўнікаў, якія добра ведаюць свае карані і тую зямлю, якая іх жывіць. "Тады ў народа ёсць паэты, калі ў паэтаў ёсць народ", — аднойчы выдыхнула наша цудоўная паэтэса Раіса Баравікова і, свядома ці не, сфармулявала тое, што сотні іншых літаратараў хацелі, але не змаглі сказаць настолькі ж ярка і вобразна.

У нядаўна выдадзенай кнізе "Тваім святлом блаславёны" другога нашага вядомага паэта, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Генадзя Пашкова таксама клапоціць духоўны свет сучасніка:

Не ўсіх падкупілі далярамі,
Не ўсе на каленях стаяць!

А Віктар Шніп — аўтар лепшай, на мой погляд, сёлетняй паэтычнай кнігі "Балада камянёў"... Не здаюць пазіцый і паэты старэйшага пакалення, сведчаннем таму зборнік "І родны дом, і цэлы свет" лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Валянціна Лукшы.

Усё з Айчынай сэрцам знітавана
На доўгі век,
Як берагі з ракой:
І радасць стрэч,
І боль пякучай раны,
І горыч страт,
І творчы неспакой.

Высокай грамадзянскасцю, імкненнем разабрацца і ў тым, што адбываецца навокал, і ў сабе самім прасякнута новая кніга Браніслава Спрынчана "Осенний вереск". Бліскучыя ўзоры паэзіі пакінуў у спадчыну Мікалай Шыпілаў, які нядаўна пайшоў ад нас.

Прыемна, што сёння ў нашай паэзіі, нягледзячы на ўсе складанасці быцця і праблемы з кнігавыданнем, плённа працуюць і майстры старэйшага пакалення: Уладзімір Карызна, Уладзімір Скарынкін, Святлана Яўсеева, Эдуард Скобелеў, Юрый Фатнеў, Яўген Каршукоў, Ала Чорная, Юрый Сапажкоў, і так званае "сярэдняе" пакаленне: Мікола Мятліцкі, Міхась Пазнякоў, Зміцрок Марозаў, Навум Гальпяровіч, Валянціна Паліканіна, Тамара Краснова-Гусачэнка, Рыгор Сакалоўскі, Андрэй Скарынкін, Валерый Грышкавец, Іван Бісеў, Вячаслаў Дашкевіч, Алена Агіна, Мікола Шабовіч, Кастусь Цыбульскі, Уладзімір Шугля, Таццяна Шпартава, і зусім яшчэ юныя: Янка Лайкоў, Алена Крыклівец, Наталля Камлюк. А на падыходзе — цэлая генерацыя маладых, якія нарадзіліся пасля развалу СССР, яны ўспрымаюць многія рэчы абсалютна па-іншаму. Менавіта дзеля гэтай творчай змены наспеў час адрадзіць семінары маладых літаратараў, праз якія прайшлі практычна ўсе сённяшнія сталыя мастакі слова.

Я зусім невыпадкова загавары ў зараз на гэтую тэму. Многія памятаюць, у якія святы душы, святы творчасці ператвараліся семінары маладых пісьменнікаў спачатку ў Каралішчавічах, а затым у Доме творчасці "Іслач". Колькі там было сустрэч, адкрыццяў, знаёмстваў, што перараслі ў шматгадовае сяброўства, як лавілі маладыя кожнае слова мастацкіх пісьменнікаў, якія прыязджалі, каб выказаць сваё меркаванне пра паэтычныя вопыты пачаткоўцаў! Падобныя семінары, асабліва ва ўмовах адсутнасці ў краіне настолькі неабходнай літаратурнай ВНУ, пераацаніць цяжка.

А ўспомніце літаратурныя аб'яднанні, якія яшчэ гадоў дваццаць—дваццаць пяць таму існавалі пры кожнай газеце. Пасяджэнні там адбываліся ў розныя дні. Адна і тая ж група маладых людзей сёння збіралася ў "Знамени юности", заўтра — ў "Чырвонай змене", паслязаўтра — ў "Мінскай праўдзе" ці ў рэдакцыі газеты "Трактар". Збіраліся недарэмна: амаль на кожнае пасяджэнне заглядваў хто-небудзь са знаных паэтаў. Я сам дзесяць гадоў запар кіраваў літаратурным аб'яднаннем "Магістраль" пры газеце "Железнодорожник Белоруссии", і добра памятаю, што на пасяджэннях у нас бывалі і народны паэт Беларусі Пімен Панчанка, і Анатоль Грачанікаў, і Мікола Аўрамчык, і Міхась Стральцоў...

Нельга не сказаць колькі словаў пра тую паэзію, якую выкладаюць нашым школьнікам і якая павінна фарміраваць іх эстэтычныя прыхільнасці. Складальнікі праграм любяць паразважаць пра тое, што, маўляў, павінны прайсці гады, перш чым меркаванне наконт таго ці іншага твора ўсталюецца ў грамадстве, і толькі пасля гэтага трэба вырашаць пытанне пра яго ўключэнне ў школьныя праграмы і праграмы ВНУ. Сёння "навінкамі" ў літаратуры ў іх лічацца творы 1980-х гадоў, нашаму школьніку толькі пачынаюць прапаноўваць творы Вайновіча, Аксёнава...

Хаця, падобная "акадэмічная" нетаропкасць назіраецца далёка не заўсёды. Сёння ў падручніках па беларускай літаратуры з класа ў клас вандруюць творы выбітных дзеячаў апазіцыі. І калі, скажам, Гілевіч ці Барадулін сапраўды маюць пэўныя заслугі перад айчыннай славеснасцю, то ўжо з'яўленне цэлай групы пасрэдных паэтаў тыпу Сяргея Законнікава ў школьных праграмах зразумець немагчыма. Тым больш, што іх творчасць падаецца так, быццам размова ідзе па меншай меры пра Блока ці Багдановіча.

У той жа час зусім незаўважным для складальнікаў нашых падручнікаў застаўся бліскучы пераклад "Песні пра зубра" класіка айчыннай літаратуры Міколы Гусоўскага, зроблены вядомым маскоўскім паэтам Станіславам Куняевым. Праца атрымала найвышэйшую адзнаку — Прэмію Саюзнай дзяржавы. Здавалася б, вось ён, крытэрый, скарыстайцеся падарункам, які зрабіў лёс. Ды не, ніхто нават і пальцам не паварушыў, каб уключыць настолькі патрэбны для абедзвюх дзяржаў пераклад у школьныя праграмы. І прыкладаў падобнай "недальнабачнасці" можна прывесці нямала.

А напрыканцы скажу наступнае. Сапраўдная паэзія — гэта заўсёды лёс. Цудоўная віцебская паэтэса Тамара Краснова-Гусачэнка неяк напісала:

Когда-нибудь
и по одной строке
Узнаешь, как жила
и чем дышала...

Не сумняваюся, што праз гады і да нашых нашчадкаў дойдзе, не можа не дайсці паэтычны набат нашай шматпакутнай эпохі. Таму што ёсць людзі, якім дадзена бачыць свет па-свойму. Імя гэтым людзям — паэты...

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ, дырэктар рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і Мастацтва»

Шаноўныя госці з'езда! Паважаныя калегі! Відавочна, кожны з нас, з тых, хто прыйшоў сёння на з'езд, ужо неаднойчы задаваўся пытаннем, а што я асабіста чакаю ад гэтай падзеі. Што павінен вырашыць прадстаўнічы форум нашага творчага саюза? Ці паўплывае сённяшняя размова на выданне кніг увогуле і асабістай кнігі кожнага з нас? Ці вырастуць тыражы літаратурна-мастацкіх выданняў? Ці разарвецца, пачынаючы з панядзелка, хатні тэлефон кожнага з членаў саюза ад запрашэнняў на сустрэчы са школьнікамі і студэнтамі?.. Усё гэта з шэрагу пытанняў, якія з'яўляюцца складнікамі прысутнасці пісьменніка ў жыцці народа і краіны і ад вырашэння якіх так ці іначай залежыць настрой у творчай рабоце. Ды вырашыць такія, скажам, тэхналагічныя клопаты — усяго толькі паўсправы, а то і шматкрат меней. І па вялікім рахунку вырашэнне гэтых і шэрагу іншых пытанняў — наўрад ці паўплывае на істотныя змены ў сітуацыі на літаратурным фронце.

Ул Гніламёдаў, А. Савіцкі і Я. Каршукоў

Пытанне з пытанняў, для разгляду якога не шкода ніякага часу, — месца пісьменніка ў развіцці грамадства, узровень адказнасці літаратара за сёння і заўтра краіны. Давайце пакінем па-за рамкамі адкрытых і публічных абмеркаванняў лозунгі і шыльды кшталту: "Чытайце беларускае!" альбо: "Чытайце нас! Чытайце лепшую ў свеце літаратуру!" Быў час — чыталі лепшае і з беларускай, і з рускай, і з сусветнай літаратуры без лозунгаў і прымусу. Як бы ні развіваўся тэхнічны прагрэс, усё ж кнізе не пагражае выміранне. І самы малады, тэхнічна адукаваны чалавек сутнасцю паводзін сваіх разумее, што "мастацтва — гэта гістарычная энцыклапедыя чалавечых зносін, супярэчлівых жаданняў, узлётаў і падзення духу, самаахвярнасці і мужнасці, паражэнняў і перамог". Але ж будзе жыць лепшая, галоўная кніга. І, відавочна, наша карпенне ў літаратурным працэсе і скіравана на яе стварэнне. Таму і спрэчкі ў творчым асяродку, таму пастаянная барацьба, якая, прызнаца, калі меркаваць па старонках нашай перыёдыкі, калі аглядаць сотні кніг, што быццам тыя недасмажаныя блінцы вылятаюць з самых розных выдавецтваў, змізарнела, нагадвае дробнае высвятленне дробных адносін. І вінавата тут не адсутнасць крытыкі і крытыкаў. Прычыны хутчэй — ва ўсеагульнай нецярпімасці, нежаданні трымаць удар ці хаця б разлічваць на яго, выпраўляючы ў шырокі свет недасканалы, сыры, часам нават як след неадрэдагаваны твор. Давайце шчыра прызнаемся самі сабе: хто як не пісьменнікі і вінаватыя ў дэвальвацыі чытацкіх густаў, хто як не пішучы люд стварыў многія і многія літаратурныя моды, тым самым пазбавіўшы чытача патрэбы ў сапраўдным мастацтве.

Некалі вялікі яснапалянскі старац зрабіў у сваім дзённіку такі запіс: "Галоўная мэта мастацтва, калі ёсць мастацтва і ёсць у яго мэта, тая, каб праявіць, выказаць праўду пра душу чалавека, выказаць такія тайны, якія нельга выказаць простым словам... Мастацтва ёсць мікраскоп, які наводзіць мастак на тайны сваёй душы і паказвае гэтыя агульныя для ўсіх тайны людзям".

Як проста — асабістыя і агульныя, важныя для ўсіх тайны...І як разам з тым складана, часам проста недасягальна – знайсці шлях авалодвання гэтымі тайнамі, а пасля і шлях раскрыцця тайнаў жыцця перад чытачом. Але ж мы выбралі гэты шлях, па ім абавязаны ісці. Іншага не дадзена.

Што мяне хвалюе больш за ўсё — дык гэта характар паразуменняў пісьменніка з уладай. З усімі яе інстытутамі. Тое, як сёння праводзіцца з'езд, якія высокапаважаныя асобы прысутнічаюць на нашым фактычна свяце, — выразны паказчык таго, што і падрыхтаваліся добра, і паразуменне, і высокую падтрымку знайшлі. За гэта можна толькі ад усяе душы падзякаваць. Але ці так заўсёды і ці так на ўсіх паверхах?.. Наша краіна на ўсёй постсавецкай прасторы адрозніваецца ад іншых дзяржаў — у нас існуе ўпарадкаваная, дзеяздольная, структурызаваная сістэма ўлады, існуе вертыкаль, без адладжанай работы якой , канечне ж, не існавала б нашай сацыяльна багатай дзяржавы. Вельмі хацелася б, каб вертыкаль зрабіла крок наперад і ў асэнсаванні, што сучасная літаратура — таксама важкі сацыяльны клопат. І неабавязкова гэта павінна выражацца выключна ў вырашэнні матэрыяльных праблем. Часам літаратуры ўвогуле і пісьменніку-адзіночцы патрэбна істотная маральная падтрымка. Але самае галоўнае ў гэтай мяркуемай падтрымцы ляжыць і ў такой плоскасці – важна зразумець, што з дапамогай літаратуры і школа, і ўлада ў цэлым маглі б вырашыць многія агульнаграмадскія задачы, агульныя клопаты развіцця і выхавання пакаленняў будаўнікоў нашай суверэннай дзяржавы. Не праводзячы ніякіх паралеляў, нагадаю, што гэта дзякуючы літаратуры з дапамогай да нямоглых старых прыходзілі пакаленні цімураўцаў. Гэта дзякуючы аповесцям Янкі Маўра "Палескія рабінзоны", "Т.В.Т.", Уладзіміра Дубоўкі "Жоўтая акацыя", Івана Сяркова "Мы з Санькам у тыле ворага", легендарнай кнізе дзіцячых успамінаў пра вайну "Ніколі не забудзем", ды многім іншым бліскучым творам выхоўваліся шчырыя, добрыя, адкрытыя маладыя грамадзяне Айчыны. Дык давайце і зараз агульнымі, усеграмадскімі намаганнямі зробім усё магчымае, каб літаратура служыла Чалавеку, спрыяла захаванню і ўмацаванню ў жыцці дабрыні, спагады, чуласці, любві. Пісьменнікі ж, паверце, памятаюць аднойчы класікам сказанае: " ...Мне ў рукі дадзены рупар, я абавязаны валодаць ім, карыстацца ім".

Алесь МАРЦІНОВІЧ, сакратар Саюза пісьменнікаў Беларусі

Мне хочацца закрануць толькі адзін аспект крытыкі, а ў дачыненні да сённяшніх рэалій, ці не самы важны — арыентацыя чытача ў, як прынята было раней казаць, кніжным моры. Не ў апошнюю чаргу — бібліятэкараў, работнікаў устаноў культуры, якім вызначаць, якімі кнігамі неабходна найперш папаўняць фонды бібліятэк і якія, бібліятэкары, часам у разгубленасці, бо выданняў, якія б паслядоўна і мэтанакіравана прапагандавалі лепшае, не шмат. Даўно ўжо ў краіне не выходзіць газета "Кніга і мы" (пазнейшая яе назва — "Книжный мир", якая, трэба прызнаць, няблага спраўлялася са сваімі задачамі.

У сувязі з гэтым найвялікшая адказнасць ускладаецца на штотыднёвік "Літаратура і мастацтва", часопісы "Полымя", "Маладосць", "Нёман". Канечне, імі робіцца нямала, але ў той жа час і малавата. Відаць, і часопісам, неабходна, як гэта робіць "ЛіМ", змяшчаць не толькі рэцэнзіі на новыя кнігі, а і невялікія анатацыі з выявамі вокладак.

Пастаянна ўдзяляе ўвагу праблемам беларускай літаратуры і унікальнае выданне, аналагаў якому няма на ўсёй постсавецкай прасторы — навукова-тэарэтычны і грамадска-публіцыстычны часопіс "Беларуская думка". У ім можна знайсці матэрыялы па пытаннях дзяржаўнага будаўніцтва і праблемах філасофіі, у ягоным полі зроку — эканоміка, права, соцыум, адукацыя і выхаванне, экалогія, медыцына, фізкультура і спорт. Зусім не падчарыцай, а паўнапраўнай гаспадыняй адчувае сябе на старонках "БД" і літаратурная крытыка. З аглядным артыкуламі, рэцэнзіямі выступаюць самыя аўтарытэтныя аўтары, многія з якіх акадэмікі і члены-карэспандэнты Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Сімптаматычна тое, што заснавальнікам "Беларускай думкі" з'яўляецца Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а гэта яшчэ адно сведчанне таму, наколькі наша дзяржава клопатна ставіцца да падтрымкі выдання, якое робіць гонар любой цывілізаванай краіне. "Беларуская думка" збіраецца і надалей грунтоўна і аб'ектыўна асвятляць сучасны літаратурны працэс, рэцэнзаваць найбольш значныя кнігі, што выходзяць у нашых выдавецтвах.

Прыемна, што ў баку ад прапаганды беларускай літаратуры не застаюцца і масавыя выданні, найперш газеты "Советская Белоруссия. Беларусь сегодня" і "Звязда". Рэцэнзіі на творы пісьменнікаў-землякоў ахвотна змяшчае "Мінская праўда". Але хацелася б, каб і іншыя перыядычныя выданні бралі з іх прыклад. Прынамсі, рэдакцыя газеты "Рэспубліка" зрабіла добрую справу, пачаўшы друкаваць "Анталогію кароткага апавядання". А чаму б хоць раз на тыдзень не прадстаўляць чытачам хоць адну кнігу?! А возьмем "Народную газету"? Сама назва падказвае ўжо ёй: трэба з народам гаворку весці не толькі пра культурнае жыццё ў цэлым, а і пра новыя кнігі, выдавецкія справы.

Асаблівае спадзяванне на газету "Культура", якая з кожным годам становіцца ўсё больш цікавай, змястоўнай і, як вынік — тыраж яе перайшоў ужо сямітысячны рубеж і, што не можа не радаваць, яна запатрабавана бібліятэкамі. Таму хацелася б, каб рэдакцыя "Культуры" вярнулася да таго, што гэтак паспяхова рабіла яшчэ некалькі гадоў таму, ці не ў кожным сваім нумары прысвячаючы адну, а то і дзве паласы кніжным навінкам. Калі такія матэрыялы з'явяцца, можна не сумнявацца, што яны дапамогуць у фарміраванні фондаў бібліятэк.

І, вядома ж, цяжка пераацаніць ролю ў прапагандзе кнігі такіх масавых сродкаў інфармацыі, якімі з'яўляюцца тэлебачанне і радыё. Ухвальна, што апошнім часам тут адбываюцца змены ў бок лепшага. Асабліва на тэлебачанні, дзе з'явіліся новыя цікавыя перадачы, для прыкладу — "Слова пісьменніка". А ўвогуле не лішне будзе, калі пра выхад той ці іншай кнігі, будуць з'яўляцца, пры тым рэгулярна, паведамленні ў выпуску навін.

Не магу абмінуць увагай і такі аспект... Канечне ж, не так і істотна, у якім выдавецтве выйшла кніга, галоўнае, каб яна была высокамастацкай. Ды справа ў тым, што якраз дзяржаўныя выдавецтвы нязменна высока трымаюць планку мастацкасці. Найперш — "Мастацкая літаратура", а таксама "Беларусь", што выдае цікавыя кнігі па гісторыі, краязнаўстве. Чаму б таму ж "ЛіМу" не зрабіць правілам — не абмінаць увагай ніводную з гэтых кніг? Што прарэцэнзаваць, пра што даць анатацыю са здымкам вокладкі. Гэта ж не так і цяжка зрабіць, бо па абодвух выдавецтвах не набярэцца і сотні найменняў.

Можа ўзнікнуць пытанне, а хіба не трэба рэцэнзаваць, прапагандаваць кнігі, што выходзяць у недзяржаўных выдавецтвах? Неабходна, але толькі лепшыя. Сёння ж асобныя з такіх выдавецтваў, даючы зялёнае святло малатыражным выданням, аўтары якіх калі на што і здатны, дык на звычайнае эксперыментатарства, вельмі ж утульна адчуваюць сябе ў выдавецкай сферы.

Цяпер, як быццам, і не па тэме, тым не менш... Вы заўважылі, як хораша праходзіць наш з'езд. Але ж яго трэба было падрыхтаваць. Галоўную ж работу па падрыхтоўцы нашага форуму ўзяў на сябе наш шаноўны Мікалай Іванавіч. І за гэта нельга не сказаць яму найвялікшае дзякуй. А ўвогуле нам пашанцавала, што старшынёй нашага творчага Саюза з'яўляецца менавіта Мікалай Іванавіч Чаргінец. Дык давайце працаваць так, каб не сорамна было глядзець яму ў вочы. І гэткія ж высокамастацкія творы пісаць, як у Чаргінца.

Георгій МАРЧУК, сакратар Саюза пісьменнікаў Беларусі

Празаікаў у "Саюзе пісьменнікаў Беларусі" каля сотні. У мяне толькі пяць старонак — характарыстыкі творчасці, агляд навінак, ды інфармацыя аб дэбютах. Таму загадзя прашу дараваць мне, калі чыё-небудзь прозвішча не назаву. Яшчэ дазвольце, каб пазбегчы голага пераліку, у кантэксце беглага аналізу супастаўляць ролю пісьменніка ў духоўным клімаце грамадства і ягоны пошук маральных і філасофскіх апор у гэтым складаным свеце.

Бо што ёсць літаратура? Яна ўпоравень з мастацтвам — адна з форм матэрыялізацыі духоўнасці. Яна не можа змяніць светабудову, але яна можа зменьваць і ўздзейнічаць на свядомасць асобы, якой па сіле змяніць сябе і грамадства да лепшага. Мы жывём у часы, калі згубілася цікавасць ва ўсім свеце да пісьменніцкай творчасці.

Аднапалярны свет, які не прымае аніякай крытыкі, дыктуе непрыманне і самастойных поглядаў на сусветныя працэсы. Адна думка і насаджаецца моладзі: калі ты не багаты — значыць, ты ніхто. Высакародства душы, учынак у імя іншага, патрыятызм — падвяргаюцца нападкам і цынізму. Такія выдаткі глабалізацыі.

У апошніх творах прадстаўнікоў старэйшага пакалення І. Шамякіна, А. Савіцкага, Ул. Федасеенкі, Ф. Конева, Н. Маеўскай, І. Капыловіча і калег сярэдняга пакалення Ул. Саламахі, В. Гардзея, Ул. Глушакова слаўная традыцыя народнага духу. Яны сваімі творамі яшчэ раз даказваюць: няма нічога вышэй за рэалізм, бо менавіта за ім праўда і жыццё. Слушна заўважыў нядаўна крытык С. Андраюк: "Адсутнасць зместу вядзе да пошукі формы".

Зацікаўленая размова

Тэмы, да якіх звярталіся нашы празаікі, за апошні год самыя розныя: школа, вёска, горад, космас, тэатр, гісторыя. Аналізуючы аповесці, раманы, апавяданні, адзначу, што ў іх усё ж больш жыццёвай праўды, як фантазіі, творчай прыдумкі.

Вельмі добра, што працягваючы традыцыі беларускага эпічнага рамана нашы празаікі Леанід Левановіч і Уладзімір Гніламёдаў стварылі ў сваіх творах не толькі каларытную атмасферу мінулых гадоў да вайны і пасля вайны, але намалявалі цікавыя характары, бо менавіта праз створаныя характары пісьменнік найчасцей застаецца ў гісторыі літаратуры.

Лічу, што ў нас недаацэнена творчасць А. Савіцкага, Л. Левановіча, Ул. Ліпскага, В. Гардзея, С. Трахімёнка, Ул. Глушакова. Даходзіць да парадоксаў. Напярэдадні з'езда аглядальнік газеты "Советская Белоруссия" сама паэтэса і пачынаючы празаік Л. Рублеўская, відаць, каб выхваліцца сваёй эрудыцыяй, напісала... пра сабачак Чэхава і пакуты актрысы Ф. Ранеўскай — і смех і грэх. Хоць бы слова пра творчасць пісьменнікаў, якія будуць удзельнічаць у з'ездзе.

Як да крыўднага мала звяртаем мы ўвагу на творчасць І. Пташнікава, Я. Сіпакова, П. Місько ды іншых.

У выдатных публікацыях нашых пісьменнікаў Шырко і Сауліча, Вялічкі і Марціновіча, Шэлехава і Гаўрыловіча ўзнімаюцца вострыя пытанні вёскі, побыту...

Журналісты сярэдняй рукі — С. Алексіевіч і тыя, хто падзяляе яе думкі, — дакараюць, што нібыта ў нашым саюзе пісьменнікаў няма "известных писателей". Думаю: пра якую "известность" ідзе гаворка? На старонках "Народнай волі", "Комсомольской правды", "Деловой газеты", на радыё "Свабода" адны і тыя ж імёны. Што ім, да прыкладу, магутны талент паэтаў Зм. Марозава, В. Шніпа, М. Башлакова, чые імёны могуць упрыгожыць любую літаратуру свету?!

Дык пра якую вядомасць ідзе гаворка? Нянавісць да лідэра, палітычная траекторыя, папулізм — гэта адна вядомасць, а літаратурныя здабыткі, творы — гэта зусім іншая вядомасць.

Адно тое, што пісьменнік піша аб сваім народзе, што яго кнігі ёсць у бібліятэках, а некаторых вывучаюць у школах, што ён госць на радыё, а сёння і на тэлебачанні — вось доказ значнасці пісьменніка і яго вядомасці.

Для нас істотнымі з'яўляюцца тыя факты, што без пошукаў скандальнай вядомасці жыве і працуе ў Любані выдатны дзіцячы пісьменнік Іван Муравейка, што ў Глыбокім жыве і працуе цудоўны паэт А. Жыгуноў, што ў Паставах ганарацца І. Пракаповічам, што ў Пінску працуе суполка, школа, філія таленавітых вядомых на Палессі і на ўсёй Беларусі пісьменнікаў — М. Елянеўскі, М. Ляшук, В. Грышкавец, Ю. Саланевіч, В. Шушко.

Хіба не радуе такая вядомасць: у Пінску адкрыўся прафесійны тэатр, і сярод першай прэм'еры — спектакль па п'есе самабытнага драматурга В. Ткачова. Гэта цудоўна. Гэта гістарычны факт. Нам больш даспадобы такая вядомасць. Каб любіць сваё, трэба яго ведаць. Парадавалі ўсіх нас сваімі навеламі А. Ждан, А. Разановіч, І. Пяшко, С. Давідовіч, В. Кадзетава, Ул. Бельскі. Трапныя характары, цікавыя сюжэты, пратэст супраць разбурэння душы. Да таго ж С. Давідовіч цудоўна валодае гумарам. Да ціхай прозы адношу творчасць А. Сакалова. Усё, што ён піша, зроблена хораша. Сціпла, коратка, але глыбока пра радзіму, час, асобу.

Здзівіў нас В. Маслюкоў, які ў сваім рамане дасканала абмалёўваў свет тэатральнай багемы. Прыватнае выдавецтва "Макбел" выдала чатырохтомнік невялічкіх раманаў А. Андрэева. Раманы не пакідаюць нас абыякавымі: свой стыль, графіка, пункцір, выразная дэталь.

Верны сваёй тэме А. Сульянаў. Аб войску ў нас мала пішуць. Трэба ведаць псіхалогію салдата знутры. А. Сульянаў у сваёй аповесці "Сашок" паказвае, што ваенна-патрыятычнае выхаванне — не апошняе ў нашым жыцці, і не часовая кампанія. Цяжка, так бы мовіць, аблагародзіць высокім стылем суровы быт салдата. А. Сульянаў умее гэта рабіць.

Некаторыя пісьменнікі сярэдняга пакалення і маладзейшыя наўмысна адыходзяць ад рэальнасці, насычаючы яе фантазіямі, снамі. Не нова. Але ўсё залежыць ад таго, на якім узроўні зроблена.

У А. Казлова і А. Паповай тэма ўзаемаадносін мужчыны і жанчыны паглыбляецца падсвядомасцю, фантасмагорыяй. Празаік А. Казлоў шукае свае тэмы, не хоча належаць да любой школы. Аб творчасці пісьменніка і яго "містычным рэалізме" чытайце рэцэнзію ўдумлівага крытыка Л. Галубовіча ў № 12 "Полымя".

Рэгістрацыя ўдзельнікаў з'езда

Колісь была мода параўноўваць пісьменнікаў з мастакамі: Дастаеўскі — Пяроў, Чэхаў — Левітан. А. Казлоў недзе побач з Ван Гогам, Гагенам. Што збліжае творы А. Казлова і А. Андрэева? Цікавасць, так бы мовіць, да Эраса чалавека. Яны праз Эрас і вырашаюць шматлікія праблемы. У рэшце рэшт Эрас і Смерць — ці не галоўныя тэмы ў сусветнай літаратуры? Аднак яшчэ Сафокл нам пакінуў гэта "Кто возлюбил Отчизну, будет нам почетен и мертвый, и живой".

Нам патрэбна маральная салідарнасць грамадства. Можна парознаму ставіцца да светаўспрымання і разумення светапабудовы паэтам і празаікам Э. Скобелевым. Не ва ўсім з ім пагаджацца, але ж нельга не адзначыць яго ўсхваляваную вастрыню ідэй, эмацыянальнасць, мудрасць і абарону ідэалогіі гуманізму ў яго творах. Гэта бачна і ў новым рамане "Исцеление в Хириополе". Даўно наспеў час крытыкам шырока даследаваць яго творчасць.

Некалькі слоў пра драматургію. Без тэатра драматурга няма. Восьмы год ідзе на сцэне тэатра імя Янкі Купалы "Смак яблыка" А. Дзялендзіка. Чым не поспех? Не прыходзілі б гледачы — знялі б з рэпертуару. Ёсць цікавасць у тэатраў і да камерных п'ес А. Паповай. Калі глядзець шырэй, то сітуацыя складаная. Са слоў міністра культуры, у рэпертуары тэатраў спектаклі па п'есах беларускіх драматургаў складаюць толькі 25 працэнтаў ад усіх назваў. Па-ранейшаму нашы драматургі з цяжкасцю прабіваюцца на сцэны. Дзіўна, адзін вопытны драматург літаральна прыватызаваў тэатр беларускай арміі, якім і кіруе, дзе ставяць толькі яго п'есы. Так што маладыя А. Карэлін, Н. Пусцільнік, Я. Конеў і старэйшыя В. Ткачоў, А. Ждан, Ф. Палачанін, вам будзе цяжка. Амаль сорак гадоў узначальваюць некаторыя галоўныя рэжысёры свае тэатры. Калі ж аўтар звяртаецца па дапамогу да дырэктара тэатра, той адхрышчваецца: усё, маўляў, вырашае галоўны.

Чаму драматургі і гледачы (!) павінны залежаць ад густу і свядомасці, ад палітычных поглядаў аднаго чалавека? Трэба ўзмацніць рэпертуарны аддзел Міністэрства культуры. Трэба больш дэбютаў.

Асобна хачу адзначыць дэбют у жанры навелы Н. Касцючэнкі і гістарычную аповесць Н. Голубевай "Радзімічы". Калі коратка — гэта на вельмі добрым мастакоўскім узроўні. Чэх Кундэра кажа: "Няма еўрапейскай літаратуры. Ёсць літаратура Сербіі, Чэхіі, Нямеччыны, Расіі, Беларусі".

Год выдаўся цікавы. Наша проза няблага ўпісваецца ў сусветны літаратурны працэс. Таму давайце разам узнімаць аўтарытэт пісьменніка, узнімаць свой голас у абарону роднай мовы, бо калі не будзе таго, хто чытае па-беларуску — не будзе і нас...

І апошняе. Трэба павялічыць датацыі на выданне нашых кніг да 70—80 працэнтаў, патрэбна перакладаць творы на іншыя мовы, аднавіць работу бюро прапаганды, экранізаваць лепшыя творы, аднавіць з новай рэдкалегіяй серыю "Школьная бібліятэка".

Шчасце не ў тым, чаго ў нас няма, а ў тым, што мы ёсць, ёсць дзяржава, ёсць кніга.

Міхась ПАЗНЯКОЎ, старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі

Дарагія калегі! Шаноўныя госці!

Год, які праляцеў пасля ўстаноўчага сходу быў для Мінскага гарадскога аддзялення СПБ надзвычай клопатны, насычаны справамі найперш арганізацыйнага плана. За гэты час сталічная пісьменніцкая арганізацыя вырасла ў чатыры разы і налічвае 163 літаратары: З іх 100 пісьменнікаў прыйшлі з СБП, СПР і СРП. 63 творцы прыняты пасля разгляду іх творчых набыткаў на савеце аддзялення і прыёмнай камісіі СПБ. 14 пісьменнікаў — лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі Беларусі. 38 пісьменнікаў адзначаны іншымі ганаровымі літаратурнымі прэміямі і ўзнагародамі. Для тых, хто разглядае моўную карту, зазначу, што 94 пісьменнікі МГА СПБ пішуць па-беларуску або перакладаюць з беларускай мовы.

МГА СПБ — юрыдычная асоба, мае сваю пячатку, офіс, рахунак у банку і фінансаванне з гарадскога бюджэту на падставе Указа Прэзідэнта краіны, які з'явіўся найзначным актам падтрымкі літаратурнай справы ў нашай краіне.

Разам з гарадскім выканаўчым камітэтам (упраўленне ідэалагічнай работы) распрацаваны план работы на 2006—2007 гг., які ўзгоднены з намеснікам старшыні Мінгарвыканкама Міхаілам Сяргеевічам Ціцянковым.

Распачата мнагапланавая масавая работа. За год на рахунку пісьменнікаў аддзялення тысячы выступленняў перад самымі рознымі аўдыторыямі, ад дзіцячых садкоў да прадпрыемстваў. Сотні выступленняў у друку, на радыё і па тэлебачанні, удзел у міжнародных і рэспубліканскіх мерапрыемствах, святах, фестывалях і г д.

Але, безумоўна, гэта толькі пачатак. Наперадзе справы і мерапрыемствы больш значныя, як гарадскога маштабу, так і рэспубліканскага. А гэта — святы і фестывалі паэзіі і гумару, юбілейныя і творчыя вечары, прэм'еры і прэзентацыі кніг, выстаўкі, конкурсы, віктарыны, семінары, "круглыя сталы", работа з юнымі літаратарамі горада. Выданне альманаха для маладых талентаў г. Мінска.

Адным словам, плануецца істотна ажывіць літаратурнае жыццё сталіцы, працаваць разам з уладнымі структурамі, грамадскімі арганізацыямі, установамі міністэрстваў культуры, адукацыі, інфармацыі, абароны, камітэта пагранвойск дзеля ўзвышэння ролі пісьменніка, мастацкага слова ў жыцці горада, у жыцці грамадства.

Не маючы магчымасці і намеру гаварыць аб рабоце МГА СПБ больш дэталёва, яшчэ раз зазначу, што мы маем усебаковую падтрымку Мінгарвыканкама.

Цяпер хачу выказацца крыху па некаторых агульных пытаннях пісьменніцкай справы і жыцця СПБ.

На вялікі жаль, у апошнія гады ў нас малавата з'яўляецца яркіх, магутных, смелых, вартых нашага часу мастацкіх твораў. Чытачы, грамадства чакаюць ад нас высокамастацкага асэнсавання сягоннішніх рэалій, чакаюць таленавітых твораў, у цэнтры якіх былі б сапраўдныя героі нашага часу, ясныя, духоўныя арыенціры ў вірлівым, складаным моры жыццёвых перамен. Спадзяюся, што і наступны з'езд СПБ з гонарам назаве нямала новых кніг паэзіі, прозы, драматургіі, публіцыстыкі, твораў для дзяцей, якія стануць з'явай у новай беларускай літаратуры.

Варта распрацаваць дзяржаўную праграму па выпуску беларускай дзіцячай літаратуры самага шырокага спектра: мастацкай, навукова-пазнавальнай, энцыклапедычнай, медыцынскай, спартыўнай, даведачнай і г.д. А магчыма, і вярнуцца да стварэння дзяржаўнага выдавецтва па выпуску такой, сацыяльна-значнай, літаратуры.

Лічу, што неабходна ўзняць планку патрабавальнасці да творчасці тых, каго прымаем у свае шэрагі. Магчыма, варта ўвесці кандыдацкі стаж для будучых членаў СПБ.

Вельмі шкада, што да гэтага часу не працуюць у нас творчыя секцыі.

У будучым на пасяджэннях праўленняў і прэзідыумаў неабходна часцей абмяркоўваць і вырашаць найбольш важныя і істотныя пытанні літаратурнага працэсу, творчага жыцця, дзейнасці СПБ.

Варта і як мага хутчэй ліквідаваць недарэчнасць, у якой апынуліся старшыні абласных і Мінскага гарадскога аддзялення СПБ: маю на ўвазе адсутнасць аплаты іх працы.

Ёсць пэўная віна наша і ў тым, што некаторыя вядомыя, адметныя творцы не перайшлі да нас. Хаця і шкада, што яны да гэтага часу не зарыентаваліся, не адмежаваліся ад апазіцыйнага, запалітызаванага кіраўніцтва Саюза беларускіх пісьменнікаў. Беларуская літаратура заўсёды служыла свайму народу. І сягоння гонарам для кожнага сапраўднага творцы лічу — быць разам са сваім мудрым, працавітым, шчырым народам і з яго ўладай.

І усё ж, як бы сёй-той ні радаваўся нашым недахопам — Саюз пісьменнікаў Беларусі адбыўся. Але яго б не магло быць, калі б за нялёгкую гэтую грамадскую справу не ўзяўся б Мікалай Іванавіч Чаргінец. І гэтым усё сказана... Саюз ёсць! І ў яго, упэўнены, добрая будучыня.

Дык давайце ж быць аднадушнымі і моцнымі ў галоўным нашым прызначэнні: тварыць, тварыць добрае, светлае. Давайце цвёрдым крокам, з чыстым сэрцам і высокімі памкненнямі, з сыноўняй адказнасцю ісці да свайго народа, несці яму Прыгожае, Праўдзівае, Палымянае, Жывое пісьменніцкае Слова. Узвышаць наш аўтарытэт у грамадстве, узвышаць родную краіну. Давайце працаваць і працаваць! Шчыра, плённа, натхнёна, актыўна! Разам з народам, разам з уладай, з народным Прэзідэнтам, мацуючы нашу сапраўды незалежную і цудоўную дзяржаву, святое імя якой — Беларусь!

РЭЗАЛЮЦЫЯ З'ЕЗДА ГРАМАДСКАГА АБ'ЯДНАННЯ «САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ»

Перыяд, які прайшоў з часу ўтварэння новай пісьменніцкай арганізацыі, быў адзначаны не толькі працай па вырашэнні арганізацыйных пытанняў яе станаўлення. Галоўным накірункам стала творчая дзейнасць яе членаў па стварэнні высокадухоўнай, сацыяльна арыентаванай літаратуры. А стварэнне рэгіянальных аб'яднанняў, іх грунтоўная праца дазволіла раскрыць вялікі творчы патэнцыял інтэлігенцыі з усіх рэгіёнаў рэспублікі. Стварэнне і праца маладзёжных секцый, дзіцячай літаратуры таксама дазволіла актывізаваць працу з гэтай вельмі важнай катэгорыяй насельніцтва. Гэта быў час пошукаў і канкрэтных спраў.

Грунтоўная праца Саюза стала магчымай дзякуючы канструктыўным адносінам, якія склаліся з дзяржаўнымі органамі, а таксама максімальнай падтрымцы яго дзейнасці дзяржавай і асабіста Прэзідэнтам краіны Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам.

Саюзам праводзілася значная праца па прапагандзе беларускай літаратуры, яе лепшых узораў. На гэта былі накіраваны шматлікія сустрэчы ў працоўных калектывах, навучальных установах рэспублікі.

Саюз пісьменнікаў Беларусі і надалей лічыць галоўнай мэтай працу па стварэнні яскаснай, высокадухоўнай, адпавядаючай духу часу сацыяльна арыентаванай літаратуры, прапаганду і распаўсюджванне лепшых узораў беларускай літаратуры, багатай літаратурнай спадчыны знакамітых беларускіх пісьменнікаў, умацоўванне традыцый, закладзеных песнярамі беларускай літаратуры Янкам Купалам і Якубам Коласам, пашырэнне міжнародных адносін і кантактаў з пісьменніцкімі арганізацыямі іншых краін, у першую чаргу з братняй Расіяй, з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі беларусаў, якія жывуць за мяжой.

Саюз і ў далейшым будзе ладзіць канструктыўныя адносіны з дзяржаўнымі структурамі краіны, падтрымліваць дзейнасць кіраўніцтва дзяржавы на чале з яе Прэзідэнтам, прымаць актыўны ўдзел у рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне духоўнага і патрыятычнага выхавання насельніцтва краіны, служыць інтарэсам народа і грамадства!

ГАВОРАЦЬ ГОСЦІ

Каб паўдзельнічаць у рабоце пісьменніцкага з'езда, у Мінск завіталі каля 30 іншаземцаў — прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі з адзінаццаці краін свету. Карэспандэнты "ЛіМа" пагутарылі з кіраўнікамі некаторых дэлегацый аб пісьменніках і згуртаваннях творчай інтэлігенцыі ў краінах, якія яны прадстаўляюць.

Самая прадстаўнічая дэлегацыя прыехала на з'езд з 20-мільённай Сірыі. Трох прафесараў Дамасцкага універсітэта ўзначаліў сам прэзідэнт Саюза пісьменнікаў Сірыі, ***прафесар Хусэйн Джумаа.***

Прадставілі арабскі свет

Сп. Джумаа распавёў карэспандэнту "ЛіМа", што Саюз пісьменнікаў Сірыі ўпаўнаважыў яго прадстаўляць у Беларусі літаратараў усіх арабскіх краін. І гэта нездарма: арганізацыя, якую ён узначальвае, — найбуйнейшы з арабскіх пісьменніцкіх саюзаў.

— У нашыя рады ўваходзіць 761 сірыец, а таксама яшчэ каля 700 чалавек з іншых арабскіх краін — з Саудаўскай Аравіі, Палесціны, Іарданіі, Марока і г.д., — кажа Хусэйн Джумаа. — Наша арганізацыя мае філіялы ва ўсіх чатырнаццаці абласцях Сірыі, а таксама ў іншаземных краінах.

Паводле ягоных слоў, арабская спецыфіка дзейнасці такой арганізацыі заключаецца ў тым, што саюзы пісьменнікаў згуртоўваюць не толькі непасрэдна літаратараў, а яшчэ і філосафаў. Таму ў сірыйскім Саюзе пісьменнікаў шмат найвядомейшых прафесараў філасофіі, а таксама рэлігійных дзеячаў — прычым, як асабліва падкрэсліў сп. Джумаа, не толькі ісламу, але ўсіх канфесій.

Саюз пісьменнікаў Сірыі — грамадская арганізацыя, якая юрыдычна не мае дачынення да дзяржавы. Яна, па словах арабскіх гасцей, аб'ядноўвае "ўсіх людзей, якія гатовыя зрабіць свой унёсак у справу свабоды Радзімы".

— Мы імкнёмся дасягнуць балансу ў адносінах з дзяржавай. Нашыя крыніцы фінансавання — пераважна сірыйскія і арабскія бізнесоўцы, дзякуючы якім, у прыватнасці, быў пабудаваны сяміпавярховы будынак Саюза ў Дамаску. Але ў любым выпадку, нашыя стасункі з афіцыйнымі ўладамі не базіруюцца на барацьбе — тым больш, што мы таксама прытрымліваемся патрыятычных поглядаў, і гатовыя падтрымаць дзяржаву ў любы момант, калі неабходна будзе супрацьстаяць варожым сілам. Між тым, калі мы бачым, што на дзяржаўных мерапрыемствах прасоўваюцца ідэі, якія супярэчаць нашым перакананням, то не ўдзельнічаем у такіх праектах.

Барыс Марыян *на з'ездзе прадстаўляў Малдову. Ён — член Саюза пісьменнікаў гэтай краіны і галоўны рэдактар часопіса "Малдова".*

Паміж двума пісьменніцкімі саюзамі

Сп. Марыян расказвае, што ў ягонай краіне аўтаномна дзейнічаюць два пісьменніцкія саюзы — асноўны, які ён прадстаўляе, і Саюз "Днестр". У "Днестр" увайшлі рускамоўныя пісьменнікі, якія лічаць, што Саюз пісьменнікаў Малдовы стаў нацыяналістычным і прарумынскім па характары.

— Я ж — з "асноўнага" Саюза, — кажа мой суразмоўца. — У "Днестр" не пайшоў, нягледзячы на тое, што пісьменнік рускамоўны, і што крытыкую свой Саюз. Бо "Днестр" — не лепшы: таксама запалітызаваны.

— Якім ёсць супрацоўніцтва з Беларуссю?

— Цяпліца яшчэ стары вугельчык беларуска-малдоўскага сяброўства, якое раней было магутным полымем. У Беларусі выдадзены двухтомнік малдаўскай паэзіі, і ў Кішынёве ў бліжэйшай будучыні будзе выдадзены двухтомнік беларускіх паэтаў. Акрамя таго, я хачу тут адзначыць працу Пасла Беларусі ў Малдове Васіля Саковіча. Дзякуючы яго намаганням, у вядучай газеце краіны — "Незалежная Малдова" — адзін раз на месяц дадаткам выходзіць лісток "Беларусь" — дзве паласы аб Беларусі, беларуска-малдоўскіх сувязях.

Дэлегацыю з Украіны прадстаўлялі два чалавекі: Аляксандр Сізоненка, член Саюза пісьменнікаў Украіны, лаўрэат прэміі імя Т. Шаўчэнкі, і наша зямлячка ***Лілія ЧАРНЕНКА. (БАНДАРЭВІЧ)****. Яна — член Саюза пісьменнікаў Украіны, лаўрэат нацыянальных і міжнародных літаратурных прэмій. Нарадзілася і вырасла ў Ашмянах.*

Сустрэнемся на старонках кніг

— Украіна сустрэла мяне як маці, а не мачаха, — распавядае Лілія Васільеўна. — Сын нарадзіўся ў Беларусі, а ўнучка — у паўднёвай краіне-суседцы. І калі Беларусь — мая Айчына (а я беларуска па духу), то Украіна — мой дом. Шэсць кніг, якія я выдала на Украіне, там чытаюцца. Гомель, Бранск і Чарнігаў —тэрытарыяльна блізкія, і мы, пісьменнікі розных краін, заўсёды побач, цікавімся літаратурай і тымі здабыткамі, што ёсць у суседзяў. Вельмі зайздросцім парадку і стабільнасці, якія бачым у вас. Таму я з вялікім задавальненнем сюды ехала: у Беларусі шмат маіх сяброўак па творчасці. Прывезла сюды ў падарунак кнігі на беларускай мове, выдадзеныя ва Украіне.

На пытанне "Пра што пішуць зараз украінскія пісьменнікі?" спн. Чарненка зазначыла: іх хвалююць тыя ж праблемы, што і нас.

— Толькі зараз яны ў Беларусі вырашаюцца хутчэй ад таго, што дзяржава дапамагае, — працягнула думку пісьменніца. Па яе словах, ва Украіне цяпер многа мецэнатаў, людзей, якія даюць сродкі на друкаванне кніг. — Мне пашчасціла нават знайсці такога чалавека для выпуску кніг на беларускай мове. Не хапае прадуманай рэкламы, неабходнага піяру — калі кніга выдадзена. А пішуць сучасныя творцы на тэмы вечныя — як ідэнтыфікаваць сябе ў грамадстве, як навучыцца любіць адно аднаго, як паразумецца, а яшчэ прапануюць чытачу роздум пра тое, чым павінен жыць чалавек, пра каханне.

— Пажаданні пад Новы год?

— Дай Божа гэтаму вашаму саюзу, які расце, шчаслівага даўгалецця. Тут сабралася вялікая колькасць таленавітых мудрых людзей, і самае галоўнае — Саюз пісьменнікаў Беларусі мае дзяржаўную падтрымку. Таму — вялікіх тыражоў, творчага натхнення, дабра, шчасця і здароўя ў родным доме і абавязкова — Божай дабрадаці. Я думаю, мы сустрэнемся — на старонках нашых кніг.

Мікалай ПЕЦЯЎ *— пісьменнік, старшыня Саюза балгарскіх пісьменнікаў, старшыня агенцтва "Сафія-прэсс". Выступаючы на з'ездзе, падкрэсліў: балгары любяць беларускую літаратуру. Там выдаюцца нават анталогіі беларускай паэзіі і прозы — за 2005, 2006 гады. А Дамова аб супрацоўніцтве паміж СПБ і Саюзам балгарскіх пісьменнікаў, якую падпісалі адразу пасля з'езда, на думку сп. Пецява, адкрывае новыя магчымасці для кантактаў, якія цягам апошніх 10 год згубіліся.*

Да новых кантактаў...

— Вельмі прыемныя ўражанні ад форуму. Я праслухаў вельмі ўважліва даклад старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалая Чаргінца, і настолькі ён мне па-

даўся цікавым, што я папрашу ўзяць гэты даклад з сабою, каб надрукаваць на Радзіме, расказаць суайчыннікам пра Беларусь. У нас вельмі мала пра вашу краіну ведаюць. А лічбы, прыведзеныя ў дакладзе — пра развіццё эканомікі, сацыяльнай сферы — унушальныя. Роля пісьменніка не толькі ў тым, каб акумуляваць глабальныя ідэі, а і ў тым, каб расказваць грамадзянам пра жыццё ў іншых краінах. Я скажу, можа, горкія словы, але ў Балгарыі вялікія грошы перамаглі вялікія ідэі. І да гэтага пісьменнікі не былі падрыхтаваныя...Вялікія грошы запатрабавалі "закрыцця" нашых вачэй і вуснаў. Нам дзяржава не дала ніводнага долара, ніводнага еўра. Мы мусілі скараціць усю нерухомасць Саюза балгарскіх пісьменнікаў. Аднак, газета нашага саюза і два часопісы выходзяць. Мы аднавілі выдавецтва балгарскіх пісьменнікаў — яно выдае па 25 найменняў кніг за месяц. Але трэба думаць пра іх распаўсюджванне: у краіне не захавалася ніводнай дзяржаўнай кнігарні, усе прыватныя. Там гандляры найперш дбаюць аб прыбытку, таму прадаюць амерыканскія эратычныя выданні і любоўныя раманы. На жаль, менавіта з боку дзяржаўных органаў было зроблена ўсё, каб народ страціў сваю культуру, як быццам самі сабе выбівалі глебу з-пад ног. Але цяпер праяўляецца цвярозасць у падыходах, яна адчувальная.

Саюз наш вядзе гісторыю з 1913 года ад Івана Вазава, за дзесяцігоддзі пісьменнікі з'ядналіся, зараз нас 600 чалавек. Раней паміж пісьменнікамі былі непаразуменні, зайздросцілі адно аднаму — хто атрымае "народнага", "заслужанага", былі бітвы за тыражы і ганарары. Але пісьменнік заўсёды павінен быць у гушчыні падзей, і мы яшчэ раз пераканаліся ў тым, што ні пасады, ні чыны, ні званні — нішто не цікавіць яго так, як народнае жыццё. Зараз ганарараў няма, але засталося галоўнае — адказнасць перад народам, і пісьменнікі пачалі сябраваць. Мы таксама, як і вы, праводзім свае з'езды — раз у чатыры гады, тайным галасаваннем выбіраецца кіраўніцтва, ёсць аддзяленні і ў вялікіх, і ў маленькіх гарадах.

— У якіх структурах працуюць балгарскія пісьменнікі?

— У асноўным у СМІ, 50 чалавек — у нашым выдавецтве і газеце, таксама на радыё і тэлебачанні, ёсць сярод пісьменнікаў беспрацоўныя, начныя вартаўнікі. Прымаем усё як непазбежнасць, бо пераканаліся: за ўсё ў жыцці трэба плаціць, але пройдзе час, і пра "временщиков" ніхто і не ўспомніць.

Таму пажадаю беларускім пісьменнікам, каб трымаліся дзяржавы. У вас ёсць важкая падтрымка, і вы можаце пачуваць сябе годна і шчасліва. І, значыць, ёсць магчымасць думаць пра развіццё культуры і літаратуры.

***Іван ГАЛУБНІЧЫ** — сакратар Праўлення Саюза пісьменнікаў Расіі, галоўны рэдактар газеты "Московский литератор", сакратар Выканкама Міжнароднай Супольнасці Пісьменніцкіх Саюзаў — звярнуў увагу на высокую ступень арганізаванасці ўдзельнікаў форуму.*

Ведаць, дзеля чаго працуеш...

— Тут усё дакладна вызначана. Людзі ведаюць, дзеля чаго яны сюды прыйшлі. Да таго ж, тут сабраліся ўсе мае сябры, я добра ведаю кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў. Вельмі высокая канцэнтрацыя пастаўленых задач і мінімум кароткатэрміновага, сіюмінутнага...

Творчыя стасункі паміж беларускімі і расійскімі пісьменнікамі складваліся даўно, незалежна ад з'езда, — заўважае прадстаўнік Расіі. — А гэты пісьменніцкі форум — толькі адзін з этапаў. Ёсць шмат праектаў, якія працуюць, і газета, якую я ўзначальваю, і часопіс "Российский колокол" друкуе творы пісьменнікаў Беларусі. А нашыя аўтары друкуюцца ў часопісах "Нёман", "Немига". На з'ездзе ж дасягнуты дамоўленасці па дзіцячай творчасці. На ўзроўні асабістых кантактаў як сакратар па беларускай літаратуры я падтрымліваю стасункі з першым сакратаром СПБ А. Аўруціным.

У вашай Нацыянальнай бібліятэцы я быў і раней, яшчэ калі яна не была адкрытая, падчас працы ў Мінску Міжнароднага кніжнага кірмашу. А цяпер мы знайшлі сябе ў электронным каталогу, для пісьменніка ж адзін з самых надзейных крытэрыяў яго запатрабаванасці — цікавасць да яго кнігі.

***Крысціян ШНАЙДЭР** — германскі празаік, публіцыст, які піша пераважна на сербалужыцкай мове. На з'ездзе выступаў па-беларуску.*

Беларусы — культурны, адукаваны народ

— Дзе вы так добра вывучылі беларускую мову?

— Некалькі год таму я пазнаёміўся з Алесем Траяноўскім — ён быў рэдактарам "Звязды" і перакладаў з нашай сербалужыцкай мовы вельмі цікавую кніжку "Там, дзе Шпрэя шуміць". На жаль, яе няма ў вашай Нацыянальнай бібліятэцы. Беларуская кніга, прысвечаная тысячагадоваму адрэзку нашай паэзіі — перакладалі яе па фрагментах. З намі ён гаварыў толькі па-беларуску. З таго часу я на многае забыўся, але хацеў бы аднавіць у памяці. Я і мая жонка —мы яшчэ паедзем па Гомельшчыне, і я не баюся, што не зразумею тутэйшы люд, альбо не змагу адказаць тамтэйшым людзям, якія будуць размаўляць са мною толькі на сваёй мове.

— Вы гаварылі, што хочаце даведацца пра Беларусь, якая яна "наверсе" (гэта значыць, на з'ездзе), і ў глыбінцы. Нейкае ўражанне — хаця б аб першай частцы — склалася?

— З усім, што я тут пачуў і ўбачыў, я згодны, нічога "несімпатычнага" для мяне няма. Я прыехаў з Захаду. І, безумоўна, чытаў пра тое, што адбываецца на Усходзе. І гаварылася пра тое, што падобна таму, што здарылася на Украіне, верагодна і ў Беларусі. Думаю, што гэта не ашчаслівіць ваш люд. Не трэба прыходзіць да цяжкага становішча, у якім можа апынуцца народ.

— Што чытаюць у Германіі?

— Чытаюць, як мне падаецца, мала. Гэта павевы Захаду, якому непатрэбны адукаваны, мудры народ. Крыміналу, шоу на тэлебачанні — гэтага дастаткова. Калі ўзнімаць народ на вельмі высокі ўзровень — каб чыталі У. Шэкспіра, Я. Коласа — то трэба прадастаўляць і адпаведныя магчымасці ў грамадстве. А мая дачка прыехала з Амерыкі і кажа: "там страшна нізкі ўзровень".

— Сучасную беларускую літаратуру ў Германіі ведаюць?

— Аб Беларусі мы амаль нічога не ведаем. Беларусь для нас — самая невядомая тэрыторыя. І я хачу вярнуцца дадому і расказаць пра тое, што тут рэальна пабачыў. Першае, што скажу: мяне з першых жа крокаў вельмі здзівіла і ўзрушыла атмасфера — нават на вакзале: такая чысціня, такая дысцыпліна, такі культурны народ!

Самай шматлікай іншаземнай дэлегацыяй на з'ездзе, натуральна, сталася расійская. Аб тым, чым жыве сёння саюз пісьменнікаў у братняй краіне — у бліц-інтэрв'ю са статс-сакратаром Саюза пісьменнікаў Расіі ***Ларысай БАРАНАВАЙ-ГОНЧАНКА.***

Расійская літаратура робіцца ў правінцыі

— Саюз пісьменнікаў Расіі налічвае каля 7 тысяч членаў, у нас каля 80 пісьменніцкіх арганізацый у абласных цэнтрах і цэнтрах нацыянальных рэспублік, — расказвае спн. Баранава-Гончанка. — Мы лічым сябе традыцыяналістамі. У нас ёсць некалькі галоўных напрамкаў: барацьба за чысціню рускай мовы і за захаванне традыцый рускай класікі ў сучаснай рускай прозе і паэзіі. У Расіі ў гэтым сэнсе сітуацыя даволі вострая, паколькі вельмі актыўна працуе т.зв. постмадэрнізм. Мы не праціўнікі мадэрнізму ў прынцыпе, але новыя постмадэрністы — гэта людзі, якія фактычна зараз працуюць на руйнаванне рускай літаратуры, рускай мовы, укараненне ненарматыўнай лексікі. Яны працуюць выключна з формай, здзекуюцца з рускай класікі — прычым гэты здзек мы назіраем нават на сцэне Вялікага тэатра. Дык вось задача нашага Саюза — ахоўваць тых, хто развівае *рускую традыцыю.*

Мы імкнёмся падтрымліваць пісьменнікаў, якія працуюць у гэтым напрамку, па меры нашых сіл. Хоць не вельмі свабодна сябе адчуваем у сродках масавай інфармацыі, бо наша прэса нас не вельмі падтрымлівае, калі не лічыць некалькіх часопісаў, такіх як "Наш современник". Зараз, праўда, "Литературная газета" яшчэ працуе ў духу разумнай літаратурнай дыпламатыі.

Статс-сакратар Саюза пісьменнікаў Расіі кажа, што адзін з асноўных напрамкаў дзейнасці гэтай арганізацыі — прысуджэнне літаратурных прэмій. Прычым Саюз у гэтым падтрымліваюць кіраўнікі абласных адміністрацый — па словах маёй суразмоўцы, "сапраўдныя дзяржаўныя мужы". У Белгарадзе існуе прэмія "Прохараўское поле", у Санкт-Пецярбургу — прэмія Аляксандра Неўскага. Цікавай ёсць "Вялікая прэмія Расіі", якая была заснаваная і падтрымліваецца карпарацыяй "Алмазы России". Гэта — адна з формаў падтрымкі пісьменнікаў буйным бізнесам.

Вядома, друкуюць пры падтрымцы Саюза і кнігі. Хоць сёння гэта і справа вельмі нятанная — тым больш, што ўзнікаюць праблемы з распаўсюджваннем. Па словах маёй суразмоўцы, сёння сваіх пісьменнікаў ведаюць у расійскіх рэгіёнах, але няма такога, каб выбітныя, новыя імёны ведалі "наскрозь", у цэлым па Расіі. Але ёсць "Наш современник", і ёсць часопіс Саюза пісьменнікаў Расіі, які называецца "Роман-журнал "XXI век" — "своеасаблівы гід па тым, што адбываецца ў расійскай літаратуры".

— Найважнейшая для развіцця сённяшняй рускай літаратуры тэма — гэта жыццё ў рускай правінцыі, дзе адбываецца нараджэнне новых імёнаў. Гэта не Масква — у Маскве толькі завяршаецца гэтае "кола" для пісьменніка, адбываецца яго канчатковае знаёмства з чытачом, а ўвогуле і паэт, і празаік нараджаюцца сёння ў правінцыі, як і было традыцыйна заўсёды для рускай літаратуры, бо і Пушкін, і Талстой — гэта правінцыйныя пісьменнікі, пісьменнікі, якія выйшлі са сваіх маёнткаў.

Мы ўвогуле вельмі цэнім традыцыю рускіх "дзеравеншчыкаў". Яны, дзякуй Богу, многія яшчэ жывыя — гэта і Распуцін, і Бялоў.

Нарэшце, мы падтрымліваем пісьменнікаў, якія мысляць дзяржаўна. Для нас, канечне, вельмі важнае эстэтычнае крэда пісьменніка, але яго этычны пачатак яшчэ больш важны. І мы тут аддаём перавагу тым, хто стаіць на варце дзяржаўных інтарэсаў, бо гэта адэкватна часу.

— Ці можаце вы, акрамя Масквы, назваць нейкія буйныя цэнтры, у якіх канцэнтруюцца правінцыйныя пісьменнікі?

— У нас ёсць некалькі арганізацый, якія можна назваць "абразцовымі", якія прадстаўляюць сабой сапраўдныя культурныя цэнтры. Адна з іх — у Арле. Гэта цэнтр Расіі, адкуль, уласна кажучы, і пачыналася руская літаратура. Цудоўныя пісьменнікі, якія вельмі актыўна дзейнічаюць — у Арэнбургу. Дарэчы, там ёсць найцікавейшая прэмія, якая называецца "Капітанская дачка". Там выдаецца не толькі многа мастацкай, але і гістарычнай літаратуры, літаратуры, звязанай з мовай, са слоўнікамі. У Белгародскай вобласці вельмі яскравая арганізацыя, у Омску. Увогуле, Сібір сябе паводзіць вельмі актыўна і самастойна. Яна заўсёды была такой. У ёй ёсць нават нейкі дух асобнасці, але гэта не перашкаджае нам заўважаць яе, а ёй — з намі супрацоўнічаць.

— Ці адчуваеце вы ўвагу, падтрымку з боку дзяржавы?

— Вельмі мала. Ці, можна сказаць, амаль не. Мы зараз стварылі Каардынацыйны савет творчых саюзаў, куды ўвайшлі Саюз пісьменнікаў Расіі, Саюз мастакоў, Саюз кампазітараў, Саюз архітэктараў і Саюз журналістаў. Мэта гэтага савета — дамагчыся прыняцця Закона аб творчых саюзах. Але за гэта мы б'емся ўжо шмат гадоў. Пакуль закон не прасоўваецца, нас не падтрымлівае Дзяржаўная Дума — і гэта, лічу, злачынства з яе боку. Нас не падтрымлівае Міністэрства культуры — нягледзячы на тое, што прэзідэнт некалькі разоў звяртаў увагу на становішча творчых работнікаў у Расіі. Мы спадзяёмся, што менавіта рашэнне прэзідэнта нешта зменіць. У гэтым сэнсе ваш з'езд — пацвярджэнне таго, што вашая ўлада разумее: культура ёсць самая тонкая і дасканалая палітыка. Мы можам гэтаму толькі зайздросціць.

— Як бы вы азначылі перспектывы супрацоўніцтва расійскага і беларускага пісьменніцкіх саюзаў?

— Я думаю, што перспектывы для супрацоўніцтва ў нас знаходзяцца ў вобласці выдавецкай і адукацыйнай палітыкі. Мне падаецца, што сёння пытанне аб літаратурным выхаванні моладзі стаіць вельмі востра, і таму ў Літаратурнага інстытута ёсць задумы весці перамовы аб стварэнні беларускай групы маладых літаратараў у Літаратурным інстытуце імя Горкага.

***Раман МУЛІЧ** — член Прэзідыума Саюза пісьменнікаў Сербіі. Прапанаваў СПБ вылучыць для пачатку каля 10-ці маладых таленавітых беларускіх аўтараў, каб друкаваць іх на сербскай і беларускай мовах у сербскіх часопісах.*

З павагаю да Беларусі

Сп. Муліч зазначыў, што беларуская літаратура вядома ў Сербіі і на ўсёй тэрыторыі былой Югаславіі...

— ...Але недастаткова, нягледзячы на значную працу перакладчыкаў, у першую чаргу энтузіяста І. Чароты. У нас мала перакладаў непасрэдна з беларускай мовы, большасць — з рускай, гэта значыць, мы перакладаем беларускіх аўтараў пераважна з рускай мовы.

Далей сп. Муліч распавёў пра тое, што калега Чарота падрыхтаваў вялікую анталогію сербскай паэзіі і зрабіў заўважны ўнёсак у азнаямленне беларусаў з сербскай паэзіяй.

— На жаль, у нас дагэтуль не існуе такога рангу анталогіі беларускай паэзіі. Хаця мы ведаем пра высокія мастацкія дасягненні беларускіх пісьменнікаў, якія ўзбагацілі не толькі беларускую, але і савецкую, і сусветную літаратуры. Творы Коласа, Купалы, Броўкі, Танка вядомы ў Сербіі, але хацелася б пазнаёміцца і з іншымі беларускімі аўтарамі.

У Белградзе, між іншым, збіраюцца адкрыць бясплатныя курсы беларускай мовы.

Галоўны рэдактар часопіса "Наш современник", лаўрэат Прэміі Саюзнай дзяржавы ***Станіслаў КУНЯЕЎ*** *пацвердзіў, што супрацоўніцтва з Беларуссю ў Саюза пісьменнікаў Расіі сталае. Да з'яўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі яно, збольшага, развівалася з РВУ "Літаратура і Мастацтва".*

Часопісы — трыбуна для літаратара

— Яшчэ напрыканцы 1990-х мы прапанавалі старонкі нашага часопіса выбітным беларускім пісьменнікам — Шамякіну, Скобелеву, Скарынкіну. Мы маем моцны дзелавы і сяброўскі саюз з часопісам "Нёман". За 2003—2006 гады выйшлі з друку 4 нумары "Нашего современника" з творамі беларускіх пісьменнікаў, а "Нёман" змяшчаў на сваіх старонках творы расіян. Хачу звярнуць асаблівую ўвагу на тое, што ў дванаццатым нумары нашага часопіса за 2004-ы год мы апублікавалі вялікі твор беларускай літаратуры — паэму "Песня пра зубра" Міколы Гусоўскага — у перакладзе вашага пакорнага слугі.

Увогуле, шчасце любога пісьменніка — не проста выказаць свае думкі, напісаць твор, але і быць прачытаным. Наклады кніг у 500, максімум 2 тысячы асобнікаў, якія мы сёння маем у Расіі — гэта трагедыя для пісьменніка, а асабліва калі кнігі гэтыя ляжаць мёртвым грузам. У гэтых умовах публікацыя ў тыражным выданні набывае для літаратара асаблівую важнасць, значнасць. Мы лічым, што кожны асобнік нашага часопіса чытае 3-4 чалавекі. Таму кожны твор, апублікаваны ў нас, даходзіць да 50—60 тысяч чытачоў.

***Крысціна КУКУЦКА** — карэспандэнт грамадска-літаратурнага часопіса «Swiat Infland", член Куняўска-Паморскага саюза літаратараў, ад імя якога і перадала прывітанне дэлегатам з'езда.*

Літаратура пераадольвае межы

— Мяне зацікавіла ваша цудоўная краіна, яе людзі, культура, дасягненні — гаворыць журналістка. Упершыню на Беларусі Хрысціна пабывала ўвосень мінулага года. Затым прыязджала сюды яшчэ шмат разоў і пра гэтыя сустрэчы, як сама гаворыць, "з любімай краінай", напісала падрабязна ў навукова-літаратурным часопісе «Swiat Infland", а затым у кнізе, адрасаванай польскаму чытачу.

— Я б хацела звярнуцца да Саюза пісьменнікаў Беларусі з просьбаю — дапамагчы ў выданні гэтай кнігі. Яна дапаможа расказаць палякам праўду пра вашу краіну, яе людзей, гісторыю. Жадаю ўсім членам СПБ поспехаў. Вы робіце вялікую справу, бо толькі літаратура можа пераадольваць межы і кардоны, умацоўваць сяброўства паміж краінамі.

Гасцей распытвалі Ірына ТУЛУПАВА і Мікалай АНІШЧАНКА

Фота Канстанціна Дробава

Пройдзены шлях у шэсць дзесяткаў гадоў — хочаш-не хочаш — прымушае азірнуцца: а што там у цябе за плячыма? А за імі — Мікалаеўшчынская СШ імя Якуба Коласа, БДУ, настаўніцтва на Стаўбцоўшчыне, Мінскі абласны цэнтр народнай творчасці, Беларускае радыё і тэлебачанне, выдавецтвы "Народная асвета", "Юнацтва", "Мастацкая літаратура", часопісы "Крыніца", "Родная прырода", тыднёвік "ЛіМ". А яшчэ — кнігі паэзіі, прозы, выданні для дзяцей і юнацтва, публікацыі ў перыёдыцы мастацкіх твораў і публіцыстычна-крытычных артыкулаў. З'яўляюся ўкладальнікам некалькіх зборнікаў.

Я нарадзіўся ў навагоддзе. А гэта значыць, маецца кожны раз шанс жыць і тварыць па-новаму.

Аўтар

Яўген ХВАЛЕЙ

Марына БЕЛЯКОВА

Расціслаў БЕНЗЯРУК

Яўген ХВАЛЕЙ

ХРОНАС-НЁМАН

Прыйду на берагі твае крутыя,
Дубоў дзе караніцца род,
Дзе хвалі срэбна-залатыя
Калышуць памяць, як чарот.

Рака мая,
Праз дні мае віротныя
Бяжыш —
Твой разумею спех.
Ды недзе там,
за выдмай, паваротам,
Прыпыніш, як і я,
на хвілю бег.

Нам ёсць над чым падумаць...
Бо стагоддзі
Плылі табой,
нібы варагі ў грэкі.
Легенды, былі у маім народзе
Жывуць часцей там,
Дзе крынічаць рэкі.

Ты рушыш зноў
за далягляднымі часам,
Аддаўшы плынь гарэзу-быстраку.
І доўга буду я
З маімі днямі разам
Рукой махаць,
Праводзячы раку...

* * *

Хата ля возера...
Матчына хата...
Лодку рыбацкую
хвалі калышуць...
Тут мой пачатак,
Тут маё свята,
І між вяскоўцаў я тут не лішні.

Дзікія качкі на месцы глыбокім
Стрэнуць мяне,
Павітаюць крылом.
Лебедзь да рук падплыве адзінокі,
Сівы-сівенькі,
Як слова "Было..."

МАТЧЫНА ПОСТАЦЬ

На праспекце
І ў вёсцы,
У кожнай хустачцы простай,
У заснежанай елцы
І ў зялёнай бярозе
Бачыў матчыну постаць.
На праезджай дарозе
І ў зажуранай хаце,
На калючым марозе
Цалаваў цябе,
Маці.
Прылятаў ранняй птушкай,
А вяртаўся за вечар...
Твая з мараў падушка
Мае сны ноччу квеціла.
Сціплы матчын твой дар
Кожны раз мяне чуліў.
Я ж з пазык не аддаў
Нават частку
Матулі.
Як жылося-былося —
Толькі нам знаць з табою...
Хто цябе не цаніў —
Страсяне галавою...
Будзе постаць выглядваць —
Але позна ўжо,
Позна...
Толькі ў елцы яна,
Толькі ў белай бярозе,
І ў іконе на покуці —
Там, дзе Боская маці.
Перад матчынай постаццю —
Сам Хрыстос на распяцці.

* * *

Б э з л і л о в ы —
Два толькі словы,
А мора пачуццяў...
Твой голас пачуць бы
Між бэзавых гронак,
Як птушкі пеўчай,
Безабароннай.
Ды птушка зляцела
У край маладосці —
Не вернецца больш
Да мяне яна ў госці...
Агнём у душы
Два толькі словы —
Б э з л і л о в ы...

БУСЕЛ, ЯКІ АДБІЎСЯ АД ЧАРАДЫ

Апошні лета дзень...
А ён на лузе між кароў
Шукае згублены свой цень,
Сляды сяброў-буслоў.

Сябры у вырай адляцелі,
Яму з параненым крылом
Хадзіць, пакуль ёсць дух у целе
І сніць заморскае жытло.

Яго не знойдзеш між людзей,
Хоць, можа, і захочуць тыя...
Бусліных высненых надзей
Не знаюць грэшныя, святыя.

Ён толькі тут, між лазнякоў,
Сябе адчуе вольнай птахай.
З крылом адным
і без сяброў
Памрэ —
і гэта будзе яго плаха.

АКТАВА

Калядныя марозы —
аж пад трыццаць недзе —
Каліна прадказала
летам раннім мне:
Пяклі сцюдзёна, пунсавелі гронкі
ў небе, —
Здавалася, што выпадзе
ў спякоту снег.

А я стаяў на продка даўнім следзе,
Што ў травах пракаветных
зрасянеў.
Ён, продак, мне падараваў
прыкмету,
Каб не сплыла яна
ў сівую Лету.

* * *

І канчаецца год...
Стрэлкі пройдуць свой шлях —
Мы з табою ішлі гэтак побач.
Не забыць толькі б нам
Пахі траў у палях,
Калі снег забялее,
Як поўня...

Марына БЕЛЯКОВА

АПОШНІЯ ЗОРКІ

Калі ў небе
знікаюць апошнія зоркі,
не глядзі на іх,
інакш здагадаешся,
як гэта цяжка —
адчуваць,
што твая сонная душа
прачынаецца
ад прыгожага —
хоць несапраўднага —
шчасця...

СНЫ

Мае сны
ніколі не знікаюць дарма.
Кожны з іх —
што зусім не дзіўна —
набліжае цябе да мяне.
А мяне — да цябе.
Але чамусьці
шкада, што для таго,
каб быць бліжэй,
табе не трэба быць побач...

ВЫВУЧЫ МЯНЕ НАПАМЯЦЬ

Вывучы мяне
напамяць.
Па маіх вачах
і думках.
Па шолаху
ў цішы твайго дыхання.
Па тонкіх гуках
душы,
якія толькі ты пазнаеш
сярод шэпту
восеньскага лісця
каштанаў.
Нашто нам
іншая паэзія?..

ЯК НОЧ

Акно зачынена.
Вечар, ноч.
Расчыні акно:
там ноч:
не такая,
як пры зачыненым акне —
яна сапраўдная:
зусім не халодная,
хоць снег,
зусім не чорная,
хоць неба, як вугаль,
зусім не адзінокая,
хоць яна цішыня.
Сапраўдная...
Я з табой — сапраўдная.
Як ноч.

ЯБЛЫК

Паабяцаць —
няцяжка.
Гэта як
яблык з'есці.
А зрабіць тое,
што абяцаеш,
гэта ўжо —
як вырасціць яблыню.
Ты яе пасадзіў ужо.
Ці здолееш вырасціць?

КАЛІ ПОЙДЗЕШ

Калі пойдзеш,
зачыні шчыльней
дзверы,
каб не выветрылася
твая цеплыня
з маёй кватэры.

Расціслаў БЕНЗЯРУК

НА СТАНЦЫІ КОЛАСАВА

Цягнік — ад Брэста. Снегу ў нас няма,
Хаця зямля акрыцца хоча пухам,
А ў Коласаве — звонкая зіма
І наваколле беліць завіруха.

Як родныя, мясціны пазнаю,
Бо шмат разоў вы Коласам апеты.
Аб чым сняжынкі жвавыя пяюць?
Мо гімн складаюць земляку-паэту?

Хадзіў тут колісь мудры валадар
У дождж і спёку, як снягі гулялі.
Прынёс народу ***Нёманаў*** *ён* ***дар,***
І ***новую зямлю*** *мы атрымалі.*

Спыніцца б на хвіліну, пастаяць
І ад зямлі паэта прычасціцца.
...На ростанях *мы. Колы зноў звіняць:*
Цягнік спяшае ў шумную сталіцу.

БАЛАДА ПРА КАНЯ

Сонца ў небе — быццам яблык спелы.
Малады, незацугляны конь
Вылецеў стралой са стайні, смела
Капытамі выкрасаў агонь.

Без аброці ён імчаў на волю,
Кінуўшы людзей, гружоны воз.
Вось яно, рамонкавае поле,
Дзе прастора і блакіт нябёс.

Забывалася пра цяжкасці і скруху, —
Дагані цяпер і зацугляй!
Конь імчаў, а сам, здаецца, слухаў,
Як пад капытом звініць зямля.

Жарабку травы здалося мала —
Жорсткаю, шчаціністай была...
Як яму аўса тут не хапала,
Не ставала мулкага сядла!..

І як сонца патушыла промні,
Калі вечар прыцемкі прынёс,
Конь вярнуўся ўсё-такі дадому,
Дзе чакалі пуга і авёс.

У ЯЛТУ, ДА БАГДАНОВІЧА

Як далёка прытулак знайшоў,
Ды і тут Беларусь, мусіць, сніцца?
Я прыйшоў, каб табе пакланіцца,
Са спазненнем на споведзь прыйшоў.

Я прынёс прывітанне здалёк —
Ад зямлі, тваім вершам апетай,
Ад палёў, на якіх кожным летам
Зацвітае ў жытах васілёк.

Я стаю і маўчу. Цішыня.
Што ж прароцтва,
Паэт, не збываецца:
"Беларусь, твой народ дачакаецца
Залацістага, яснага дня?"

Ніна РЫБІК

Пра варону і лебедзя

Казка для дарослых

Закахалася Варона ў Лебедзя…

Ну што вы адразу ўсміхаецеся? Нібы ў людзей такога не бывае… Ледзь не ў кожнай казцы ці легендзе прынцэсы-каралеўны ляцяць, кідаючы трон і сплаканага бацьку, за каханымі конюхамі-пастухамі. А калі не пускаюць, то і ў вір галавой кідаюцца. Каханне ж — штука злая: прыходзіць, дазволу не спытаўшы, сацыяльным паходжаннем і анкетнымі дадзенымі абранніка не пацікавіўшыся… Думаеце, толькі людзям гэта ўласціва, жывёлы ці птушкі кахаць не ўмеюць? Яшчэ як умеюць! І нават дрэвы, і кветкі, і пчолкі-матылькі…

Але мы не пра іх усіх, мы — пра Варону і Лебедзя.

Дык вось, закахалася Варона ў Лебедзя. Маладога, які толькі што змяніў сваю шэрую падлеткавую адзежку на бездакорны, пёрка да пёрка, бы ў лепшых дамах мод пашыты, атласны юначы фрак.

І такі ён быў прыгожы, так выдзяляўся — увесь элегантна-грацыёзны, белы, як айсберг — на шэрай завадзі іх азярца, з высакародным выгібам гнуткай шыі, ярка-чырвонай дзюбай і затуманенымі нечым вачыма (высокай марай? няспраўджанай надзеяй? роздумам аб сэнсе быцця? — пра гэта ўвесь час марыла даведацца Варона), што закахацца ў яго было проста немагчыма. І Варона, якая ў душы таксама была белай — зусім непадобнай на сваіх суродзічаў ні думкамі, ні памкненнямі, а ўсяго толькі чарнюткім, як ноч, адзеннем, якое яна люта ненавідзела — закахалася: самааддана і безнадзейна, не чакаючы ўзаемнасці.

Але, як і ў кожнага закаханага, на самым донцы свядомасці ў яе жыла надзея, што аднойчы…

— Дурніца, навошта ты яму здалася? — смяяліся з Вароны суродзічы, назіраючы, як яна гадзінамі ходзіць па беразе азярца, уздыхаючы і любуючыся сваім Белым Прынцам. — На што ты разлічваеш? Паляцелі лепш з намі на старую таполю ля крамы, там сёння людна. Можа, што ўдасца сцягнуць. А не, дык проста пакрычым, людзям нервы папсуем. Ну і ўборы іх святочныя — калі пацэлім…

Але Варона не звяртала на іх увагі — яна жыла сваім каханнем. Часам адлятала да людскога жытла, крала дзе на панадворку кавалак хлеба — і несла ў дзюбе на бераг возера, пакідаючы неўпрыкмет у траве — каб Лебедзь падумаў, што пачастунак там аказаўся выпадкова. Бо ўзяць такі нікчэмны падарунак, ды яшчэ ад яе, чорнай і нягеглай, ён бы, пэўна, пасаромеўся. Ды і ўвогуле, гонар яму б не дазволіў, каб нейкая там бязродная варона падкармлівала яго, такога дужага, такога прыгожага…

А што Лебедзь, спытаеце вы?

У Лебедзя было добрае сэрца. І хоць ён разумеў, што яны — не пара, але, каб не крыўдзіць Варону, дазваляў ёй сябе любіць.

Белы прыгажун даўно прыкмеціў Чарнушачку, як ён называў яе ў думках, што днямі тупала па беразе, ці сядзела на галінцы пахіленай да вады вярбы, ці кружыла ў паветры, калі ён адплываў на сярэдзіну возера папаласкацца-паныраць на глыбіні. У Лебедзя пакуль не было спадарожніцы (мы ж казалі, што ён быў вельмі малады), і Варону, што закахалася ў яго наперакор сваёй сям'і, якая, адчаяўшыся вярнуць аблудную дурніцу, выкрасліла са свайго роду.

Ён знаходзіў у траве кавалкі пакінутага Варонай хлеба і, каб зрабіць ёй прыемна (па праўдзе кажучы, яшчэ і таму, што гэта было вельмі смачна і сытна, але гэта — не самае галоўнае) з'ядаў іх да крошкі. Потым, калі яны нарэшце пазнаёміліся і пасябравалі, Варона знаходзіла ў яго шыпенні такія цудоўныя мелодыі, ды казала, што лепшай песні не здольны праспяваць нават салавей. А з сілай і размахам яго крылаў не змог бы паспаборнічаць нават кароль птушак сокал. Не кажучы ўжо пра прыгажосць і бель атласнага ўбору… Увогуле, яна аказалася вельмі паэтычнай натурай, гэтая непаглядная знешне Варона; круцячыся ля людзей, навучылася не толькі вельмі лоўка сцягваць ад іх хлеб і нават печыва, але і гаварыць прыгожыя словы, якія, нягледзячы на рыпучасць голасу, ліліся, нібы горны ручай і пераконвалі лебедзя, што ён самы прыгожы, самы дужы, самы-самы… А галоўнае, было відаць, што, гаворачы іх, Варона ніколькі не крывіла душой.

Праўда, часам Варона крыху раздражняла і стамляла Лебедзя самаахвярнай закаханасцю, імкненнем заўсёды быць побач і выконваць любое яго, нават мімалётнае ці бязглуздае, жаданне. Але Варона, што б пра яе ні казалі суродзічы, была разумнай птушкай: як толькі заўважала ў вачах Лебедзя раздражненне, хавалася ў высокую траву. І не паказвалася, пакуль ён, паплаваўшы, паныраўшы, пагарэзіўшы з іншымі лебедзямі, не пачынаў сумаваць. Тады Белы Прынц зноў падплываў да берага і пачынаў вінавата ці прызыўна шыпець — і Варона ўзлятала са сваёй хованкі і радасна кідалася да Лебедзя: я яму патрэбна, ён да мяне вярнуўся! Яна баялася быць надакучлівай, але хацела стаць для яго самай неабходнай у жыцці — такой, як ён стаў для яе.

Яны ніколі не гаварылі пра будучыню — пра той час, калі па паверхні іх азярца закружыць рознакаляровым карагодам сарванае ветрам з дрэў лісце, корму стане мала і ад сцюдзёнасці вады і паветра перастане ратаваць нават падбіты лебедзіным пухам белы атласны касцюм. Але гэты час прыйшоў…

— Дарагая, — сказаў неяк ранкам Вароне Лебедзь. — У мяне сумная навіна. Заўтра мы адлятаем у вырай…

— Але чаму?! — у Вароны пацямнела ўваччу ад усведамлення, што заўтра яна развітаецца з Лебедзем — і магчыма, ніколі яно больш не ўбачыць. — Няўжо так абавязкова ляцець у той вырай? Хіба табе дрэнна тут, на гэтым возеры? Здараецца, што і ў нашых краях лебедзі зімуюць, і вельмі часта — я сама бачыла ў першую сваю зіму, як на ставе жыла пара. А вясной яны вывелі птушанят… Я буду прыносіць табе хлеб…

— Я не магу сам прымаць такое рашэнне, — апусціў дзюбу Лебедзь. — Бо яшчэ вельмі малады… Усе мае суродзічы ляцяць — і я павінен.

— Тады і я палячу з табой!— прыняла нечаканае нават для сябе рашэнне Варона.

— Што ты, дарагая, — усміхнуўся Лебедзь. — Вароны не лятаюць у вырай. Вы ж — птушкі непералётныя.

— А я стану першай пералётнай варонай! Магчыма, пра мяне нават людзі напішуць у сваіх кніжках, якія яны так любяць чытаць, а яшчэ больш — пісаць…

— Ты проста не зможаш. Вырай — гэта вельмі далёка. У цябе не хопіць сіл. Крылы твае невялікія, і ты не зможаш за намі ўгнацца.

Варона засумавала: Лебедзь меў рацыю. Ён — вялікі і дужы, махне крыламі раз — і вунь ужо дзе! А ёй трэба з добры дзесятак разоў з усёй моцы махаць сваімі крылцамі, каб пераадолець тую ж адлегласць, — аднойчы яны, дурэючы, спрабавалі лятаць навыперадкі.

Пасля доўгага маўчання яна ціхенька каркнула:

—А ты не мог бы…

Упершыню за ўвесь час Варона асмелілася аб нечым папрасіць Лебедзя!

—А ты не мог бы … Ну, скажам, я б села табе на спіну… Частку шляху я б ляцела сама. А калі б моцна стамілася — ты б мне крышку дапамог. Самую крышачку…

— Ну што ты, мілая, — Лебедзь ласкава пагладзіў кончыкам свайго магутнага крыла Варону па маленькай і, як яму падалося, не вельмі разумнай галоўцы — ці ж можна ўсур'ёз гаварыць такія рэчы? — Тады ўжо мне будзе цяжка — ты ж, хоць і не вельмі вялікая, але не такая ўжо і лёгкая. Я стану адставаць — і мы ўдваіх адаб'емся ад чарады. А гэта вельмі небяспечна. Я яшчэ ніколі не лятаў у вырай, дарогі не ведаю, звычак — таксама. Тут трэба падпарадкоўвацца важаку і ляцець разам з усімі. Аднаго мяне ніхто чакаць не будзе.

— Ну тады я палячу сама! — рашуча ўскінула дзюбу Чарнушка.

І дадала ледзь чутна:

— Я проста не змагу без цябе жыць…

— Я ж кажу табе — ты не здолееш, у цябе не хопіць сіл, — Лебедзь зрабіў выгляд, што не пачуў апошніх слоў Вароны.

— Ты мяне не ведаеш, — усміхнулася Варона. — Я — дужая! Я — смелая! І я цябе кахаю… Я ўсё змагу. Я абавязкова палячу. І далячу! Маё каханне мне дапаможа.

— Ну глядзі, — у адчаі ўзмахнуў крыламі Лебедзь. — Я цябе папярэдзіў. Толькі, калі ласка, не крыўдуй, але дапамагаць табе ў дарозе я не змагу…

— Я ведаю, — сумна каркнула Варона. — Я спраўлюся сама…

…Назаўтра чарада лебедзяў, сярод якіх вылучаўся сваёй грацыёзнасцю і элегнатнасцю яе высакородны Прынц ("Дальбог, праз колькі год ён стане важаком, гэты прыроджаны арыстакратызм відаць у кожным яго руху," — з гонарам падумала Варона, назіраючы за ўзлётам сямейства), выправілася ў дарогу. Некалькі дзесяткаў дужых белых крылаў са свістам разрэзалі паветра — людзі ў здзіўленні ўздымалі галовы: што гэта там, у небе?

І амаль ніхто не заўважыў невялікую чорную птушку, якая ўзнялася ў паветра ўслед за лебедзямі і паляцела за імі наўздагон…

…Лебедзі ляцелі цэлыя суткі, пакуль важак даў дазвол на першы прыпынак і кармёжку. Стомленыя птушкі склалі крылы і селі на ваду…

Белы Прынц доўга азіраўся, шукаючы вачамі Варону — яе не было. Ён углядаўся ў неба, шыпеў пра сябе: "Казаў жа дурніцы, каб сядзела дома. Прапала недзе…"

Неўзабаве, гадзіны праз тры, на гарызонце з'явілася чорная плямка…

— Дзякуй Богу, жывая, — з уздыхам палёгкі сустрэў сваю Чарнушку Лебедзь. — Варона, дарагая, я прашу цябе — не рызыкуй. Не прымушай мяне хвалявацца. Гэта быў першы пералёт, самы кароткі і лёгкі. Наступныя будуць куды даўжэйшыя і цяжэйшыя. Ты не вытрымаеш, гэта табе не па сілах. Пакуль не позна, вяртайся назад. Мы яшчэ не вельмі далёка адляцелі. Родзічы цябе прабачаць, і ты будзеш жыць з імі, як усе…

— Як усе? — устрапянулася Варона — Ты думаеш, я змагу жыць, як усе вароны, пасля таго, як пакахала Лебедзя і зведала высакароднасць і прыгажосць сапраўднага пачуцця? Прабач, мой Прынц, але я ўжо не змагу, як усе… Я палячу далей. Я — дужая, я — смелая. Я далячу, ты не хвалюйся.

Лебедзь уздыхнуў і падаўся да родзічаў, якія набіраліся сіл перад дальнім пералётам.

…Пра тое, што будзе там, куды яны, магчыма, некалі прыляцяць, Варона старалася не думаць. Яна не ведала, ці вытрымае нават наступны пералёт і ці даляціць увогуле. А калі даляціць, то што будзе рабіць там, сярод лебедзяў — нікім не званая і нікому, па вялікім рахунку, непатрэбная, нават свайму Прынцу — гэта яна таксама добра разумела… І што станецца з ёй, калі вясной лебедзі паляцяць назад, на радзіму.

Яна ведала, што разам з Лебедзем ёй не быць — ён птушка не яе палёту. Варона марыла толькі, каб лятаць з ім побач, бачыць яго, зрэдзьчасу размаўляць — калі ён таго пажадае — і тым быць шчаслівай… І ведала адно: заставацца без свайго Белага Прынца, зноў апынуцца ў асяродку варон, у суцэльнай чарнаце — апярэння, думак, учынкаў, слухаць насмешкі з-за пачуцця, якое адно толькі і дазволіла зведаць ёй, што такое шчасце — яна ўжо не зможа.

…На наступным прывале Варона дагнала чараду лебедзяў толькі праз суткі. Моцна схуднелая, яна з цяжкасцю пераводзіла дыханне, калі прысела на траву.

—Я ж казаў табе, што будзе цяжка,— з дакорам прамовіў, падышоўшы, Лебедзь. — Ну навошта такія ахвяры? Назад ляцець ужо далёка. Ды ты, мусіць, маеш рацыю: з суродзічамі табе цяпер наўрад ці паразумецца. Заставайся тут, Варона… І тут птушкі жывуць. Розныя. І вароны таксама — я бачыў. Знойдзеш сабе сяброў, адкормішся, адпачнеш, павесялееш. А калі мы будзем ляцець назад — сустрэнемся…

— Сустрэнемся, — рэхам паўтарыла Варона. І праз хвіліну каркнула зусім ціха: — Сустрэнемся…

—Ты згодна, ты застаешся?—узрадаваўся Лебедзь. — Вось і цудоўна!

— Не, Лебедзь, я палячу далей. Мне вельмі шкада, што ты нічога не зразумеў…

— Але наступны пералёт будзе самы цяжкі, ён — апошні. Ты можаш загінуць!

—Значыць, такі мой лёс,— сумна ўсміхнулася Варона.

І тут жа бадзёра страпянулася:

— Але ты не бойся, я не загіну. Я — дужая. Я — смелая. Я цябе кахаю. І я ўсё змагу! — паўтарыла яна, як заклінанне.

…Апошні пералёт і сапраўды быў самы цяжкі: галодны, поўны нечаканасцей і небяспекі. На возеры, дзе яны прыселі пакарміцца, іх спрабавалі падстрэліць браканьеры. На другім Белы Прынц ледзь не заблытаўся ў пастаўленай пад вадой рыбалоўнай сетцы, калі захацеў даць глыбокага нырца. Ад недакорміцы і немагчымасці добра адпачыць сілы ва ўсіх слабелі з кожным днём…

Але важак, дужы і мудры, не страціўшы ніводнай птушкі, прывёў-такі чараду да прыстанішча, дзе яны павінны былі перажыць зіму.

Некалькі дзён яны адпачывалі і ад'ядаліся, а потым пачалі весці звыклае жыццё, успамінаючы штодня радзіму і назіраючы за сонцам: калі яно пакажа, што можна вяртацца?

…Лебедзь перш згадваў Варону, якая на апошнім пералёце безнадзейна адстала, але з кожным днём — усё радзей і радзей: турботы і хваляванні, клопаты пра штодзённы пракорм і выжыванне адціснулі вобраз закаханай у яго Чарнушкі. Толькі зрэдку ў сны Лебедзя прыходзіла верная сяброўка, якая ціхенька шаптала "Я дужая, я смелая…" "Дзе ж ты цяпер, дурнічка? —думаў час ад часу, уладкоўваючы на ноч чырвоную дзюбу пад крыло, Лебедзь. — Пэўна, загінула… Ліса мо падсцерагла сонную. Ці цераз тое вялізнае возера не хапіла сіл пераляцець — упала ў ваду. Нават яны, дужыя і шырокакрылыя, ледзь дабраліся да другога берага. Дзе ўжо ж ёй, маленькай, з яе крылцамі — толькі па дварах шныраць у пошуках кавалка хлеба."

Тут Лебедзь зусім недарэчы ўспомніў, якія тыя кавалкі былі смачныя і своечасова з'яўляліся ў траве — і зазлаваўся на сябе, на свае сентыментальныя ўспаміны. "Казаў жа, як лепей: не ляці, нічога добрага з гэтага не атрымаецца… І потым, я ніколі нічога ёй не абяцаў — гэта быў яе выбар і яе рашэнне."

…Неўзабаве Лебедзь знайшоў сабе сяброўку — такую ж прыгожую і грацыёзную, атласна-белую, як сам. Яны, здаецца, былі вылеплены адзін з аднаго — калі гойдаліся разам на воднай гладзі, немагчыма было адрозніць, хто ёсць хто. Усе суродзічы радаваліся, гледзячы на гэтую прыгожую пару, загадвалі, колькі ў іх выведзецца птушанят — потым, як яны вернуцца на роднае азярцо… Прарочылі, што з разумнага, дужага, высакароднага лебедзя з цягам часу атрымаецца добры важак…

І з лёгкай усмешкай успаміналі закаханую некалі ў яго Варону. Гэтая дурнічка даляцела-такі да іх гняздоўя — амаль праз месяц, як яны абуладкаваліся. З белымі пёркамі ў некалі аксамітнай чарнаце сваёй апраткі. З пашкоджаным крылом — не ўсцераглася, трапілася аднойчы ў зубы лісіцы, ды здолела вырвацца, крыло толькі пашкодзіла рыжая драпежніца — з-за яго і затрымалася ў дарозе. Сумнымі-сумнымі вачыма глядзела здаля на свайго прыгожага Прынца, што кружыў у закаханым танцы вакол чароўнай сяброўкі, і ўздыхнула:

— Я — дужая. Я — смелая… Але ж — такая дурніца…

І — паляцела назад.

Арт-пацеркі

80-годдзю заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Барыса Аракчэева прысвячалася яго персанальная выстаўка, якая праходзіла ў сталічным Палацы мастацтва 19 — 31 снежня. “Пераемнасць. Барыс Аракчэеў і яго спадчына” — пад такой назвай экспанавалася 57 палотнаў

аднаго з нашых найстарэйшых жывапісцаў. Творы на батальную тэматыку, вясковыя краявіды, увасобленыя майстрам, уваходзяць у залаты фонд айчыннага мастацтва. Іх выдатныя ўзоры — плён паўвекавой працы — былі прадстаўлены ўвазе гледачоў: “Брэсцкая крэпасць. 1941 г.”; “Бярозавая алея”, “Вербы над ракой” ды інш. Барыса Аракчэева можна лічыць заснавальнікам творчай дынастыі: работы яго траіх дачок і чатырох унукаў таксама экспанаваліся на юбілейнай выстаўцы.

Адметнай падзеяй года мінулага стаўся юбілейны вечар народнага артыста Беларусі прафесара Яўгена Гладкова. Цымбаліст-віртуоз, спадкаемца выканальніцкіх і педагагічных традыцый, запачаткаваных Іосіфам Жыновічам, ён актыўна спрыяе развіццю беларускай цымбальнай школы і яе міжнароднаму аўтарытэту. Многія беларускія кампазітары давяраюць

Я. Гладкову першае выкананне сваіх твораў. Дзякуючы яго энтузіязму нашы музыканты ўвайшлі ў Сусветную асацыяцыю цымбалістаў; айчынная асацыяцыя цымбалістаў створана і плённа працуе пад яго кіраўніцтвам пры Беларускім саюзе музычных дзеячаў. Ён выхаваў нямала даравітых салістаў і стварыў некалькі маладзёжных цымбальных ансамбляў, у канцэртных выступленнях якіх з натхненнем удзельнічае і сам. Юбілейны вечар у Вялікай зале сталічнай філармоніі пачаўся з бліскучых нумароў у выкананні прафесара і яго студэнтаў. Упрыгожыў праграму ўдзел у ёй славутага калектыву, аснову якога складае цымбальная група, — Акадэмічнага народнага аркестра імя І.Жыновіча, годнага і даўняга партнёра Я. Гладкова.

“Дабравест” (“Благовест”) — гэта назва І Мінскага гарадскога фестывалю сучаснай хрысціянскай музыкі. Пазнаёміцца з яго ўдзельнікамі, спрычыніцца да іх творчасці можна заўтра ў Вялікай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі. А 16-й гадзіне там адбудзецца фестывальны справаздачны канцэрт.

С. ВЕТКА

Фота К. Дробава

У апошнія дні 2006 года, які, як вядома, быў абвешчаны ў Беларусі Годам Маці, у Рэспубліканскім Палацы культуры ветэранаў адбыўся заключны гала-канцэрт дабрачыннай тэатральнай акцыі “Маналог пра Маці”.

Маналог пра Маці

Ініцыятарам яе правядзення выступіў вядомы клуб аматараў тэатральнага мастацтва “Таленты і прыхільнікі”, які існуе ў нашай сталіцы ўжо 10 гадоў. У арганізацыйны камітэт, які ўзначаліў кіраўнік упраўлення культуры Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Віктар Кураш, увайшлі рэжысёр Святлана Навуменка, тэатразнаўца Людміла Лявонава, старшыня клуба “Таленты і прыхільнікі” Галіна Махаева, кіраўнік сталічнага Савета жанчын Ірына Аляксанава.

Напружаная праца па правядзенні акцыі вялася больш як паўгода. Арганізатары паставілі перад сабою шэраг задач, сярод якіх спроба звярнуць увагу дзеячаў літаратуры і мастацтва на таленавітых беларускіх актрыс, здатных ствараць на сцэне высакародны вобраз Маці як годны прыклад для пераймання, а таксама ў пэўнай ступені ўплываць на рэпертуарную палітыку тэатраў, дзе павінна быць месца п’есам, што прапагандуюць высокамаральныя адносіны ў сям’і.

У дабрачыннай тэатральнай акцыі прынялі ўдзел многія славутыя акцёры Беларусі, сярод якіх былі не толькі жанчыны. Святочны заключны канцэрт прайшоў у перапоўненай глядзельнай зале, дзе прысутнічалі шматлікія ганаровыя госці, спонсары, журналісты рэспубліканскіх СМІ. Была агучана прывітальная тэлеграма з Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь: ад імя кіраўніка нашай дзяржавы выказваліся добрыя пажаданні на адрас удзельнікаў і гасцей імпрэзы.

На працягу канцэрта гучалі ўзвышаныя класічныя мелодыі, якія ствaралі высакародную музычную атмасферу дзеяння, дапоўненую і сцэнаграфіяй, вытрыманай у чыстых светлых танах (мастак Ларыса Рулёва). Сцэну ўпрыгожвалі арыгінальныя карціны Аляксея Кузьміча — яго знакамітыя Мадонны. У зале было шмат кветак; у фае дэманстраваліся дзіцячыя малюнкі, прысвечаныя Маці.

Канцэрт вялі любімыя гледачамі артысты — Сяргей Журавель і Аляксандр Шароў. Перад аўдыторыяй разгарнулася цэлая галерэя вобразаў Маці: добрых, прыгожых, клапатлівых, працавітых, самаахвярных, высакародных, а таксама вобраз Багародзіцы і Маці-прыроды. Удзельнікамі свята былі Марыя Захарэвіч, Таццяна Мархель, Вольга Клебановіч, Наталля Гайда, Маргарыта Патапчук, Людміла Баталава, Юлія Сурмейка, Ірына Рымарава і многія іншыя артысты. З вакальнымі нумарамі, прысвечанымі маці, жанчыне, выступілі вядомыя оперныя спевакі Мікалай Майсеенка і Сяргей Франкоўскі. У канцэрце ўдзельнічалі і дзеці — навучэнцы Дзіцячай тэатральнай школы № 1 пры Новым драматычным тэатры ды інш.

Канцэрт прайшоў цёпла, кранальна. Былі выказаны шматлікія пажаданні, каб такая сустрэча абавязкова паўтарылася. І неаднойчы!

Людміла ЛЯВОНАВА,
літаратурны рэдактар
дабрачыннай тэатральнай акцыі

На здымку: удзельнікі акцыі Л. Баталава і А. Гусеў (Новы драматычны тэатр).

Спеўнае поле Віктара Роўды

У будынку Беларускага радыё, што па вуліцы Чырвонай, 4, вядзецца рамонт і пераабсталяванне самай вялікай студыі, у якой на працягу чатырох дзесяцігоддзяў ажыццяўляліся фондавыя музычныя запісы. Цяпер тут, можна сказаць, адмысловая новабудоўля, атмасфера поўніцца зусім не музычнымі гукамі. “А хор пяе!” — са здзіўленнем і павагай заўважаюць супрацоўнікі Дома радыё. Так, рэпетыцыі Акадэмічнага хору Белтэлерадыё, якім кіруе народны артыст СССР Віктар Роўда, працягваюцца. Мала таго: калі ў сувязі з рамонтна-будаўнічымі работамі не працаваў ліфт, 85-гадовы прафесар узнімаўся ў “рэпетыцыйны паддашак” пешкі!

А здымак гэты зроблены падчас юбілейнай вечарыны ў Вялікай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі: Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх Усяе Беларусі вітае шаноўнага маэстра, шчырага рупліўцу на ніве духоўнай культуры, чые заслугі перад Праваслаўнай Царквой — агульнавядомыя. Поруч — артысты знакамітага хору, выпеставанага Віктарам Роўдам...

Колішні спадзвіжнік і спадкаемца Рыгора Шырмы, ён ажыццявіў вялікую і высакародную справу, запісаўшы ў фонд Беларускага радыё “Анталогію беларускай народнай песні”, сабраную легендарным сваім Настаўнікам і старэйшым сябрам. Арганічным складнікам рэпертуару спеўнага калектыву стаўся вялікі пласт праваслаўнай духоўнай музыкі. А колькі зроблена для развіцця, захавання і папулярызацыі харавой творчасці сучасных беларускіх кампазітараў!

Магутны дух, вялікі ўнутраны музычны свет, дасканалы прафесіяналізм, дзівосная жыццёвая энергія Віктара Роўды выяўляецца не толькі ў творчасці хору Белтэлерадыё. Далёка за межамі краіны ведаюць яго маладзёжны калектыў, у якім спяваюць студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, будучыя харавыя дырыжоры. На адным з міжнародных конкурсаў, што праходзіў у Германіі, гэты калектыў заваяваў аж пяць харавых “Оскараў” — галоўных прызоў па розных спецыяльных намінацыях. Маэстра ведаюць як эрудзіраванага і патрабавальнага “суддзю” ў журы міжнародных фестываляў духоўнай музыкі ў Гайнаўцы і ў Магілёве (“Магутны Божа”). А яшчэ — як энтузіяста і галоўнага чынніка святаў дзіцячай харавой музыкі ў Мінску.

Беларускага хормайстра добра памятаюць і шануюць у краінах Балтыі, асабліва ў суседняй Літве, дзе ён разам са сваім калектывам быў заўсёднікам грандыёзных масавых фэстаў на “Спеўным полі”. І даўняя (праўда, нязбытная: пакуль?) мара Віктара Уладзіміравіча — пабудова і адкрыццё “Спеўнага поля” ў Беларусі. І правядзенне там вялікіх, з міжнародным размахам, харавых святаў. Прыгожая мара. Годная вялікай прыгожай Асобы. Годная прыгожай суверэннай краіны. Вартая высокай дзяржаўнай увагі. І — увасаблення.

- Днямі загадчык кафедры харавога дырыжыравання БДАМ узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны.

Я. КАРЛІМА

Фота К. Дробава

КАЛЯДНАЕ СУЗОР’Е

Сустрэча са светам мастацтва заўсёды радуе і акрыляе. Асабліва падчас навагодніх святаў.

24 снежня ў Дзяржаўным літаратурным музеі (Багдановіча, 15) адкрылася выстаўка майстроў, якія засвоілі тэхніку ручнога роспісу тканіны — батык. У экспазіцыі прадстаўлены работы юных мастакоў, якія займаюцца ў студыі выяўленчага мастацтва “Флорыя” (дзейнічае пры Рэспубліканскім экалагічным цэнтры). Выстаўка прысвечана каляднай тэме, і назва ў яе адпаведная — “Каляднае сузор’е”. На ёй таксама можна ўбачыць карціны, роспіс па шкле, паштоўкі. Усе сюжэты, зразумела, калядныя: зімовыя. Сярод твораў юных мастакоў і работа іх кіраўніка — Людмілы Баіравай. Называецца батык “Навагодняя ёлка-2007”. Пакуль надвор’е не радуе нас зімовымі ўзорамі, затое юныя мастакі здатныя парадаваць наведнікаў выстаўкі калядным сузор’ем сваіх работ.

Аляксей ПІСЬМЯНКОЎ,
студэнт 1-га курса БДПУ
імя Максіма Танка

У Палацы культуры Мінскага трактарнага завода адбыўся паказ спектакля “Чарнобыль ТМ”. Гэта міжнародны праект трох абсалютна розных тэатраў: “Бюро Падружжа” (Польшча), “Арабескі” (Украіна) і “Экадом-Арт”(Беларусь).

ДЛЯ ІХ...

Гэты своеасаблівы тэатральны эксперымент нечым нагадвае рэпартаж. Каб стварыць яго, удзельнікі тэатраў у кастрычніку 2005 года наведалі чарнобыльскую зону, сустракаліся з ліквідатарамі аварыі, з прадстаўнікамі ўладаў, эколагамі, праглядалі тагачасныя дакументы... І ўсё дзеля таго, каб адказаць на пытанне: “Што такое Чарнобыль?”.

— Кожны чуў і ведае слова “Чарнобыль”, — распавядае адзін з каардынатараў, аўтар ідэі праекта Дзмітрый Чарткоў, — але адказаць, што ж гэта за трагедыя, ніхто не здатны. І мы з гэтым сутыкнуліся. Улады гавораць адно, грамадскія арганізацыі — іншае. А людзі, якія жывуць у зоне, увогуле не звяртаюць увагу на радыяцыю і не жадаюць адтуль з’язджаць. Дык што ж такое Чарнобыль? Наш адказ на сцэне. Мы не навукоўцы, і наша задача — праз тэатральныя формы падштурхнуць да дыялога.

— Мы паспрабавалі паказаць канфлікт паміж традыцыйнай вёскай і атамнай энергіяй, — дадае рэжысёр Святлана Алешка. — Таму і пачынаецца пастаноўка з найбольш архаічнага свята — Купалля, якое ахутана таямнічай містычнасцю, гэтак жа, як і Чарнобыль.

Вельмі ўдала ў пастаноўцы спалучаны ігра акцёраў, дакументальныя кадры, мінулае, цяперашняе і невядомасць...

Прэмьера спектакля адбылася ў Познані на Х Міжнародным фестывалі “Маскі”, потым яго паказвалі ў Варшаве. “У Еўропе амаль нічога не ведаюць пра гэтую трагедыю, — зазначае адзін з каардынатараў праекта Яраслаў Сіякоўскі. — Толькі тое, што здарылася яна 20 гадоў таму. І многае для тамтэйшых гледачоў было адкрыццём. Для беларускіх жа гледачоў чарнобыльская трагедыя, на жаль, бліжэй. І гэтая тэатральная дзея збольшага для іх і пра іх”.

Пасля паказу ў Мінску спектакль убачылі на Гомельшчыне.

Юлія ДАВЫДЗІК

ОПЕРЫ — ПА СТАРОНКАХ

У Вялікай зале сталічнай філармоніі гучалі фрагменты, арыі з опер беларускіх кампазітараў. Многія з іх у свой час ішлі на тэатральнай сцэне.

Пачаўся канцэрт святочным урачыстым паланезам з оперы Аляксея Туранкова "Яснае світанне". Пакарыў слухачоў хор "Ой, рана на Йвана" з яго оперы "Кветка шчасця", якая праславілася яшчэ на першай дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве ў 1940-м. Харавы калектыў Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы быў літаральна ва ўдары! Вядомая "Песня бабыля Мікіты" з гэтай самай оперы зрабілася проста-такі народнай. У выкананні Віктара Стральчэні яна прагучала з гумарам, сакавіта, каларытна. Прыгожы, роўны па ўсім дыяпазоне голас абаяльнага, музычна адоранага Юрыя Гарадзецкага пазнаёміў слухачоў з рамансам Уронака з оперы А. Туранкова "Яснае світанне".

Анатоль Багатыроў быў прадстаўлены арыямі з яго опер "У пушчах Палесся", "Надзежда Дурава". Спявачка Аксана Волкава эмацыйна, з натхненнем выканала арыю Надзежды Дуравай з аднайменнай оперы кампазітара. У выкананні Ілы Сільчукова ярка прагучаў маналог Дзяніса Давыдава. Нікога не пакінуў абыякавым хор жыхароў спаленай вёскі з оперы Генрыха Вагнера "Сцяжынаю жыцця" паводле аповесці Васіля Быкава "Воўчая зграя".

Опера Яўгена Цікоцкага "Міхась Падгорны" з вялікім поспехам прайшла на першай дэкадзе Беларускага мастацтва ў Маскве. А ў гэтым канцэрце яе выдатна прадставілі дзве арыі. Настасся Масквіна па-майстэрску выканала найскладанейшую арыю Марысі. У выкананні Сяргея Франкоўскага таксама ярка, прыгожа прагучала арыя Міхася.

Выдатны меладыст кампазітар Юрый Семяняка быў прадстаўлены цудоўным дуэтам Максіма і Веранікі з оперы "Зорка Венера". Яго выканаўцы Аксана Волкава і Уладзімір Громаў проста зачаравалі сваёй прыгажосцю, выдатным выкананнем.

Шчодрымі апладысментамі была ўзнагароджана ўладальніца прыгожага каларатурнага сапрана Алена Шведава, якая бліскуча выканала найскладанейшы віртуозны галоп з оперы Ю. Семянякі "Калючая ружа", спецыяльна напісаны калісьці кампазітарам для непараўнальнай Тамары Ніжнікавай. Гэты нумар прагучаў ярка ў суправаджэнні аркестра, хору тэатра.

Упершыню была выканана малітва Ядвігі з оперы незабыўнага Уладзіміра Солтана "Пані Ядвіга": спявала маладая салістка Іна Русіноўская.

Ганаровымі гасцямі канцэрта былі два беларускія кампазітары — Сяргей Картэс і Дзмітрый Смольскі, чые оперы ставіліся на сцэне тэатра. У гэты вечар прагучаў пралог з оперы С. Картэса "Джардана Бруна" ў выкананні спевака Сяргея Франкоўскага і чытальніка Віталя Ваньковіча.

"Сівая легенда" Д. Смольскага карысталася вялікім поспехам у публікі. Слухачы захапляліся яе меладычнасцю, прыгожай аркестроўкай. Дзмітрый Браніслававіч з гонарам расказвае: "Лібрэта напісаў наш таленавіты пісьменнік Уладзімір Караткевіч. Оперу паставіў выдатны оперны рэжысёр Сямён Штэйн. Галоўныя партыі выконвалі нашы цудоўныя спевакі... Гэтым разам арыі з оперы "Сівая легенда" выконвалі Ніна Шарубіна, Наталля Акініна, Ілья Сільчукоў. Завяршыўся канцэрт дуэтам Ірыны і Рамана ў выкананні Тацяны Гаўрылавай і Эдуарда Мартынюка. Усе выканаўцы фрагментаў з гэтай оперы Д. Смольскага выступілі ярка, натхнёна, ім шмат з удзячнасцю апладзіравалі. Вельмі шкада, што гэтая цудоўная опера не ідзе сёння на беларускай сцэне. Хочацца пажадаць, каб "Сівая легенда" вярнулася ў рэпертуар тэатра.

Да канцэрта "Па старонках беларускіх опер" сур'ёзна, карпатліва рыхтавала спевакоў вядучы канцэртмайстар Ларыса Талкачова. Старанна, рупліва працавала з хорам галоўны хормайстар Ніна Ламановіч. Дырыжыраваў канцэртам Вячаслаў Воліч. Шкада толькі, што аркестр часам заглушаў спевакоў.

Вера КРОЗ

Фота А. Гардынца

Два вернісажы

У Светлагорскай карціннай галерэі "Традыцыя" імя Германа Пранішнікава адбыліся два вернісажы. Адзін знаёміць з творамі ўдзельнікаў міжнароднага славянскага пленэру, які праходзіў у Светлагорску і Буда-Кашалёве і прысвячаўся нашаму слыннаму земляку, акадэміку жывапісу, народнаму мастаку СССР Яўсею Майсеенку. Другі прадстаўляе творы сучасных армянскіх мастакоў.

Карціны ўдзельнікаў пленэру ўладарна падпарадкавалі сабе прастору выставачнай залы, напоўнілі яе жывой прыгажосцю і пазнавальнымі рэаліямі нашага жыцця.

Кожны з 14-ці ўдзельнікаў-мастакоў прадстаўлены двума творамі, а колькі эцюдаў, замалёвак засталося па-за гэтай выставай... Што і казаць, пленэры даюць рэдкасную магчымасць калектыўнага натхнення, сумеснай творчай працы.

І ўсё ж нават пры адных і тых жа краявідах мастакі застаюцца вернымі сваім адметнасцям, індывідуальнасцям.

Цікава супаставіць, напрыклад, карціны "Светлагорск" Рашыта Адгамава з Санкт-Пецярбурга і "Восень у Светлагорску" масквіча Яўгена Майсеева. У абодвух творах бачым усё той жа так знаёмы нам будынак з гарадскім гадзіннікам на Цэнтральнай плошчы. Але як парознаму падаюцца яны ў мастацкім увасабленні! Рашыт Адгамаў аддае перавагу ярка-чырвоным разлівам кветак у скверы, а яго калега з Масквы, пры ўсёй яркасці, застаецца па-восеньску каларытна-затоеным. Пры гэтым Яўген Майсееў больш дэталёвы, больш засяроджаны. Ён заўважае не толькі прасветленую веліч прыгаданага будынка, але і лавачкі сквера, і маладую маці з дзіцём, і маляўнічы авал клумбы...

Да гэтага творчага параўнання можна было б далучыць і карціну "Мікраараён Светлагорска" Мікалая Гуршчанкова з Брэста. Мы бачым 16-павярховы будынак і іншыя дамы Юбілейнага мікраараёна. Усё не толькі пазнавальна, але надзіва насычана рухам, імклівасцю людзей, машын, жыцця...

Да ўвасаблення прыгажосці горада далучыўся і Валерый Мазураў з Курска. Праўда, ён прысвяціў свой твор "Прычал у Светлагорску" не вуліцам і мікраараёнам, а набярэжнай. І зрабіў гэта па-свойму, пераканаўча, таленавіта. Зусім побач знайшоў сваё мастакоўскае натхненне і Віктар Нямцоў з Мінска: ён увасобіў зямную і нябесную прастору нашага рымска-каталіцкага касцёла.

Наогул, гэтым разам удзельнікі пленэру звярнулі натхнёную ўвагу на многія рэаліі Светлагорска і яго наваколля. Той жа Яўген Майсееў таленавіта лірычны ў пейзажы "Чайкі над Бярэзінай". Гэтак жа, як і Аляксей Какала з Чарнігава ("Мост праз Бярэзіну"), гамяльчанін Аляксандр Гайлевіч ("Вечарэе"), Уладзімір Волкаў з Бранска ("Прамень на змярканні"), Уладзімір Насянкоў з Харкава ("Вербы").

Сярод твораў, якія, безумоўна, узбагацілі галерэйны фонд (а папоўніўся ён 14 карцінамі), варта адзначыць "Старую таямнічую лесвіцу" Івана Папова з Гомеля. Нейкая рамантычная загадкавасць сапраўды прысутнічае ў ёй. А як мякка і пяшчотна перадае мастак сонечнае святло, якім дыхае гэтая таямнічая лесвіца...

Як заўсёды, парадавалі пастаянныя ўдзельнікі нашых пленэраў гамяльчане Мікалай Казакевіч ("Восень", "Раніца"), Роберт Ландарскі ("Восеньская цішыня", "Залатая восень"), а таксама іх калега Анатоль Отчык ("Узнясенне", "Летапіс выселенай вёскі").

Цяжка назваць пленэрнай карціну "Асветнік Кірыла Тураўскі" бранскага мастака Уладзіміра Волкава. Але як таленавіта праявіў ён сябе ў гэтым адзіным для нашай выставы творы партрэтнага жанру!..

Годным працягам пленэрнага вернісажу ўспрымалася экспазіцыя твораў сучасных армянскіх мастакоў. Святочнасць каларыту як нельга лепш адпавядала таму, што адбывалася ў залах галерэі. А адбывалася нешта незвычайнае. Шматлікіх прысутных вітаў вакальны ансамбль "Сінтэз" Палаца культуры вытворчага аб'яднання "Гомельдрэў". Песня "Мы будуем мост" аказалася вельмі сімвалічнай. Выстава сапраўды ўзнаўляла духоўныя стасункі двух братэрскіх народаў. Пра гэта ўсхвалявана гаварылі начальнік упраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама Аляксандр Прусаў, саветнік пасольства Рэспублікі Арменія ў Беларусі Эдуард Аруцюнян, старшыня кампаніі ТАА "Уніэкафор" Саак Антанесян, старшыня раённага Савета дэпутатаў Мікалай Чырва, намеснік старшыні райвыканкама Сяргей Мяркулаў і іншыя.

Урачыста віталі прысутныя і армянскіх мастакоў, ад імя якіх шчырую ўдзячнасць за арганізацыю выставы выказалі доктар філасофскіх навук Грыгор Данелян і Спартак Аруцюнян. Іх пранікнёныя прамовы перапыняліся музычнымі віншаваннямі ўладальніка Гран-пры міжнароднага конкурсу "Зямля пад белымі крыламі", стыпендыята спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі Ягора Фарашчана і не менш знакамітай юнай спявачкі, яго сястры Розы. Пранікнёна спявала і светлагорка Наталля Волкава. Асабліва дарэчы гучала песня "Мама" ў выкананні таго ж ансамбля "Сінтэз", бо, паводле слоў арганізатара выставы Саака Антанесяна, яна прысвечана ўсім жанчынам Арменіі і Беларусі.

І ўсё ж асноўная ўвага прысутных была звернута на творы сучасных армянскіх мастакоў. Розныя па жанрах, стылях, кампазіцыйных асаблівасцях, яны вызначаліся нейкай духоўнай, а не толькі прасторавай еднасцю.

І ўсё ж асноўная ўвага прысутных была звернута на творы сучасных армянскіх мастакоў.

Розныя па жанрах, стылях, кампазіцыйных асаблівасцях, яны вызначаліся нейкай духоўнай, а не толькі прасторавай еднасцю. Міжволі прыгадвалася тое, што прачытаў нядаўна ў кнізе пра народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва. Гэты знакаміты мастак сустрэўся аднойчы з класікам армянскага жывапісу Марціросам Сар'янам. На пытанне Марціроса Сяргеевіча: "Як вы ўспрымаеце маю Арменію ў колеры?" — Шчамялёў адказаў: "У чырвоным, ружовым, ультрамарынавым і ліловым...". "О, і я, уявіце сабе, так бачу!" выгукнуў Сар'ян.

Пераважна ў такіх колерах бачым і мы творы армянскай, святочнай па каларыце, экспазіцыі. Спартак Аруцюнян гэтым і адметны, у чым маглі пераканацца наведвальнікі яго персанальных выстаў не толькі ў Арменіі і Беларусі, але і ў Германіі, Польшчы... Светлагорская экспазіцыя таксама сталася пэўным чынам персанальнай для гэтага мастака. Ён аднолькава валодае майстэрствам партрэтыста, пейзажыста... Асабліва каларыстычныя яго нацюрморты з апельсінамі, з бронзавай, з індыйскай вазамі і іншыя. Часам здаецца, што ад іх свеціцца само паветра. Пры гэтым С. Аруцюнян дасягае цікавых алегорый. Скажам, у нацюрморце "Двое" ўвасоблены дзве шкляныя пасудзіны. Адразу ж заўважаеш, што адна з іх увасабляе жаночы, а другая — мужчынскі характар. А вось "Індыйская ваза" ўражвае асаблівай вытанчанасцю ліній і нібыта знікненнем іх у жоўта-аранжавай прасторы карціны. Сама рухомасць, само музычнае гучанне быццам зыходзяць ад яго выявы раяля. Безумоўна, С. Аруцюнян — майстар і характарнага, псіхалагічна-дакладнага партрэта ("Сямейны канцэрт", "Доўгія зімовыя вечары", "Мая бабуля"). Адзін з яго твораў ("Зіма ў Арменіі") , — мастацкі сімвал радзімы. А колькі шчырага лірызму ў "Палёце лазы", "Скрыпічнай музыцы"!

Іўжо зусім нечаканы аспект выставе надае Рубен Атаян. Гэта картограф, мастак, кандыдат тэхнічных навук, які ў свой час закончыў Маскоўскі інстытут інжынераў геадэзіі, аэрафотаздымак і картаграфіі. Удзельнік выстаў у Арменіі, Кітаі, Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы. Паводле яго твораў наведвальнікі галерэі могуць зрабіць завочныя падарожжы не толькі па Ерэване, але і па Ватыкане, Гомелі. Акрамя таго, ён захоўвае адданасць гістарычным рэаліям сваёй радзімы. Амаль кожны яго твор — з філасофскім, шматасацыятыўным падтэкстам. Менавіта на такія думкі наводзяць жывапісныя творы "Жывы сведка стагоддзяў", "Манастыр у Цахкадзоры", "Ванадзорская цясніна", "Арагац"...

Выстаўка атрымалася цэласна адзінай для ўсіх васьмі мастакоў.

Грыгор Данелян у свой час закончыў Ерэванскі тэатральна-мастацкі інстытут. Ён — яркі прыхільнік лепшых традыцый армянскага жывапісу. Гэта адчуваеш, любуючыся выразным каларытам яго "Восені", "Дабравесцем", "Дзяўчынкай з яблыкамі" ды і многімі іншымі, не менш прывабнымі творамі.

Лявон Дарбінян і скончыў Ерэванскае мастацкае вучылішча і завяршаў адукацыю ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. Тое, што мастака ведаюць не толькі ў Арменіі і ў Беларусі, але і ў Германіі, Нарвегіі, Егіпце, Амерыцы, у рэспубліках былой нашай агульнай краіны, — лепшае сведчанне яго пераканаўчага таленту. Каларыт пейзажных твораў настраёвы ("Ахалціхскія горы", "Горы Джавахка"), а "Партрэт Армэна" і "Партрэт дзяўчыны" па-майстэрску ўвасабляюць нацыянальныя тыпажы армянскага народа. Да зацікаўленага роздуму запрашае надзвычай кампазіцыйна складаная карціна "Бог адзіны".

Выхаванец Ерэванскага тэатральна-мастацкага інстытута Роберт Купчан прываблівае "Нацюрмортам з чайнікам", акварэллю "Чырвоная гара", профільным партрэтам "Мая бабуля" і, вядома ж, вечаровым пейзажам "Сяло ў гарах".

Па-свойму ўзбагачаюць светлагорскую экспазіцыю Радміла Купчан ("Царква ля возера Севан", "Возера Севан"), Алег Чурко ("Нацюрморт з рыбамі"), а таксама некалькі твораў з прыватнай калекцыі Саака Антанесяна.

Гэта толькі першае знаёмства з творамі сучасных армянскіх мастакоў. Ёсць дамоўленасць і на наступныя выставы.

Ізяслаў КАТЛЯРОЎ,
дырэктар Светлагорскай карціннай галерэі "Традыцыя" імя Германа Пранішнікава

НЕЛЬГА МАЎЧАЦЬ

Яшчэ да развалу былога Саюза Пімен Панчанка многазначна заўважыў: “У паэтаў няма забароненай зоны”. Што ён меў на ўвазе? А тое, што кожны таленавіты паэт, нягледзячы на цэнзурныя рагаткі, можа звяртацца да любой тэмы, якой бы яна не была складанай, і ствараць твор, адшукаўшы патрэбную форму і прыдатны мастацкі ракурс. Дык гэта вунь калі было прамоўлена! Што тычыцца сягонняшняга дня, то кожны пісьменнік мае права сказаць сваё слова пра ўсё тое, што пажадае.

Апошнім часам некаторых аўтараў зацікавіла гастраномія і абедзеннае меню пісьменнікаў, напрыклад, якім моцным алкагольным напоям аддаюць яны перавагу і наколькі злоўжываюць імі.

Каму нецікава было прачытаць успаміны Івана Шамякіна пра пасляваеннае застолле паэтаў і празаікаў, якое яны ладзілі ў рэстаране пасля атрымання ганарару. Канечне, як вопытны эсэіст, ён расказвае не пра выпіўку і закуску. Аўтара ў большай ступені займае тое, пра што яны гаварылі, якія маральна-этычныя і бытавыя праблемы хвалявалі іх. Згадвае ён і аднаго празаіка, які на першы погляд больш, чым трэба, улягаў за чаркай. Чаму? Прычынай была трагедыя, якая пераследавала яго яшчэ з дзён партызанства, калі ён, выконваючы загад сваіх камандзіраў, вымушаны быў зрабіць учынак, які, на яго думку, межаваў блізка са злачынствам, і душэўны боль стараўся ўтапіць у гарэлачным тумане і чадзе. І дарма, што гаворка, спрэчкі і высвятленне адносін паміж некаторымі літаратарамі адбываюцца ў застольным вэрхале і гармідары, уражанне застаецца светлае і аптымістычнае, бо І. Шамякіну не засцілае вочы гарэлачны дым і чад, — усё гэта толькі фон для абмалёўкі, як цяпер сказалі б, пісьменніцкай тусоўкі.

Зусім іншае ўражанне пакідае артыкул Міколы Старчанкі “Тры сустрэчы”, які змешчаны на старонках “ЛіМа” ад 10 лістапада 2006 года. Ён амаль пра тое самае, пра што гаворыцца і ва ўспамінах І.Шамякіна, толькі ў іншым, рэзка негатыўным, тоне і плане. Як быццам тры таленавітыя паэты думалі не пра вершы, а адно толькі як прыкласціся да чаркі. І нібыта гэта празмернае захапленне моцнымі напоямі і прывяло іх да заўчаснага скону. Што прымусіла Старчанку зрабіць такія жахлівыя высновы і *натхніла* ўзяцца за напісанне такога незвычайнага артыкула? Аўтар у самым пачатку прызнаецца, што прычынай для гэтага стала нататка А. Чароты пра лёс паэтаў, якія заўчасна пайшлі з жыцця. М. Старчанка наракае, што А. Чарота не сказаў, якая ўсё-ткі прычыны выклікала іх пагібель. І робіць катэгарычнае заключэнне, што заўчаснай смерці паспрыяла п’янства. Адначасова ён задае пытанні *што прымушае маладых і не дужа,* (што за стыль?! **В. М.**) *кідацца ў непрабуднае п’янства*? *Чаму яны пабрылі ў алкагольны туман*?” Пытанні, якія паставіў М.Старчанка, пэўна, прымусілі б у нейкай ступені задумацца не толькі чытачоў штотыднёвіка, але і небезвядомага ўрача-нарколага Хадоркіна, які лечыць ад алкагольнай залежнасці. Што да М. Старчанкі, то ён, не міргнуўшы вокам, гаворыць: “Паспрабую даць свой адказ на гэтыя няпростыя пытанні. Раскажу пра тры сустрэчы з Міколам Купрэевым”.

Здавалася б, чаго яшчэ больш жадаць чытачам ад аўтара артыкула, які на канкрэтных прыкладах і фактах бярэцца расказаць і паказаць, што менавіта прымушае паэтаў “кідацца ў непрабуднае п’янства”. І мы ўважліва чытаем пра тое, як М. Купрэеў два разы пазычаў у яго грошы. У першы раз, калі Старчанка працаваў у Рагачоўскай раёнцы. Тады ён адшчодрыў Купрэеву траяк для таго, каб ён змог даехаць да вёскі Ходасавічы. А ў другі раз Старчанка стаў пазыкадаўцам працуючы ўжо ў Гомельскай абласной газеце. Адпаведна ўзрасла і сума пазыкі. Газетчыку давялося раскашэліцца на цэлую пяцёрку. Праўда, да гонару М. Старчанкі, ён зрабіў для Купрэева яшчэ адну добрую справу, пазваніў у Брагінскую раённую газету і папрасіў тагачаснага рэдактара ўзяць паэта на работу. А дзе ж, могуць спытаць чытачы, пра п’янства М. Купрэева, пра тое , як ён “*пабрыў у алкагольны туман*”? Ды пра гэта не сказана ні аднаго слова, калі не лічыць рэпліку М. Янчанкі, які пасля таго, як Старчанка адшчодрыў Купрэеву траяк, заглянуў да яго ў кабінет і, рассмяяўшыся з наіўнасці малодшага калегі, раскрыў перад ім, як кажуць, карты: “На віно і піва хопіць. П’е ён, халера, а вершы добрыя піша. Кнігу будзе выдаваць”. Вось і ўсе факты і сведчанні пра тое, як М. Купрэеў “кінуўся ў непрабуднае п’янства”. Смешна? Не, больш горка, што вопытны газетчык М. Старчанка па сутнасці паверыў Мікалаю Янчанку, якога чамусьці называе Міколам .

У ПРАЦЯГ РАЗМОВЫ

ТРЫ СУСТРЭЧЫ

Ужо не адзін раз даводзілася чытаць у газетах і іншых перыядычных выданнях пра лёс некаторых выбітных беларускіх паэтаў. Рана яны пакідаюць гэты свет. І што характэрна: віной заўчаснай смерці, як правіла, называецца п’янства. А ці так гэта на самай справе? Няўжо толькі віно прыводзіць да апошняй мяжы?

А. Сербантовіч, М. Купрэеў, А. Сыс

Не хочацца быць цынікам, каб сцвярджаць, што М. Купрэеў быў святым, не браў за губу. Вядома, выпіваў, магчыма, і добра прыкладваўся да чаркі. Але на гэта меліся свае прычыны, пра якія ніхто не хацеў ведаць. Доўгія гады паэт пакутаваў знешне не бачнай, але невылечнай, хваробай.У яго каленных і бядзёрных чашачках з’явіліся салявыя шыпы, якія пры хадзьбе рэзалі косткі і выклікалі неймаверны боль. Таму ён заўсёды клыпаў з кіёчкам, які служыў яму пэўнай апорай. Паэт не скардзіўся на сваю нямогласць, мужна трываў боль, а калі ён рабіўся нясцерпным, утаймоўваў яго своеасаблівай анастэзіяй, чаркай. Скарга толькі адзін раз прарвалася напаверх у лісце да Л. Галубовіча, вытрымкі з якога прыведзены ў публікацыі, прымеркаванай да смерці М. Купрэева. Паэт прызнаваўся, што боль у суставах такі, што ён хацеў бы засіліцца, але не можа стаць на ногі і на табурэт.

Не хочацца быць цынікам, каб сцвярджаць, што М. Купрэеў быў святым, не браў за губу. Вядома, выпіваў, магчыма, і добра прыкладваўся да чаркі. Але на гэта меліся свае прычыны, пра якія ніхто не хацеў ведаць.

М. Старчанка гэта, відаць, зразумеў так, што Купрэеў перад сконам выпіваў настолькі моцна, што ўжо не валодаў нагамі. Ці не гэтая звычайная няўважлівасць і прывяла да абсурду. А калі б аўтар артыкула разабраўся ва ўсім і сказаў бы пра гэта, не крывячы душой, як сказаў пра душэўны боль празаіка, былога партызана, вопытны пісьменнік І. Шамякін, акцэнтуючы чытацкую ўвагу на той прычыне, якая прымусіла яго шукаць збавенне ў чарцы. А хіба гэтай павагі не заслужыў М. Купрэеў, напісаўшы і выдаўшы некалькі кніжак паэзіі, адна з якіх была вылучана на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Беларусі? Стварыў ён і шэраг цікавых і таленавітых аповесцей, якія друкаваліся ў часопісе “Крыніца”. Хіба гэта мала для пісьменніка, які не меў свайго сталага жытла і нармальнага прытулку, і пісаў свае рэчы, дзе патрапіць, але не як *папала*, а з веданнем справы і высокай адказнасцю за мастацкае слова. Яго паэтычныя і празаічныя творы сведчаць пра тое, што, жывучы, М. Купрэеў не чадзіў сырой галавешкай, а гарэў, тварыў, і пакінуў пасля сябе даволі ладную творчую спадчыну, пра якую і трэба гаварыць, а не пра тое, колькі рублёў і ў каго ён выпадкова пазычыў і на якія патрэбы іх пусціў. На вялікі жаль, замест гэтага на галаву пісьменніка былы газетчык з незразумелай зухаватасцю выліў цэлы цэбар памыяў, падкрэсліўшы, што сам ён таксама паэт. І тым не менш, аўтар артыкула не пераканаў чытачоў, у тым ліку і мяне, што М. Купрэеў — п’яніца і ў свае 68 гадоў пайшоў з жыцця ад гарэліцы. Як бачым, дубальтоўка, якую прылюдна зараджаў М. Старчанка і абяцаў грымотны стрэл, дала асечку.

М. Купрэеў і А. Сыс, з якімі аўтар артыкула сустракаўся і меў шапачнае знаёмства, пайшлі з жыцця параўнаўча нядаўна. А што да Анатоля Сербантовіча, то з гэтым светам ён развітаўся больш, як трыццаць пяць гадоў таму. Бачна, што М. Старчанка гаворыць пра яго па чутках, але з такой упэўненасцю, нібы разам з ім з’еў ні адзін пуд солі. Ён згадвае сустрэчу слухачоў Мінскай ВПШ з М. Танкам, на якой ён задаў паэту пытанне: чаму памёр малады паэт А. Сербантовіч? Народны паэт пасля хвіліны роздуму, нібыта адказаў, што “верх узяла неадкладная выгода. Гэта і прывяло да сумнага канца.” Хоць М. Старчанка і запэўнівае, што выказванне ён цытуе з запісной кніжкі, чамусьці не верыцца, што менавіта вось так М. Танк мог сказаць пра малодшага калегу. Зрэшты, А. Сербантовіч і не думаў разлічваць на нейкую выгоду. Пасля заканчэння універсітэта яго ўзялі на працу ў часопіс “Бярозка”, далі аднапакаёўку. А калі ажаніўся, выдзелілі двухпакаёвую кватэру. У яго меліся ўсе ўмовы для таго, каб спакойна жыць і пісаць творы. Не належаў паэт і да тых людзей, у якіх узнікае “жаданне крычаць аб тым, што іх не чуюць, не хочуць зразумець, абыходзяць увагай, не даюць таго, што патрэбна...” Як бы не засмуціўся Старчанка, але ўсё гэта ні на ёту не тычыцца А. Сербантовіча. Яго і чулі, і разумелі, і не абыходзілі ўвагай такія выдатныя паэты, якімі былі П. Панчанка і А. Вялюгін. Яны ахвотна друкавалі яго вершы і невялічкія паэмы на старонках часопісаў “Полымя” і “Маладосць”. І як бы М. Старчанка не даводзіў, што выказванні належаць М. Танку, цяжка і немагчыма паверыць у гэта. Як, дарэчы, і сцвярджэнню, што галоўны рэдактар “Бярозкі” К. Кірэенка і А. Сербантовіч падчас творчых спрэчак ледзь не браліся загрудкі. Усё гэта, мякка кажучы, хлусня, разлічаная на кідкага да сенсацый чытача. Трэба было бачыць, з якой павагай і пашанотай ставіўся К. Кірэенка да свайго супрацоўніка. Тым самым плаціў яму і малодшы калега. Мякка кажучы, хлусіць Старчанка, што паэт звольніўся з працы з-за няўступлівага характару рэдактара. Маладога паэта цягнула ў свет, ездзіў ён на цаліну, некалькі разоў браў у Саюзе пісьменнікаў накіраванне на Паўночнае мора, і працаваў там у рэдакцыі марфлоцкай газеты, плаваў на караблях. Вяртаючыся ў Мінск, зноў ішоў у “Бярозку”. Некалькі разоў ён з’язджаў у рэдакцыі раённых газет. Паэт быў апантаным чалавекам, меў супярэчлівы характар і прымаў рашэнні, якія не ўсе маглі ўхваліць і зразумець. Цюкнула яму ў голаў пайсці папрацаваць на лікёра-гарэлачны завод, і ён, не баючыся і не думаючы, як аднясуцца да гэтага сябры і знаёмыя, узяў і ўладкаваўся на прахадной вахцёрам, а не вартаўніком, як сцвярджае Старчанка. Цяжка зразумець, як у яго язык паварочваецца казаць, што там паэт “добра браў іншы раз на грудзі”. На той час ён, як кажуць, *завязаў, таму* і кропля спіртнога не пападала ў яго рот. Гэта могуць пацвердзіць сябры Анатоля і тыя, хто добра яго ведаў. А чаго варты выгук: “Падумаць толькі: чалавек з вышэйшай адукацыяй і ходзіць вышыбайлам ля невукаў!” Як ужо гаварылася, паэт працаваў вахцёрам. А вахцёр і вышыбайла — гэта дзве розныя рэчы. Але ад прадузятай злосці і непрыязі да паэта аўтар артыкула губляе самакантроль і вытрымку, круціць-перакручвае вядомыя факты. А з якім зларадствам сказана: “Тут, на жаль, ён і знайшоў сваю пагібель.”Ах, як хацелася б Старчанку, каб смерць паэта супала з яго работай на лікёра-гарэлачным заводзе. Але паэт пайшоў ад нас значна пазней.

Няма ўжо роднай маці Анатоля, а яго сёстры раскіданы па свеце і наўрад ці прачытаюць гэты злосны выпад супраць іх сына і брата. Іначай яны не ведалі б, што і рабіць... Усе сцвярджэнні, што Анатоль Сербантовіч — п’яніца і памёр ад гарэлкі — хлусня чыстай вады! Анатоль быў хворы. Яшчэ школьнікам падчас раённай велагонкі кола яго веласіпеда пакаўзнулася на мокрым бруку і ён упаў. Тым не менш, падхапіўся на ногі, ускінуў веласіпед на плячо, дабег да фінішу і страціў прытомнасць. Доўгі час ляжаў у бальніцы. Дыягназ — пралом чэрапа. Таму пасля лячэння галаўны боль часта і грозна напамінаў аб сабе. Анатоль мужна пераносіў гэтае выпрабаванне. У Мінску, калі ён працаваў у “Бярозцы”, яго зноў падпільнавала бяда. Ён вяртаўся з працы, на яго напалі падшыванцы і доўга здзекліва білі нагамі. І зноў — траўма галавы. Анатоль доўгі час ляжаў у бальніцы. На папраўку было мала надзеі.

Сербантовіча чулі і разумелі, і не абыходзілі ўвагай такія выдатныя паэты, якімі былі П. Панчанка і А. Вялюгін. Яны ахвотна друкавалі яго вершы і невялічкія паэмы на старонках часопісаў “Полымя” і “Маладосць”.

Але насуперак усяму ён устаў з ложка. Праўда, выглядаў не зусім добра. Аднойчы, кладучыся спаць, паскардзіўся, што нічога не бачыць перад сабой. Жонка хацела выклікаць “хуткую дапамогу”, але ён запярэчыў: не трэба, пройдзе! А пад ранне ён сканаў ад кровазліцця ў мозг. Урач Нейфах, які працаваў у паліклініцы пры Літфондзе Саюза пісьменнікаў, пабываўшы ў бальніцы, дзе рабілі трэпанацыю чэрапа А. Сербантовіча, дзівіўся, як ён яшчэ жыў з тымі рубцамі-спайкамі, што меліся ў яго мозгу. Яму не дапамагло б ніякае хірургічнае ўмяшанне. Пра нейкую выпіўку ніхто і не заікаўся. Анатоль апошнім часам цураўся спіртных напояў.

Узнікае пытанне: чаму пасля таго, як прайшло трыццаць пяць гадоў з дня смерці паэта, М. Старчанка накідваецца на яго, падтасоўвае факты, квэцае імя дзёгцем?

І ўвогуле, ці адказаў М. Старчанка на свае пытанні, чаму некаторыя пісьменнікі кідаюцца, як ён гаворыць, у п’янства? Не толькі не адказаў, але яшчэ больш напусціў туману. Не хапіла аўтару і той шамякінаўскай душэўнай празорлівасці і мудрасці, каб сказаць сваё слова пра калег-паэтаў, іх творчасць. Вядома, можна згадаць часовае захапленне чаркай, якое сяды-тады здараецца амаль з кожным сапраўдным творцам. А калі гаварыць увесь час пра негатыў, карціна атрымліваецца аднабокай і выклікае непрыемнае ўражанне.

Васіль МАКАРЭВІЧ

Мудра-ўсмешлівы чалавек

З 1984 года Леанід Левановіч годна прадстаўляе Вілейшчыну літаратурную, бо лета і зіму працуе ў вёсачцы Пятрылава нашага раёна, а яго родная вёска Клеявічы (на Магілёўшчыне) сышла ў нябыт: патушыла сляпая радыяцыя святло ў вокнах, пакрыла згубным попелам сцежкі.

Ёсць у пісьменніка кніга “Вяртанне ў радыяцыю”, у якой уздымаюцца надзённыя праблемы жыцця пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Сэрцам і душою перажывае аўтар бяду. Пра гэта яго творы. Ідзе стваральнае жыццё перасяленцаў. Але Левановіч тонка адчувае і праявы духоўнага Чарнобыля, асабліва ў аповесці “Узяць пад варту ў зале суда”.

Наведваюць Пятрылава сябры і аднадумцы Леаніда Кірэевіча. Быў тут і Алесь Пісьмянкоў, якога, на жаль, ужо няма разам з намі. Ён з першага погляду палюбіў гэту цудоўную вёсачку і напісаў кароткі, але ёмісты, арыгінальны верш:

Певень залопаў крыламі,
Лясныя будзячы нетры.
Рана ўстае Пятрылава:
Пятрылаўцу
Трэба
Петрыць.
Петрыць і рупіцца шчыра:
За косы і граблі пара.
...Нельга застацца без сыру
Пятрылаўцу
Да
Пятра.

Л. Левановіч — прыродалюб, ён тонка перадае фарбы і колеры лесу, іх адценні. Спасцігнуўшы мудрыя законы свету, духоўнасці, еднасці ўсяго жывога з Богам, аўтар праз любімыя аб’екты — ваду, сонца і асабліва лес — вучыць нас спасцігаць хараство Бацькаўшчыны...

Старонкі гісторыі нашай
Гартаеш старанна штодня,
На кожнай звяраешся
з часам,
На многіх — сябры і радня.

Майстэрства тваё
шліфавалі
“Нёман”, “Полымя”, “ЛіМ”.
У гэтых выданнях чыталі
“Паводку сярод зімы”.

Шчымліва, проста і ясна
“Бесядзь цячэ ў акіян”.
Страціў ты сябра заўчасна.
Сябры табе, як сям’я.

Да сэнсу лёгка дабрацца
“Дзікай ружы”, “Шчыглоў”.
Колькі ўкладзена працы
І паслухмяных слоў!

Гэты верш нарадзіўся падчас сустрэчы Л. Левановіча з вучнямі Ільянскай СШ імя А. Грымаця ў часе правядзення акцыі “Жыву ў Беларусі і тым ганаруся”. Мы з захапленнем і павагай слухалі творцу. Да слова, у апошні прыезд пісьменнік падараваў школе частку сваёй бібліятэкі, за што яму вялікі дзякуй.

Роза ШЭРАЯ,
кіраўнік музея
“Вілейшчына літаратурная”

БАЛАНСУЮЧЫ НА КАНАЦЕ

У артыкуле Леаніда Галубовіча “Тварам да Айчыны” (“ЛіМ” № 46, 2006) былі кінутыя скрыты і яўны заклікі да палемікі. Рэцэнзуючы аповесць Уладзіміра Дамашэвіча “Месяц у раі, або Аддай сэрца людзям”, ён зрабіў шэраг канцэптуальных заўваг, галоўнай з якіх, на мой погляд, з’яўляецца адсутнасць рэзкіх сюжэтных калізій, зацягнутасць побытавых апісанняў і дыялогаў. Чытаў я аповесць Ул. Дамашэвіча (“Полымя”, №№ 9,10, 2006 г.) пасля ўжо Галубовічавага артыкула, чытаў прадузята, спрабуючы ацаніць вартасці твора праз “шкло” памянёных заўваг.

Адразу агаваруся, што адведзеная мне плошча дазваляе разгледзець аповесць Ул. Дамашэвіча толькі ў звужаным ракурсе. А менавіта прааналізаваць суадносіны сюжэтнай дынамікі з аб’ёмам твора. Прычым хочацца паказаць, як гэта вырашаецца не толькі Ул. Дамашэвічам, але і класікамі айчыннай ды сусветнай літаратур.

Палеміка наспела не сёння. Калі прасачыць агляды холдынгаўскіх часопісаў за апошнія гады, то дзяжурнымі заўвагамі крытыкаў (спачатку Н. Дзянісавай, затым Л. Алейнік) да раманаў і працяглых аповесцяў з’яўляецца наступнае: слабая інтрыга, празмерная дэталёвасць у апісаннях, недынамічнасць і ненатуральнасць дыялогаў, а таксама трывіяльнасць думак, укладзеных аўтарамі ў вусны герояў. У той жа час суровыя крытыкі пільна сочаць за тым, каб твор нёс у сабе духоўны пачатак, каб надрукаванае на старонках часопісаў не прыпадабнялася да бульваршчыны. Словам, каб дагадзіць крытыку, аўтар павінен з майстэрствам канатаходца балансаваць над прорвамі бездухоўнасці і занудства, мусіць знаходзіць нейкую залатую сярэдзіну — што, па вялікім рахунку, і з’яўляецца задачай мастацкай творчасці.

Што тычыцца духоўнага пачатку аповесці Ул. Дамашэвіча, то тут нават бессэнсоўна спрачацца. Ужо сама назва твора ўказвае на мэты, якія ён пераследуе. І мэты гэтыя, на мой погляд, дасягнуты. Далей не разгортваю, таму што Л. Галубовіч у сваім артыкуле гэта зрабіў даволі даходліва і шырока.

Пытанне ж зацягнутасці і занудлівасці літаратурных твораў настолькі складанае, што я ніколі не рашуся выстаўляць каму-небудзь ацэнкі, выказвацца адназначна і безапеляцыйна. Усё гэта справа густу, і прыклад таму — станоўча-захоплены водгук на аповесць Ул. Дамашэвіча ад Ю. Станкевіча, пісьменніка зусім іншага, калі не сказаць — супрацьлеглага плана. Ацэнку гэтую знарок прывёў Л. Галубовіч у пачатку свайго артыкула.

Нават проста гартаючы аповесць “Месяц у раі...”, бачна, што паміж дыялогамі і апісаннямі, паміж простай і аўтарскай мовамі вытрымліваецца парытэт, бачна, што дыялогі не выліваюцца ў маналогі аднаго з герояў, тады як другі герой ператвараецца ў рахманага слухача. Праўда, ёсць выключэнні-хібы, пазбегнуць якіх наогул рэдка каму з празаікаў удаецца. Вось прыкладам, у размове з Рагнедай і яе маці (глава IV) Янка бярэ слова: “Натуральна было чакаць, што я падтрымаю сваю жонку Рагнеду, але няхай яна мне даруе, я прымаю бок нашай мамы...” (Далей ідуць слушныя Янкавы развагі пра пераезд і звязаныя з ім побытавыя невыгоды — на дваццаць радкоў палымянскага фармату, а гэта добрых паўстаронкі ў звычайнай кнізе). Не многім з нас удаецца атрымаць такіх цярплівых і далікатных суразмоўнікаў. Калі прыгледзецца да чалавечай гаворкі, то яна носіць фрагментарны і перарывісты, экспрэсіўны характар. Мы пастаянна перабіваем адно аднаго калі не слушнымі довадамі, то хаця б рознымі “хм”, “угу”, “так”, “не”, “безумоўна”. А іначай гаворцы проста не быць, яна разваліцца, бо суразмоўцы смяротна надакучаць адно аднаму. Зрэшты, і тут я гатовы паверыць Ул. Дамашэвічу, што зрэдчас жонка можа дазволіць мужу выгаварыцца, не перарываючы яго з паўхвіліны. Тым больш што такіх месцаў у аповесці вельмі няшмат.

Давайце паглядзім, як вырашаецца пытанне натуральнасці дыялогаў класікамі. Часам — зусім ніяк. Асабліва вылучаецца ў гэтым Ф. Дастаеўскі. Напрыклад, сядзіць у засадзе брат Міця, высочваючы ненаглядную Грушаньку, бачыць, што міма ідзе малодшы брацельнік Алёша, падзывае яго да сябе і там, у засадзе, распачынае свой маналог аб сэнсе жыцця на некалькі буйнафарматных старонак. Бывае такое ў жыцці? Практычна ніколі. Аднак Дастаеўскі стварае нейкую іншую рэчаіснасць, дзе размаўляюць і дзейнічаюць па законах самога аўтара, і — цуд — чытач, напачатку пасердаваўшы, хутка дае веры, што так можа быць, і ўжо адарвацца не ў сілах ад Міцевай мнагаслоўнасці. Што ж прымушае нас цярпець доўгія дыялогі-маналогі герояў Дастаеўскага? Магія слова. А яшчэ і зусім рэальныя, разважаныя аўтаравы прыёмы. У дыялогах прамаўляюцца абсалютна незвычайныя, нетрывіяльныя рэчы. Прамовы вельмі экспрэсіўныя, страсныя, балансуюць на мяжы прыстойнасці, ад герояў пастаянна чакаеш якой-небудзь пачварнай выхадкі. За главой з дыялогамі пра высокія матэрыі, як правіла, ідзе глава з надзвычай напружанымі калізіямі, з эксцэнтрычнымі, эпатажнымі, агрэсіўнымі дзеяннямі. Падзеі ў доўгіх раманах Дастаеўскага мяняюцца з калейдаскапічнай хуткасцю. Разгалінаванасць сюжэтнай лініі не дае чытачу занудзіцца. Апісанняў жа ў Фёдара Міхайлавіча мы практычна не знойдзем.

Куды з меншай экспрэсіўнасцю, але падобнымі прыёмамі вырашаецца праблема дыялогаў, апісанняў і дзеянняў у раманах Івана Шамякіна. Шматлінейны сюжэт дазваляе пераскокваць з адной лініі на другую, інтрыгаваць чытача. Да таго ж Шамякін выдатна ўмее звесці канцы з канцамі.

Уладзімір Караткевіч не аматар укладваць у вусны сваіх герояў доўгія прамовы, пазбягае, па магчымасці, дыдактыкі і павучэнняў. Ён любіць і ўмее апісваць наваколле, побыт, людзей і іх дзеянні. Але нярэдка ловіцца на гэтую вуду, ахвяруючы сюжэтнай дынамікай. Вось напрыклад, баль у доме Яноўскай (“Дзікае паляванне караля Стаха”) апісаны па-майстэрску, сакавіта і недакучліва, бо гэтае апісанне ёсць дапаўненне да напружанага сюжэта, на ім чытач адпачывае душою, каб праз колькі старонак зноўку патрапіць у вір чорнага, жудаснага, таямнічага. Апісанні ж побыту ў “Каласах пад сярпом тваім”, хоць таксама выкананы густоўна і бездакорна, амаль не разбаўляюцца дзеяннямі, не нанізаны на жорсткі каркас сюжэта, а таму ўражанне ад іх меншае па меры прасоўвання чытача па рамане.

Найаптымальнейшым чынам, на маю думку, вырашаецца гэтая праблема Л. Талстым. Яго “Вайна і мір” — абсалютны ўзор гарманічнага спалучэння займальнасці, духоўнасці, праўдзівасці і прыгажосці. Неяк у знакамітага Барыса Акуніна, майстра стылізацый, спыталі, ці зможа ён падрабіцца пад Льва Талстога. На што Акунін адказаў, што немагчыма падрабіць стыль пісьменніка, які характэрны адсутнасцю ўсякага стылю. Гэта, па-мойму, найвышэйшая пахвала, сведчанне таго, што творчасць Талстога зліваецца з жыццём (якое шматстылёвае), яна настолькі праўдзівая і рэальная, што асоба аўтара нівелюецца, за прамовамі герояў мы бачым жывых людзей, яны самі (як бы ад сябе, а не ад Талстога) да нас апелююць.

Яшчэ раз вернемся да аповесці Ул. Дамашэвіча. Пісьменнік правільна і сумленна назваў свой твор аповесцю, не раманам. Ідзе нетаропкі, у духу нацыянальнага менталітэта расповед аб жыцці-быцці простых (ці не зусім простых) людзей, аўтар адшуквае паэзію ў паўсядзённасці, стварае атмасферу душэўнасці і лірызму. Мэта твора апраўдана мастацкімі сродкамі, і наадварот. Літаратура такога кшталту для мяне нашмат даражэйшая, чым бойкае чытво, якое запаланіла кнігарні нашай краіны. Там да занудства не прыдзярэшся, але, як правіла, не знойдзеш і крупінкі духоўнасці, не адрозніш аўтара ад аўтара, бо амаль усе яны — на адзін твар. Тыя творы пішуцца са свербу да дзеяння, а часцей — з прагі да славы. Аповесць жа Дамашэвіча відавочна пісалася з любові да жыцця, дзе кожная дэталь, кожная дробязь маюць значэнне. Аповесць, думаю, можна назваць, зважаючы на сённяшнія рэаліі, гэтакім анты-чорным квадратам. Яна антыпод прымітывізму ў літаратуры і заклік да маладзейшых, якім муляе слава іх расійскіх калег па пяры: а слабо, вам, чалавекі, напісаць пра простыя рэчы, без выкрутасаў і блазнавання, але так, каб вас друкавалі, чыталі і абмяркоўвалі? А мы абмяркоўваем аповесць Ул. Дамашэвіча — значыць, яна не пакідае нас абыякавымі. Для сённяшняга стану айчыннай літаратуры — гэта ўжо нямала.

Міхась ЮЖЫК

А карані яшчэ жывыя

Твор адрасуецца шырокай чытацкай публіцы і, на мой погляд, у першую чаргу, кампетэнтнаму чытачу.

Галоўная мэта Уладзіміра Дамашэвіча — падвесці чытача да асэнсавання надзвычай важнага: “А ці не час нам, спадары інтэлектуалы, усур’ёз задумацца над каранямі сваімі, бо далей ісці так, як ідзем, — гібельна”.

У аповесці аўтар падае і свой, аўтарскі, голас, але робіць гэта мудра, глыбока і гучна. Таму, мабыць, і ідзе ад простага, зразумелага да дужа шчымлівага ў душы кожнага беларуса, які не страціў у памяці, што ён беларус. Фактура твора выбрана трапна, хоць і няпростая для мастацкага ўвасаблення, — быт простых, зямных людзей, дзе дзейнічаюць старэйшыя і маладзейшыя сучаснікі — сведкі таго, што адбывалася ў жыцці беларусаў з далёкіх, перадваенных, ваенных і пасляваенных гадоў аж да сённяшняга часу.

Сюжэт, на першы погляд, замаруднены, статычны, але ён мае ўнутраную дынаміку, якая забяспечвае цікавасць чытача. Яе рух — у паўсядзённых справах, клопатах, развагах, успамінах галоўных герояў — Янкавай цешчы, маці Рагнеды, Янкавай маці, яго родных, суседзяў. Менавіта, адкрываючы такі зрэз побыту, такі знаёмы і блізкі сэрцу чытача, расхінае яму вочы на знаёмае, але не стандартна, па-мастацку ўвасоблена. Прасочваецца штодзень жыцця герояў з безашчаднай дэталізацыяй. Гэта, трэба думаць, досыць удалы прыём пісьменніка. Дэталізацыя мае глыбокі падтэкст. Яна скіроўвае чытача на адчуванне сваёй безуважнасці да сваіх каранёў. Глыбіня пераканаўчасці аўтарскай пазіцыі сілкуецца размовамі, успамінамі герояў, дзе ўсё называецца сапраўднымі імёнамі.

Аўтар не ў лоб, а спакваля падводзіць чытача да неабходнасці перагляду сваіх адносін да сябе. Дасягаецца гэта праз жывыя, запамінальныя вобразы.

Так, жорсткія выпрабаванні не зламалі характару Янкавай цешчы. Яна засталася гордай, разумнай, стрыманай у ацэнках, поглядах на былое і сягонняшняе. Неаднолькава ставіцца да сваіх дачок, больш прыхільна — да малодшай Альбіны, якая жыве, а не існуе. Рагнеда ж — летуценніца, мякчэйшая па характары, пражыла бязладна большую частку жыцця з нялюбым мужам. Маці хавае ад яе свой боль у надзеі, што тая ўрэшце зробіць свае беспамылковыя высновы, як дажываць век з новым мужам.

Удумліва створаны аўтарам вобразы Янкі і Рагнеды. Янка — пісьменнік (думаецца, што выбар прафесіі героя невыпадковы, а мэтанакіраваны), многа аддаў сілы і таленту на рэдагаванне чужых кніжак і гэтым, як лічыць ягоная Рагнеда, абакраў сябе — напісаў мала свайго, хоць па сваіх здольнасцях мог бы больш. Наконт сябе ў Янкі зусім іншыя азначэнні — узважаныя і, пэўна, справядлівыя.

Рысы характару Янкі аўтар выяўляе праз яго стрыманыя выказванні падчас застолля, праз думкі героя сам-насам падчас упарадкавання цешчынага котлішча, пры яднанні з мілым душы садам, лесам і многімі рэчамі, якія вяртаюць ягоную памяць да гадоў дзяцінства, юнацтва, сталасці, адгукаюцца ў сэрцы Янкі любоўю і жалем аб незваротнасці нашага існавання...

Вельмі лагічным таму падаецца такі роспачны зварот героя да чытача: “Дык куды мы ідзём, браты-беларусы? Куды круцімся? У горад? А мо ў гора? А мо ў голад? Нешта трэба рабіць. Начальства ўжо задумалася. Але яшчэ нічога не робіцца... Як гэта ў Якуба Коласа? Фурман з панам уцяклі, а карэта ўсё ў балоце грузне...”

Толькі чытач (а гэтак жа і крытык!), які зазвычай карыстаецца толькі клішэ-ацэнкамі, можа гаварыць пра тое, што аўтар зацыкліўся на статычным і незаглыбленым сюжэце. Ул. Дамашэвіч надзвычай арыгінальна прадумаў прастору дзеяння і сюжэтныя калізіі. Скажу больш: фактычна аповесць мнагапланавая і нават энцыклапедычная.

Мне думаецца, што аповесць сёння больш значная ад шмат якіх гістарычных твораў. Я высноўваю гэткую ацэнку не з мэтай пакрыўдзіць іншых пісьменнікаў, а каб падкрэсліць: пішучы аб мінулым, не забывай пра сённяшняе.

Прадбачу, што многія чытачы аповесці “Месяц у раі...” не будуць згодныя з маімі нататкамі. Гэта няблага, бо нязгода шукае аргументы адваротныя. А яны таксама цягнуць на роздум.

Мікола ДУБОЎСКІ

«ДЗЕ БЕЛАРУСКІЯ ГЕРОІ?»

Яна пачынала як журналістка, балетны крытык — але ў выніку прыйшла да літаратурнай дзейнасці ва ўсёй палітры яе жанраў, — не парываючы з улюбёным заняткам. Як у сапраўднага ляўшуна, яе шлях раз-пораз збочваў з прамой; частымі былі пераскокі — з дзіцячай літаратуры ў паэзію, з аповесцяў на апавяданні…

Таццяна Мушынская — адна з нямногіх сучасных мастакоў слова, якія могуць правесці творчую вечарыну ў сталічнай філармоніі. Калі яна падаравала афішу свайго вечара намесніку міністра, той заўважыў: "Дык у вас жа ўвесь оперны тэатр тут прадстаўлены!" Спн. Мушынская сціпла адказала Уладзіміру Рылатку: "Пакуль не ўвесь".

Аб творчым росце

— ...У дзяцінстве мяне вабілі рамантычныя прафесіі: бачыла сябе на сцэне — але не магла вырашыць, буду спяваць, танцаваць ці іграць драматычныя ролі. Але ж мяне заўсёды не задавальняла роля ў масоўцы, калі ты — адзін з многіх. Таму выбрала факультэт журналістыкі і менавіта спецыялізацыю па культуры і мастацтву.

А што да мастацкай творчасці... Ёсць людзі, якія да яе прыходзяць вельмі рана. Я таксама некаторыя свае вершаваныя рэчы пачынала пісаць яшчэ ў школе, у студэнцкія гады — але ўспрымала ўсё гэта як своеасаблівы дзённік, як тое, што пісалася для сябе. Вынік мне не падабаўся — таму і жаданне друкаваць тыя радкі ў мяне не было. Уласна пісьменніцкая творчасць пачалася для мяне недзе на пачатку 90-х гадоў, прычым адбылося гэта досыць нечакана. На пачатку 90-х сядзела ў дэкрэтным адпачынку са сваімі дзецьмі, і раптам, для ўласнага і іх задавальнення, пачала прыдумваць казкі. Ім заўсёды падабалася, калі ў казках, у нейкіх чароўных гісторыях яны — галоўныя героі.

І пакуль гэты дэкрэтны адпачынак доўжыўся, паспела напісаць два зборнікі дзіцячых апавяданняў і казак. Адзін — "Віця-неслух у краіне мурашоў" выйшаў у 1995-м, а другі — "Свята печанай бульбы" — у 2003-м.

Пісьменнік, які піша для дзяцей, у сваёй псіхалогіі павінен мець і нейкія дзіцячыя рысы — і наіўнасць, і шчырасць. Але дарослы свет дастаткова жорсткі, ён існуе трохі па іншых законах, і можа быць так, што ў творчасці ты будзеш выйграваць, а ў жыцці — наадварот. І ў пэўны момант мне захацелася больш дарослых герояў, больш дарослых сюжэтаў.

Увесь гэты час таксама працавала ў журналістыцы. Прафесія адкрывае дзверы — у філармонію, на прэс-канферэнцыі, яна дазваляе пазнаёміцца з самымі цікавымі людзьмі свайго часу... Такім чынам нарадзіліся мае аповесці з жыцця інтэлігенцыі. "Доўгае развітанне" прысвечанае музыкантам, "Апошняе каханне Дон Жуана" ўзнаўляе мастакоўскае асяроддзе, а "Джульета і экстрасенс" — драматычны тэатр (як кажа там мая гераіня, "галоўныя страсці кіпяць за кулісамі").

Перш-наперш — пачуцці

— Журналістыка, крытыка і пісьменніцкая дзейнасць — рэчы даволі розныя. Як удаецца вам усё гэта сумяшчаць, і ці не ўзнікае праблемы выбару таго ці іншага накірунку?

— Розныя накірункі не спрачаюцца паміж сабой у маёй свядомасці. Гэта — проста розныя ракурсы ўспрымання рэчаіснасці. Я столькі напісала артыкулаў — і партрэтаў, і дыялогаў, і інтэрв'ю, што проста ў нейкі момант захацелася іншага ракурсу, які дае мастацкая творчасць.

Пры ўсёй павазе да крытыкі ўсё-ткі гэты від творчасці з пункта самавыяўлення абмежаваны. Калі ты адлюстроўваеш створанае некім — ты залежыш ад таленавітасці творцы, які зрабіў гэты спектакль, паставіў гэты балет. А калі ты ўсё-ткі займаешся ўласнай мастацкай творчасцю, то і магчымасцяў больш маеш, і аўдыторыя ў цябе большая.

Пачуцці — гэта першая сігнальная сістэма, як кажуць псіхолагі. Усё, што звязана з розумам і інтэлектам — сістэма сігнальная другая. Таму я, пасля таго, як выдала пяць кніг вершаў, дзіўлюся часам, што нейкія мае радкі, у якія ўкладала адны эмоцыі, людзі інтэрпрэтуюць зусім іначай.

— Журналістыку многія лічаць больш прафесіяй, рамяством, чымсьці мастацтвам. І ёсць больш "высокая" творчасць — літаратура. Вы працуеце і там, і там — ці не ўзнікаюць стылёвыя праблемы ў пераключэнні з адной іпастасі на другую?

— Я такі чалавек, які ўмее захапляцца талентамі іншых людзей. Таму асвятляць новыя спектаклі, новыя работы артыстаў мне ў ахвоту. Але ў часопісе ты павінен у абмежаваны тэрмін здаць пэўны артыкул; гэта адказнасць. Але ж ёсць яшчэ адзін бок: трыбун не так і шмат. Таму радуешся, што ёсць магчымасць выказацца па пытаннях, якія хвалююць не толькі цябе, але яшчэ многіх людзей.

Мне заўсёды цікава — на што з напісанага мной публіка адгукаецца, а на што не. А ў літаратуры бывае так: ты нешта напісаў — і публікуеш праз паўгода, год ці болей — ты ўжо гэтыя эмоцыі забыў, перагарнуў колькі старонак жыцця, а некага яны яшчэ хвалююць.

Больш спецыялізаваных выданняў

— Дарэчы, што да водгукаў. Вы доўгі час самі былі крытыкам. І потым, калі пачалі публікавацца, вядома ж, адчулі рэакцыю на сваю творчасць. Як, прабачце за таўталогію, крытыка ў ваш адрас паўплывала на вашу працу як крытыка?

— Я ўдзячна тым, хто прыходзіць на мае канцэрты, тым, хто піша — няхай гэта будзе нейкая друкаваная староначка — таму што гэта інфармаванне тых, хто не патрапіў на маю імпрэзу. З другога боку, кожны творца захоўвае гэтыя выразкі, ксераксы, пазначае дату публікацыі — друкаванае слова для кожнага каштоўнае...

Адзінае, што магу сказаць — лічу, што як крытык больш шчодрая ці ў ацэнках, ці ў аб'ёмах, ці ў сваім, слухацкім/глядацкім захапленні. Бо калі я сапраўды захоплена, дык мне не шкада напісаць разварот ці два ў часопіс — калі гэта *з'ява.*

Фактычна, праблема ў тым, што ў нас няма спецыялізаваных выданняў. Пры маёй глыбокай павазе да літаратурна-мастацкіх газет і часопісаў, якія існуюць у краіне, — безумоўна, павінна існаваць разгалінаваная структура спецыялізаваных выданняў па мастацтве. Павінен асобны часопіс існаваць, які б, напрыклад, называўся "Музыка і танец", асобны — "Выяўленчае мастацтва", яшчэ адзін — "Тэатр", дзе друкаваліся б і п'есы, і рэцэнзіі. Як супрацоўнік часопіса і як чалавек, які крытыкай займаецца, бачу: у тым, што адлюстроўваецца, ёсць пэўная фрагментарнасць — водгукі ў прэсе атрымліваюць толькі самыя-самыя значныя падзеі. Вельмі многа з'яў, якія крытыка назвала, але не хапае тэрыторыі, плошчы, часу для таго, каб заглыбіцца ў іх, грунтоўна прааналізаваць.

Аб героях

— Як на вашую думку можна зрабіць так, каб беларускія дзеткі ўсё ж такі больш чыталі беларускую літаратуру, беларускамоўныя казкі?..

— Гэта — відавочна, тэма асобнай гаворкі, асобнага вялікага дыялога. Я часта выступаю ў школах і бібліятэках — і магу зазначыць, што попыт на беларускую дзіцячую літаратуру ёсць. Існуе вялікая катэгорыя пісьменнікаў, якія працуюць у галіне дзіцячай літаратуры — але паміж пісьменнікам і патэнцыйным чытачом ёсць нейкая сцяна, ці нейкі яр... З аднаго боку, пісьменнік прыносіць рукапіс у выдавецтва і не ведае, калі кніга выйдзе і якім тыражом. З другога боку, бібліятэкі часта не маюць грошай, каб гэтыя кнігі заказаць.

Таму вельмі часта здараецца так, што прыязджаю я ці нехта з маіх знаёмых у глыбінку і аказваецца, што ў тамтэйшай бібліятэцы ёсць кнігі і для дзяцей, і для дарослых — якія за савецкім часам выдадзены, а таго, што цяпер — няма, як быццам і цывілізацыя датуль не дайшла.

Гэта пытанне прапаганды. Лічу, без рэкламы кнігі нічога не будзе. Канечне, тут трэба пісьменнікам на тэлебачанні часцей з'яўляцца, іх павінны ведаць у твар. Сам па сабе народ згодны і Данцову чытаць. Ёсць такое меркаванне, што "свае нічога цікавага напісаць не могуць" — гэта абсалютна няправільна, таму што нельга ацаніць тое, чаго ты не ведаеш. Гэта павінен быць клопат дзяржаўны і прэстыж пісьменніка павінен быць у дзяржаве іншым.

Мікалай АНІШЧАНКА

Даведка "ЛіМа"

Таццяна Мушынская — пісьменніца, журналістка, тэатральны крытык. Цягам апошніх 15 год працуе ў часопісе "Мастацтва". Па стыпендыі Інстытута польскай культуры ў Парыжы стажыравалася ў Польшчы як балетны крытык і лібрэтыст.

Член Саюза беларускіх пісьменнікаў. Піша на беларускай і рускай мовах. Выдала 5 зборнікаў вершаў, аўтар кнігі прозы "Доўгае развітанне" (1997). Апублікавала больш за 20 апавяданняў і казак для дзяцей. Друкавалася ў "Полымі", "Нёмане", "Маладосці", "ЛіМе", іншых выданнях.

Аўтар лібрэта да балетаў "Дзюймовачка", "Апошні кароль", "Чорная дама Нясвіжа". Выдала пяць кніг, прысвечаных беларускаму балету. На яе вершы напісана больш за 170 музычных твораў.

На вечарыне Таццяны Мушынскай

СПОВЕДЗЬ ПЕРАД ЗЕМЛЯКАМІ

Прызвычаіўшыся да вымярэння мемуарнага жанру як літаратурнага апісання партызанскіх , як правіла, подзвігаў, з пэўнымі сумненнямі адкрываеш кнігі проста жыццёвых успамінаў. Па-першае, таму, што чакаеш ад аўтара прывычнай рыторыкі , без якой не абыходзіцца ніводзін успамін. Па-другое, яшчэ прысутнічае боязь, а раптам чужое і асабістае, калі аўтар зусім не герой ці не досыць знакамітая асоба, настолькі падасца дробязным, што давядзецца думаць, а ці трэба было ўвогуле ўспамінаць. Станіслаў Сакалоў, ганаровы будаўнік Расіі, нарадзіўся ў Верайцах. Навошта ён узяўся за пяро і што галоўнае, якія самыя важныя клопаты кіравалі ім з прычыны прыняцця рашэння зрабіць свае прыватныя ўспаміны вартымі шырокага агучвання і выдання асобнай кнігай? Мне падаецца, што ў некаторай ступені адказ прыхаваны напрыканцы кнігі "Лёс мой Верайцы": "...і пакідаючы родную зямлю, я ізноў і ізноў успамінаю і ў думках пераношуся ў Верайцы. Пройдзе адно, другое, трэцяе стагоддзе, зменіцца не адно пакаленне жыхароў, не будзе мяне, вас, але я цвёрда ўпэўнены, што Верайцы абавязкова перабудуюцца, пашырацца. У жыхароў з'явяцца новыя, добраўпарадкаваныя дамы з усімі выгодамі, двух-трохузроўневыя, з саунамі, з гаражамі, сучаснымі аўто, са спартыўнымі пляцоўкамі. Рызыкну загадаць і аквапарк з басейнамі, і кінатэатр, і рэстаран, аўтасервіс, дом адпачынку, невялікія сучасныя прадпрыемствы па пераапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі і дарункаў лесу. А ўсе дарогі паўз жылыя дамы будуць абавязкова заасфальтаваны і асветлены, бліжнія лясныя масівы стануць паркамі і зонамі адпачынку. Ды, пакуль што гэта толькі мае мары, і мажліва, шмат хто будзе смяяцца — маўляў, усё гэта далёкія ад рэалій фантазіі. А я асабіста ўсё ж веру, паглядзіце, як далёка наперад крочыла чалавецтва ў апошнія сто гадоў. Верайцы таксама змяніліся, канечне ж, не так, як гэтага хацелася б. І, магчыма, прачытаўшы гэтыя радкі, знойдуцца, прыйдуць заўтра новыя кіраўнікі, прыйдуць спонсары, якія — кожны па-свойму — прымуць удзел у змене жыцця ў Верайцах. А мо хто з будучых спонсараў і кіраўнікоў-разумнікаў яшчэ вучыцца ў школе, сядзіць за маёй партай? Скажу, што яшчэ мяне натхняе...

...Прыгледзьцеся да карты: Верайцы знаходзяцца ў цэнтры Беларусі. Прыкладзіце іголку цыркуля ў гэты цэнтр і правядзіце круг — вы пераканаецеся ў гэтым. Дык няхай жа гэты цэнтр стане Цэнтрам жыцця ва ўсіх адносінах. Гэта будучыня нашых дзетак, унукаў, праўнукаў, кожны з вас, па меры сваіх магчымасцяў, набліжае яго, нават не задумваючыся пра гэта (сёння ёсць болей надзённыя праблемы, клопаты), незалежна ад таго, чым займаецца: вучыцца ў школе альбо сам вучыць дзяцей, ...дзяжурыць па станцыі ці працуе білетным касірам, гандлюе ў мясцовай краме ці вартуе склад, служыць камандзірам у мясцовай воінскай часці альбо ён машыніст, праваднік, будаўнік... Кожны Чалавек — будаўнік заўтрашняга дня і сваёй уласнай будучыні".

Прыватныя памяткі пра Верайцы , вядомую на Асіповіччыне чыгуначную станцыю, — вось што ў цэнтры аповеда Станіслава Сакалова, які нарадзіўся ў Асіповічах, а дзяцінства, юнацтва правёў у Верайцах. Аўтар расказвае пра сваіх родных і блізкіх, пра дзядулю і бабулю, пра ўклад жыцця паўвекавой даўнасці. Пра тое, якім быў няхітры пасляваенны побыт на яго чыгуначнай станцыі. У кнізе няма згадак фальклорна-этнаграфічнага кшталту. Часам прыватнае, дробязнае з чужой памяці падаецца малазначным. Але ж у агуле, атрымаўшы ўсю карціну жыцця, пачынаеш разумець, што аўтар простай, даступнай мовай здолеў выкласці партрэт таго часу, таго атачэння, у якім жыў ён асабіста, у якім фарміравалася, вырастала яго пакаленне. Адкрываючы старонку за старонкай, пранікаешся даверам да мемуарыста, пачынаеш асэнсоўваць яго ўласнае, вядомае толькі яму аднаму жыццё , як нешта і табе блізкае і нават патрэбнае. Што ўжо казаць пра Верайцы з яго жыхарамі — ім, пэўна ж, будуць цікавымі ўсе акалічнасці, выкладзеныя ў кнізе земляка. Станіслаў Сакалоў і шматкрат згадвае іх — Альфяровічаў, Еўдакімовічаў, Доўгаляў, Бугораў, Баранавых, Прановічаў, Ляўкоўскіх, Курбатавых, Клязовічаў, Перагудавых, Расковых, Лагунцоў, ды шмат яшчэ каго. Жыхары родных Верайцоў — людзі розных пакаленняў — дарагія для аўтара людзі, кожны па-свойму цікавы і прыкметны.

Да выдання кнігі нашага земляка, які зараз жыве і працуе ў Маскве, спрычыніўся і член Саюза пісьменнікаў Беларусі Ганад Чарказян. У прадмове да ўспамінаў ён заўважае, што напісанае Станіславам Сакаловым — "гэта своеасаблівы гімн памяці малой радзіме, сваёй дарозе па жыцці, людзям, з якімі працаваў і жыў, сваім блізкім, роднаму дому, першай настаўніцы... Верайцам. Адтуль пачаўся нялёгкі шлях аўтара, і туды ж ён вяртаецца думкамі..." Прачытаўшы кнігу, застаецца толькі пагадзіцца з гэтым, а аўтару хацелася б пажадаць прадоўжыць свае мемуарныя клопаты і напісаць працяг расповеда пра ўласнае жыццё і іншыя, дагэтуль мо яшчэ не раскрытыя стасункі з Верайцамі.

Кастусь ЛАДУЦЬКА

Калектыў супрацоўнікаў Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі глыбока смуткуе з прычыны смерці былога дырэктара інстытута, акадэміка, народнага пісьменніка Беларусі Івана Якаўлевіча **НАВУМЕНКІ** і выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім нябожчыка.

Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа глыбока смуткуе з прычыны смерці народнага пісьменніка Беларусі, лаўрэата прэміі імя Якуба Коласа Івана Якаўлевіча **НАВУМЕНКІ** і выказвае спачуванне родным пісьменніка і прыхільнікам яго таленту.

Не кожнаму дадзена

Незвычайна люблю Сцівена Спілберга яшчэ і за тое, што яго думкі, выказаныя ўслых, нярэдка супадаюць з маімі. Вось і нядаўна, відаць з нагоды атрымання ім чарговай прэстыжнай прэміі на тэлеэкране мільгнула некалькі кадраў, на якіх можна было пабачыць і пачуць славутага кінарэжысёра: "У наш час мы павінны як мага больш усміхацца". І менавіта за прыязную ўсмешлівасць мне неаднойчы перападала ад Таісы Бондар.

Яна на поўным сур'ёзе магла крыўдаваць, маўляў, і пасміхаешся ты не тым людзям, і не заўсёды да месца лезеш са сваёй усмешкай! Мы былі выключна рознымі па жыцці і вельмі падобнымі па нейкім глыбока прыхаваным нораве, ці хутчэй, наравістасці, якая вылівалася ва ўпартасць. Таіса ніколі не адступалася ад аднойчы прынятага рашэння, ёй немагчыма было навязаць штосьці для яе выключна непрымальнае, любы кампраміс быў не для яе, як, напэўна, і Пушкінскае: "Обмануть меня не трудно, я сам обманываться рад". Таісу было цяжка нават у нечым малым падмануць, яна ўнутрана ўзрывалася, калі бачыла няшчырасць, выказвала ў вочы любую праўду і ўмела адстойваць не толькі сваё "Я". Яе жыццёвая пазіцыя не ўсіх прываблівала, але яна ніколі не здраджвала сабе, сваім поглядам на жыццё. І ўсё ж яна насіла ў сабе нейкую сваю тайну, тайну свайго духу, сваёй тонкай матэрыі. Думаю, што ніхто не ўведаў Таісу Бондар да канца...

У нас былі розныя перыяды: вельмі блізкае сяброўства ў маладосці, час адчужанасці ледзь не ў дзесяцігоддзе і прыязныя службовыя адносіны ў апошнія чатыры гады, дзе я адкрывала для сябе новую Таісу, не падобную да той, акрыленай і трошкі рамантычнай, якую добра ведала ў маладосці. Аўтар многіх і многіх кніг паэзіі, прозы, творца, які быў заўсёды навідавоку, яна актыўна ўключалася ў грамадскае жыццё і разам з тым шукала адзіноты... Ёй не заўсёды было цікава з людзьмі. Яна многае і многае даўно адкрыла для сябе ў людзях і, не тое, каб расчаравалася, хутчэй, ашукалася ў іх і паднялася вышэй над усёй жыццёвай мітуслівасцю, над гэтым вечным жыццёвым спектаклем, думкі прыніклі да філасофіі быцця, да той маўклівасці вечнасці, якую ніколі не разгадаць чалавечаму розуму, але можна спазнаць духам, дакладней, праз дух. У выніку, яна напісала некалькі філасофскіх кніг, дзе штосьці можна аспрэчваць, з нечым не пагаджацца, і дзе была спроба зазірнуць за зямное...

Хтосьці нядаўна сказаў: "Зямное жыццё скончылася. Пачалося жыццё іншае". У тым, іншым жыцці Таіса Бондар знаходзіцца ўжо год. А знакам ушанавання памяці аб ёй сталася кніга прозы "Гульня ў падкіднога", што выдала сёлета рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва", якую Таіса некалькі гадоў узначальвала. На гэтым мне можна было б і спыніцца, але ёсць момант...

У нашу ўстанову часта тэлефануе, а то і заходзіць Алена Мінзакіраўна Толкач, супрацоўніца Рэспубліканскага фонду Рэрыхаў. І прыводзіць яе да нас шчыры клопат пра літаратурную спадчыну Таісы Бондар. Яна жыве гэтым, прымае ўдзел у стварэнні музея пісьменніцы ў Мар'інай Горцы, падрыхтавала да перавыдання лепшыя творы Таісы, знайшла сродкі і выдавецтва, якое неўзабаве выдасць гэтую кнігу. Пры жыцці добра мець вернага адданага сябра, пасля жыцця, сціпла кажучы, не заўжды застаюцца паслядоўнікі... Не кожнаму такое дадзена. Таісе Бондар прырода дала талент, а жыццё ўвяло яе ў нашу таленавітую літаратуру, і яна застанецца ў ёй назаўсёды.

Раіса БАРАВІКОВА

Жыццё і міражы

Яна была асобай. У такіх людзей звычайна няпросты характар, але менавіта ён і дапамагае стаць асобай, здзейсніцца, дасягнуць мэты, прайшоўшы праз любыя перашкоды. Перашкодаў у яе было нямала, яна гэта бачыла, адчувала, відавочна, таму і спяшалася, апошнім часам вельмі шмат пісала, але ў такой спешцы сёння бачыцца ўжо іншы, сумны сэнс. Такіх людзей, калі яны цвёрда вырашылі ісці да пэўнай мэты, бывае цяжка пераканаць у адваротным, але памятаецца і яе любімае "вот іменна!" – цяпер здаецца, што яно гучала ці не штодня. А можа, так і было?.. "Было" заўсёды больш светлае, чым "ёсць" і нават больш светлае, чым "будзе". Але паколькі і "ёсць", і "будзе" аднойчы абавязкова становіцца "былым", значыць, усё не так і кепска. Хоць, вядома, хацелася б, каб было лепш. У тым ліку, і ў літаратуры. Але для гэтага патрэбны асобы са сваімі няпростымі характарамі, са сваімі амбіцыямі. Асобы, якіх нам, на вялікі жаль, так не хапае. Бо любая нацыянальная літаратура, нават маючы ў сваіх шэрагах шмат цікавых пісьменнікаў, шмат чытэльных твораў, але ў якой мала асоб, можа апынуцца на ўзбочыны сучаснага жыцця. Жыцця, якое спачатку здаецца неверагодна вялікім, амаль бясконцым. Але з гадамі пачынаеш разумець: большая частка гэтага вялікага ў нашых уяўленнях жыцця – звычайныя міражы...

Алесь БАДАК

Фота К. Дробава

Хварэла літаратурай

Мы год без яе. У зажураны снежаньскі дзень з вузкаватага хола рэдакцыйна-выдавецкай установы выправілася яна ў кветках болю і суму ў астатні шлях, пакінуўшы шчымлівую памяць, падобную да зоркавага святла, што льецца і льецца пасля таго, як зорка згасае.

Таіса Мікалаеўна Бондар... Сягоння і прыхільнікі, і яе апаненты сышліся ў адным: яна па-сапраўднаму мужна турбавалася лёсам роднае літаратуры. І як творца, і як кіраўнік. І тое, што лёс у айчыннай літаратуры і ўпраўду нялёгкі, асабліва падкрэслілася з яе адыходам. Пасмялелі многія з тых, хто з унутранай пагардай умее прынізіць пісьменніка — паставіць яго ў цынічна доўгую чаргу каля ганararнае касы, быццам напісанне таленавітага твора не прафесійна значная праца, а ўсяго толькі лёгкая прыватная забаўка. Такія безадказныя чыноўныя людзі не разумеюць перш наперш галоўнага: яны падрываюць саму духоўную сутнасць дзяржавы, ад імя якой і ў імя якой, як ім тое здаецца, і дзейнічаюць.

Права на дастойнае існаванне сучаснай літаратуры доказна і прынцыпова яна ўмела адстойваць у любых кабінетах. Бо ўмела думаць аб вечным, а не карысліва выгодным. Ведала, што ў народа павінен быць свой голас, выяўлены мастацкім Словам. Сваёй маральнай сутнасцю літаратура ўраўнаважвае саму жыццёвую плынь, робіць яе духоўна прасветленай.

У час духоўнага раздраю яе пазіцыя была асабліва выразнай, падзяржаўнаму мудрай і ўзважанай. Грамадская запатрабаванасць роднага слова ўзрастала: выраслі тыражы літаратурна-мастацкіх выданняў, "Полымя", "Маладосць", "Нёман", "Всемирная литература" і штотыднёвік "Літаратура і мастацтва" набылі новае мастацкае аблічча, выйшлі ў свет многія сацыяльна значныя кнігі.

З асаблівай рэдактарскай рупнасцю быў дагледжаны ёй асабіста рукапіс кнігі "Памятаем. Ганарымся", пад вокладкай якой сабраны конкурсныя школьныя сачыненні вучняў сталічных школ і якая пабачыла свет да 60-годдзя Вялікай Перамогі. Яна не шкадавала ні сіл, ні часу, бо ведала: гэта незвычайная кніга, у яе ўзрушлівых, па-дзіцячы шчырых радках доўжыцца духоўная повязь пакаленняў. А калі гэты працэс несупынны – тады і ў самім жыцці прыбывае той дужасці, якая ўзносіць яго да чалавечных вышынь.

Яна рана пайшла з жыцця — з віратоку паўсядзённых клопатаў, надарваная жыццёвымі цяжбамі, аддаўшы сябе да апошняга ўздыху любімай справе. Аднак да ўсіх скрытых медыцынскіх дыягназаў дадаецца сягоння і гэты: хварэла роднаю літаратурай. Згадваючы здзейсненае і не здзейсненае ёю, хочацца пажадаць і новаму кіраўніцтву, і ўсім супрацоўнікам установы "Літаратура і Мастацтва" і надалей напорліва пашыраць духоўную прастору айчыннай літаратуры, рабіць даручаную справу з чалавечай годнасцю і адказнасцю.

Мікола МЯТЛІЦКІ

Святло яе зоркі

Таіса Мікалаеўна ўмела любіць людзей. Не ўсіх агулам, а кожнага, канкрэтнага. Нягледзячы на занятасць, заўсёды знаходзіла хвіліны, каб пацікавіцца справамі, тваім здароўем і здароўем тваіх блізкіх. Яна сапраўды ўмела любіць людзей шчыра, з усімі недахопамі і вартасцямі. Мо таму ў размове іншы раз паўтарала, што ў чалавека не павінна быць ворагаў, бо кожны, з кім ты сутыкаешся па жыцці, — з'яўляецца Настаўнікам. Менавіта — Настаўнікам! А як інакш? Адны вучаць цябе дабрыні і самаахвярнасці, другія — праўдзівасці і непадкупнасці, сардэчнай спагадзе, а трэція — як ніколі не трэба рабіць... З Таісай Мікалаеўнай Бондар працавалася і пачувалася ўтульна, яна была надзейным творчым сябрам, дарадцам і... бескампрамісным крытыкам. За знешняй, як здавалася, непадступнасцю білася трапяткое, чуллівае сэрца, а душэўнай цеплыні ў Таісы Мікалаеўны хапала, відаць, на ўвесь Сусвет. Шкода, што часам за "начальніцкім мундзірам" мы не бачым проста чалавека-творцу, звычайную жанчыну, альбо мужчыну, якія таксама стамляюцца і якім нядужыцца. І клопатаў штодзённых, людскіх, у іх, як і ў кожнага, — па самую макаўку, а мо, нават, і больш.

Памятаю адзін выпадак. Таіса Мікалаеўна адзначала юбілей. Яе запрасілі любячыя землякі на святкаванне ў Мар'іну Горку. З раніцы яна зайшла да мяне ў кабінет апранутая і, нібы знешне памаладзелая, як заўсёды стромкая. Прысела.

— А ты ўжо на працы? Казала ж — адляжыся, а то бранхіт свой ніколі не вылечыш.

— На каго газету пакінуць... — апраўдваюся.

— Вось-вось, да апошняга не шкадуем сябе. Пакуль не дацягнем да "немагу". А я так стамілася...

За ўсё гады ўпершыню пачуў такое ад нашай кіраўніцы. Зірнуў і ўбачыў непаўторна-прыгожую, звычайную, як маці ў сваёй стомленасці — Таісу Мікалаеўну. Ад глыбіннага разумення і спачування ёй — у мяне нават зашчыміла сэрца.

— Але наша за нас ніхто не зробіць. Ніхто! — і вось Таіса Бондар тая, да якой мы звыкліся: энергічная, цвёрдая, упэўненая...

А была яна ўжо невылечна хворая, толькі ніхто з нас пра тое не ведаў. Не ведала і сама Таіса Мікалаеўна, але прадчувала:

Здаецца, мне паспець, мне ўсё ж паспець
Убачыць, дзе канчаецца дарога,
І можна не лічыцца з асярогай:
Не слава ўзважыць зробленае — смерць.

Але для нас і пасёння зіхціць святло ейнай зоркі.

Анатоль КАЗЛОЎ

Таіса Бондар

* * *

Жыву бязрадаснасцю дзён,
Такіх бяссонечных і шэрых,
Што зноў не дагукацца веры,
Не ўчуць, каму спявае звон.

Зямлі? Бязмежжу? Званару
Прасторы гэтай незямное?
Глыбеючы, сціхае рух
Што пада мной, што нада мною.

Мо час гэта, мо толькі шлях
Самотных дзён маіх у часе...
Не неба згасла — позірк гасне,
Не ўмеючы адолець страх.

Жыццё... А што пасля? За ім?
Уваскрашэнне? Змрок нябыту?
Усё ўжо начыста забыта,
Што стане спомінам маім.

Я ж помню, помню вышыню,
І звон яе, і лёгкасць крылаў,
Якімі неба нас прыкрыла
Ад яркага свайго агню.

Дзе той агонь? Калі ён згас?
Чаму сцюдзёна, шэра ў свеце?
Не сцюжы боязна, не смерці —
Прадоння, ў якім тоне час.

* * *

Таямнічасць зямных скрыжаляў...
Спасцігаю душой спакой —
Глыбіню яго, што пужае
Чарнатою сваёй цяжкой.

Хтосьці тоіцца там, у змроку:
Зрэдку чутны то ўздых, то ўзмах
Лёгкіх крылаў ці шолах крокаў,
А гукну — і замрэ абсяг.

Толькі лёгкі павеў трывогі
Скалыхне цішыню наўкруг —
Дзе яе, дзе мая дарога,
Не падкажа няўлоўны рух.

Адступлюся, прыкрыю вочы,
Засланяючы цішыню,
І адчую: плыву за ноччу
На забыты ўжо кліч агню.

І сабе і агню чужая,
Прагну зліцца з той вышынёй,
І ні страху ў душы, ні жалю
Па самоце сваёй зямной.

Як жылося, так пражылося —
Збыўся ж, збыўся абраны лёс!
Што збылося, што не збылося,
Не пытацца ж цяпер у слёз...

* * *

Апошняя любоў? Апошняя любоў...
Не прагну ні дароў, ні наталення,
Не мкнуся апусціцца на калені
Прад вышынёй, цяжкой ад галубоў.

Ад галубоў, ад аблачын, ад промняў...
Урэшце, усё роўна ад чаго!
Як высака ні ўскідваўся б агонь,
Я гэткай цішыні ў душы не помню.

Цішэй, цішэй струменіцца спакой,
Асветлены то ўсмешкаю, то словам,
Любым, якое будзе пад рукой
У першы міг сустрэчы выпадковай.

Раднейшаю становіцца Зямля,
Ярчэйшым —
Сонца над яе прасторай,
І сэрца непакорнае з пакорай
Услухваецца ў ціхі кліч здаля.

Гукае радасць... Дзень і ноч гукае,
Каб я змагла адчысціцца былым,
Перш чым два белыя яе крылы
Асветляць міг, якога я чакаю.

* * *

У змроку, што душу перапаўняў,
Вось-вось зацепліцца, затлее слова —
Сцінаецца на ўзмежку цішыня
З заўсёднай асцярогай вераснёвай.

Яшчэ не верачы, што час прыйшоў
І ў полымі згарыць мая знямога...
Калі не Бог загаварыў з душой,
Яна сама звярнулася да Бога.

Але ў гучанні гэтых першых слоў
Чуваць Яго туга, Яго патоля,
Так, быццам прыадкрыўся даўні схоў
І незямных іх выпусціў на волю.

І важна толькі ўцяміць, зразумець,
Што Ён гаворыць, Ён рукою водзіць,
Каб адступілася нарэшце смерць
Ад шляху, за якім імкне стагоддзе.

Ад шляху, на якім цяпер стаю,
Асветленая спадзяваннем неба,
Што ўратавала не душу маю,
А голас — голас, і Яму патрэбны.

Юрка **ГОЛУБ.** *Нарадзіўся ў 1947 годзе ў вёсцы Горна пад Зэльвай. Скончыў філалагічны факультэт БДУ ў 1970 годзе. Працаваў на Гродзенскай абласной студыі тэлебачання і ў газеце "Гродненская правда". Выдаў кніжкі "Гром на зялёнае голле", "Дрэва навальніцы", "Векапомнае поле", "Помню пра цябе, "Сын небасхілу", "Поруч з дажджом", "Зажураны камень", "Брама зімы".* І вось новая кніга паэзіі **"БАГРА"** (выдавецтва "Кнігазбор", рэдактар І. Жук, 2006, 225 стар, 300 паас.)

"Вершы трэба чуць. Зусім не ўсе, хто піша вершы і друкуе іх, валодаюць паэтычным слыхам. Ды той, хто яго пазбаўлены, пра тое не ведае. У паэзіі няма "падазронай агульнадаступнасці, якая руйнуе яе каштоўныя адкрыцці", як сказаў пра рэлігію Набокаў."

Алена НЯЎЗГЛЯДАВА

Голуб заляцеў у мой лімаўскі пакой гэтак жа нечакана і трапятліва як гады паўтара таму з яго вылецеў. Новая кепі-макаўка міганула чорным адценнем, а свежая "аліўкавая галінка", прынесеная ім, на гэты раз уся была ў "Багры"...

Прыкладна гэтак можна было б распачаць аповед пра нашы творчыя стасункі з вядомым гарадзенскім паэтам Юркам Голубам. Ці не чацвёрты яго вершаваны зборнік я рэцэнзую цягам апошніх чатырох гадоў... І за выняткам трыялетаў ("Зажураны камень"), усе яны, як браты-блізняты, да самапаўторнасці падобныя — і фактурай (фарматам) і зместам сваіх душэўных восеньскіх зазімкаў... Як у той зімова-снежнай кудасе, у іх густой метафарычнасці можна згубіць дарогу з-пад ног, зблытацца і заблукаць не на сваю сцежку... Гэта разумее і аўтар, таму звяртаючыся да чытача, папярэджвае:

Салют, чытач
Фуфла і біблій!
Пратрэш сядач:
І лёс твой гіблы.
.....
А ты трасеш
Акропным носам:
Не ўсякі верш
Да хмар узносіць.

Што праўда то праўда. Хоць рыфматварэнню Юркі Голуба падчас могуць пазайздросціць нават такія яго самаадданыя служкі як Рыгор Барадулін і Васіль Макарэвіч. Скажам, як у вершы "Дзік на бульбянішчы":

Яму, няздохламу, змала
Лагоднай мамай стала пушча.
Пяшчотна дыхала смала,
І не смярдзеў саляр апухшы.

Хоць, канечне, гэты *"саляр апухшы"* як бы зусім з іншага вершаванага ляда, ці якога прылеснага калгаснага мехдвара. Вельмі заўважна і адчувальна, што прывязка да неардынарнай паўнагучнай рыфмы ў вершах Ю. Голуба нярэдка *вяжа* яго паэтычную думку і метафарычнае мысленне ўвогуле, а часам і логіку, і тым самым ускаламучвае паэтычнае дно філасофскай задумы твора на чыстым фоне яе празрыста-яснай паверхні...

А памянёны бранзалет
Няздарны смерд ссушыў у скрыпку:
Ягоны ў доле плюнуў дзед —
Ляжаць з такімі побач прыкра.

Пройдзеш вачыма — як бы й не спатыкнешся, прыслухаешся да гукаў — не дзярэ вуха, а ўскладзеш на вагі розуму — не ўскалыхнуцца шалі глуздоў...

Укарэнены на асацыяцыях і падсвядомасці, прыгожы, вонкава выбітны верш Ю. Голуба, часта аказваецца не надта глыбокім унутрана, зацененым залішнім знешнім убраннем (бранзалетамі рыфмаў, метафар і параўнанняў), якія робяць яго празмерна стракатым.

Падаў вобзем услон:
Рогат слізгаў з услона!
А ядловец, як слон,
Трушчыў чорта!
/Заслона./
.....
Каб прайсці праз чысцец,
Нібы ў непагадзь лоцман,
Не часцей, а чысцей
Б'ецца сэрца ядлоўца.
Там зямляк — як стаяк —
Не ў паўзгібе міністра.
Ён ядлоўцу сваяк,
Бо таксама смалісты.

Ёсць і іншыя ледзь не эзатэрычныя шалупайкі.

Заглянь у нябыту штат,
Там змоўк ад задышкі лямант,
Паслухай, аб кім шаптаў
Пры смерці апошні мамант.

Альбо (прабачаюся, але дзеля захавання аб'ёму дам бягучым радком): *"Нібы футры ў купца, //Сленг паблытаны з шармам"; "Задраў угору ўласны дзюб — //Абшарнай вежы наканечнік"; "Яшчэ згінала стрэльба цвік, //Стралок пацэліў у цвярозасць"; "Стаю, гарот. //Канверт камячу — // У пошт гарод //Ляціць каменьчык"; "Злёг разламаны ў лагчыну //дух-небарак", "Апошняй вандроўкі павэдлуг"; "Рыбакова гавэнда"; "Багну звэдзгалі танкі"* (усе недарэчнасці і паланізмы падкрэслены мной — ЛеГАЛ).

Чаму ж я парушыў традыцыйную рэцэнзійную субардынацыю, пачаўшы менавіта "за супакой", каб кончыць "за здароўе"? Ды хоць бы з алагічнасці нашага сённяшняга (і не толькі літаратурнага) жыцця. Бо, калі казаць па шчырасці, то дай Божа такіх вершаваных кніжак кожнаму члену нашых абодвапісьменніцкіх саюзаў. Аднак "вольныя муляры" не заўжды маюць блізкі доступ да эфірна-эфемернай Музы. Значна радзей, чым да чаркі. Таму і пахмелле ў іх часцей за ўсё графазманнае... А Юрка Голуб уладкаваўся сабе літаратурным парабкам у "губернских новостях" Гародні і дзярэ паборы на "ксёнжкі" з мясцовага мецэната спадара Дубатоўкі. Бедны Дубатоўка! А зрэшты, хто яго ведае, раз да гэтай пары на адну і тую ж рыфму ловіцца —

грошы-вершы — а не наадварот...

А калі сур'ёзна, дык у чым жа палягае адметны талент і паэтычны плён Ю. Голуба? Найперш у яго паднебнай душэўнасці і зямной фундаментальнай прывязанасці. Ну не помню я, каб радок яго ўзлятаў у неба адчайна і неглядзь, не ўхапіўшыся на апошнім узмаху за вершаліну якой высока-гонкай сасны ці вясковага задымленага коміна-стаўбуна. У цудоўным вершы "Яшчэ пра лён" паэт сімвалічна як бы сцвярджае гэтую тэзу:

Вырываўся, як толькі мог,
Ад задышкі пясчанай пудры.
Выжыў братка. Ён там, дзе Бог!
Светлакудры і любамудры.

Айчына, мова, вера (хрысціянства), патрыятызм, працалюбства, любоў і дабро — вось асноўныя складнікі яго творчай планіды. Паэт ні на хвіліну не забываецца на нацыянальныя каноны беларускага духу. Сэрца ў яго грудзях б'ецца, як *"як звон на стомленай званіцы"*. Ды нават самі назовы вершаў кажуць пра шырокі ахоп як геаграфічнага абшара так і гістарычнага пласта айчыннага жыцця: "З балота", "Бежанец", "Мястэчка", "У самотнай прасторы", "На гаспадарцы", "Статак", "Сюжэт пра хаўрус", "Шынок", "Экстрым", "Дух і вятрак"...

У зборніку чатыры раздзелы. І кожны з іх мае сваю як змястоўную так і фармальную адметнасць.

Ю. Голуб схільны да глыбіннага псіхалагічнага ўмяшання ў стан звычайных зямных рэчаў, здарэнняў і дзей. Як мне падалося, яму чамусьці "зручней" вяртацца да вытокаў, зазіраць у балесны свет уласнай памяці. Калі яго і трывожыць сённяшняе, то на фоне прамінулай прычыннасці. Ад усёй "суеты сует" яму застаецца толькі "томление духа"...

Закладнік голасу — паэт —
Сабе праз шэпты нешта раіць,
А тое значыць: боскі свет
Яму світае сама рана.

Ю.Голуб лірык вельмі тонкі. Прырода пад яго пяром *натуральна ажывае* нават там, дзе яна знявечана. Як я ўжо некалі пісаў, "слова для Ю.Голуба не проста падручны матэрыял для мастацкага выказвання сваіх думак і пачуццяў, але і самадастатковая сутнасць усіх зямных повязяў пад небам. Яно жывое і неаднароднае нават унутры самога сябе. У яго ёсць свае адценні, падтэксты і рознасэнсы. І як мне думаецца, яно ёсць перадумовай, а мо ўжо і самой прадмовай да пошуку патаемнай ісціны"...

Задзёртаю галавой
З небам шукаю повязь.
Над Сынкавіцкаю царквой
Бусел ляціць на споведзь.

У падобных выпадках верыш, што паэту насамрэч *"Муза ў форме і фасоне //заводзіць ручкі за каўнер"*. Ну а ўжо наконт мужнай грамадзянскай пазіцыі аўтара паўтарацца не выпадае. Яна "вісне" ў яго міжрадкоўях, як падстрэшнае празрыстае вострыё сакавіцкага ледзяша над галавой бяспечнага прахожага... Агулам, у вершах Ю.Голуба вельмі тонкая, можна сказаць, празрыста-бачная (праглядная) мяжа паміж згаданай лірыкай чыстай красы і грамадзянскімі матывамі, што сведчыць пра неардынарнасць яго прыроднага паэтычнага таленту. Таму падаюцца дзіўнымі яго, хай сабе і іранічныя, *заўвагі* да ўласнай творчасці:

Прабачэння прашу
За фінал недарэчны.
Мусіць лёгка пішу
Пра важнецкія рэчы.

Гэта абсалютна лішняе. Трэба толькі радавацца таму, што, нарэшце, скінуўшы з плячэй літаратурны цяжар, хоць некаторыя з творцаў вольна развінулі ў айчынным небе сваё паэтычнае крылле...

ЛеГАЛ

НЕ СПАДЗЯВАЙЦЕСЯ НА «АВОСЬ»

Пральная машына, халадзільнік, электрапліта, камп'ютэр трывала ўвайшлі ў наша жыццё. Яны шматфункцыянальныя, эканамічныя і зручныя ў карыстанні.

Бяспеку ў карыстанні бытавой тэхнікай гарантуюць яе вытворцы, забяспечвае сістэма сертыфікацыі тавараў, якая дзейнічае ў нашай краіне. Але пры пэўных умовах (пры парушэнні правілаў тэхнічнай эксплуатацыі і тэхнікі бяспекі) карыстацца бытавой тэхнікай становіцца небяспечна з-за магчымасці паражэння чалавека электрычным токам. У гэтым выпадку ток, праходзячы праз цела чалавека, аказвае цеплавое, хімічнае і біялагічнае ўздзеянне.

Хімічнае ўздзеянне электрычнага току вядзе да электролізу крыві. Біялагічнае — выяўляецца ў небяспечным узбуджэнні ўсіх клетак арганізма, у прыватнасці нервовых клетак і ўсёй нервовай сістэмы. Магчыма таксама спыненне работы сэрца.

Калі вы вырашылі, што варта сур'ёзна падысці да забеспячэння сваёй электрабяспекі, неабходна выканаць наступнае:

1. Зазямліць усю бытавую тэхніку, якая знаходзіцца на кухні і ў ванным пакоі, — пральную машыну, халадзільнік, электрапліту і г. д.

2. Усталяваць абарончае адключэнне, так званае "УЗО".

3. Перыядычна праводзіць электрафізічныя замеры сваёй электраправодкі і апаратаў абароны.

4. У выпадку павелічэння магутнасці электрычнай нагрузкі, неабходна замяніць электраправодку і апараты абароны ў адпаведнасці з новай магутнасцю. Пры гэтым па тлумачэнні і дапамогу трэба звяртацца ў Энерганагляд РУП "Мінскэнерга".

Спадзявацца на "авось" ці заняцца пытаннямі электрабяспекі зараз — вырашаць вам.

В. МАКОЎСКІ,
Дзяржаўны інспектар
па энергетычным наглядзе РБ

У Доме Дружбы адбылася прэзентацыя кнігі Ліма О'Мара "Nuclear families Living in a meitdown situation".

СУПЕРАЖЫВАННЕ

Аўтар выдання на працягу многіх гадоў дапамагае дамам-інтэрнатам Беларусі. Ён з'яўляецца дырэктарам дабрачыннай ірландскай арганізацыі "Барэнскі Чарнобыльскі праект".

Кніга прысвечана людзям-ахвярам чарнобыльскай трагедыі. Як пазначана ў прадмове да выдання, тэкст — пра "разбурэнне людскіх дачыненняў і надзею. Пра каханне, якога не адолее нават знішчальная ядзерная катастрофа".

Праект праводзілі Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, Таварыства "Беларусь — Ірландыя", Грамадскае аб'яднанне "Дзіцячы фонд духоўнага і культурнага адраджэння "Сакавік".

А. Т.

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:

Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Леанід ГАЛУБОВІЧ
Алесь ГАЎРОН
(намеснік галоўнага рэдактара)
Віктар КАВАЛЁЎ
Янка ЛАЙКОЎ
Валерый ПІНЧУК
(адказны сакратар)
Ірына ШАЎЛЯКОВА

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
галоўны рэдактар — 284-66-73
намеснік галоўнага рэдактара — 284-66-73

АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-66-71
паэзіі, літаратурнага жыцця, крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы — 284-66-73
музыкі, тэатра, кіно і выяўленчага мастацтва — 284-66-71
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: minsk@lim.by

Адрас у Інтэрнеце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ"
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў
публікацый
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79

Індэкс 63856 Наклад 3496
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 3.01.2007 у 11.00

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 1

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12